WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

12 КРАСАВІКА 2011 г.
АЎТОРАК
№ 67
(26931)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.



# ТРАГЕДЫЯ НА СТАНЦЫІ МЕТРО «КАСТРЫЧНІЦКАЯ»

## ВЫБУХ НА СТАНЦЫІ МЕТРО «КАСТРЫЧНІЦКАЯ»: ЁСЦЬ ЗАГІНУЛЫЯ

Выбух здарыўся на станцыі метро «Кастрычніцкая», ёсць загінулыя і параненыя, перадае БЕЛТА з месца здарэння.

Пажару на станцыі метро няма, абрушэнняў канструкцый няма. На месцы здарэння працуюць супрацоўнікі МНС, КДБ, МУС, прадаўжаюць пад'язджаць карэты хуткай дапамогі. Параненых развозяць у бальніцы.

## 18:43:37 Да станцыі мінскага метро «Кастрычніцкая» прыбыло больш як 10 пажарных разлікаў

Да станцыі мінскага метро «Кастрычніцкая», дзе ўчора прагрымеў выбух, прыбыло больш як 10 пажарных разлікаў. Тут жа знаходзіліся карэты хуткай дапамогі і медыцынская служба МНС.

## 19:10:22 Пасля выбуху ў мінскім метро, паводле слоў сведак, даўкі не было

Пасля выбуху ў мінскім метро, паводле слоў сведак, даўкі не было, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Як расказалі сведкі, выбух суправаджаўся густым дымам. «Людзі без панікі пакідалі метро, выходзілі праз парапеты, тыя, хто мог, дапамагалі жанчынам і дзецям», — расказваюць сведкі. Сярод пацярпелых былі цяжка параненыя, ёсць загінулыя.

Медыкі аператыўна аказалі ўсю неабходную дапамогу пацярпелым. Большасць з іх адвезлі з месца здарэння ў медустановы. Дакладная колькасць пацярпелых пакуль не вядома.

## 19:20:04 Выбух здарыўся недзе ў апошнім вагоне цягніка

Паводле слоў відавочцаў, выбух у мінскім метро здарыўся недзе ў апошнім вагоне цягніка, які рухаўся па станцыі, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Гук быў падобны на гук, як пры адкрыцці бутэлькі шампанскага. Прыроду паходжання выбуху назваць пакуль складана. Агню амаль не было, але было шмат дыму. На працягу пяці хвілін пачалася эвакуацыя.

## 19:36:10 Большасць пацярпелых пры выбуху ў мінскім метро атрымалі сур'ёзнае псіхаэмацыянальнае ўзрушэнне

Большасць пацярпелых пры выбуху ў мінскім метро атрымалі сур'ёзнае псіхаэмацыянальнае ўзрушэнне, паведаміў журналістам адзін з супрацоўнікаў хуткай медыцынскай дапамогі, перадае БЕЛТА.

«Большасць людзей атрымалі сур'ёзнае псіхаэмацыянальнае ўзрушэнне, — сказаў медсупрацоўнік. — Супрацоўнікі хуткай медыцынскай дапамогі аператыўна аказалі ўсім пацярпелым неабходную дапамогу». Паводле яго слоў, людзі, якія перанеслі найбольшы шок, шпіталізаваны, некаторыя з іх пасля аказання меддапамогі адмовіліся ад шпіталізацыі і былі адпушчаны дадому.

## Журналіст «Звязды» Сяргей РАСОЛЬКА па волі выпадку ў гэты момант апынуўся ў вагоне

Выбух прагрымеў прыкладна ў 17.54. За дакладнасць гаварыць не буду, мяркую па гадзінніку на сваім мабільным тэлефоне. Цягнік якраз пад'ехаў да станцыі «Кастрычніцкая», дзверы расчыніліся, перада мной на выхад стаяла два чалавекі. Запомніўся чалавек сталага веку ў чорнай скуранoй куртцы, з сівымі валасамі «пад вожык», але з нейкай, як падалося, дзявоцкай завушніцай у вуху. Напэўна, гэта адцягнула ўвагу, бо калі прагучаў выбух, я не паспеў ступіць яшчэ на платформу. Але перада мной ужо нікога не было, людзі неяк імгненна зніклі. Што ўрэзалася ў памяць? Гэта шырока расчыненыя дзверы вагона, нейкая разгубленасць, часта білася сэрца.

Потым у транспарце людзі казалі, што было нават два выбухі. Мне падалося, што гэта быў адзін, але працяглы, вібрыруючы. Вагон пад нагамі закачаўся, святло пагасла, але не цалкам. Зноў жа не спецыяліст, але ў паветры запахла паленым жалезам. Было вельмі пыльна, зверху пасыпалася тынкоўка. Я ўсё на тых жа паўсагнутых нагах выйшаў з вагона на платформу, атрымалася — якраз пад арку лесвіцы пешаходнага пераходу. Інстынктыўна прыгнуўся: што рабіць? У які бок кідацца? Зноў жа чамусьці ў памяці адкладаліся дзверы ці то ў вытворчае, ці то ў бытавое памяшканне ў гэтай самай арцы...

Чуліся пераважна жаночыя крыкі, на падлозе былі нейкія цёмныя плямы дарожкай. Што гэта было, я дакладна не скажу, такіх дарожак бачыў потым яшчэ некалькі, да самага выхаду на паверхню. Прыгінаючыся, азіраючыся па баках, выйшаў з-пад аркі, думаючы куды пайсці далей. Азірнуўся наверх на лесвіцу, нікога там не заўважыў — яна была практычна ўся ў дыме ці пыле. Паперадзе таксама з-за моцнага дыму і пылу былі заўважныя толькі рэдкія постаці. Нават мільганула думка, што ўсе ўжо паспелі выбрацца. Але калі наблізіўся да эскалатара, там было даволі шмат людзей. Напэўна, некалькі дзясяткаў. Асаблівай панікі не было, хутчэй — разгубленасць.

Эскалатары працавалі. Практычна адразу пасля выхаду на платформу я пачаў набіраць нумар жонкі. Тое ж рабілі і многія побач. Сувязь працавала. У фае стаялі два міліцыянеры. Да іх адразу ж кінуліся па дапамогу, падаецца, дзве маладыя дзяўчаты (а можа падлеткі?), якія падтрымлівалі пад рукі з абодвух бакоў трэцюю. Міліцыянеры кінуліся ім насустрач. У фае быў усё той жа непрыемны металічны пах і пыл. Ён адчуваўся нават на выхадзе, ужо бліжэй да свежага паветра. Я выйшаў з пераходу, які каля Дома афіцэраў. У першыя хвіліны тут было адносна няшмат людзей, некалькі дзясяткаў. Тое ж можна было назіраць і праз дарогу насупраць, каля другога выхаду. На лаўку побач пасадзілі адну з пацярпелых, пажылую жанчыну, якой спрабавалі выцерці ад крыві твар. Нехта ў прастрацыі прытуліўся да мармуру выхаду. Побач нервова хадзіла маладая жанчына з закопчаным тварам, якая ўвесь час размаўляла па мабільным тэлефоне. Яе чорная спадніца была пасечана да паловы спераду і ззаду. Ля каменнага парапета бязгучна ўвесь час плакала іншая рыжавалосая маладая дзяўчына. На правай назе ў яе каля калена была кроў. Практычна ўсе тэлефанавалі, што нешта здарылася ў метро... са мной усё ў парадку... ты дзе?.. Адразу з дынамікаў загучала гучнае металічнае папярэджанне: «Людзі, пакіньце станцыю».





У першыя хвіліны транспарт працаваў як звычайна. З паўпустых «сотак» на прыпынкі з непаразуменнем пазіралі людзі. Першая пажарная машына, зноў жа па гадзінніку на маім мабільным, з'явілася з боку цырка, прыкладна праз дзевяць хвілін пасля выбуху. Яшчэ праз хвіліну падляцелі дзве хуткія дапамогі. Адна з іх пачала разварочвацца прама пасярод праезнай часткі, каб можна было спыніцца побач з прыпынкам. Сталі заўважныя і іншыя пацярпелыя, напрыклад, мужчына з акрываўленай галавой, які неяк разгублена пазіраў па баках... Некалькі пазней «хуткія дапамогі» ляцелі адна за адной. Наколькі было відаць з таго месца, дзе я стаяў, каля іншых выхадаў з метро (каля ГУМа) ужо стаяла некалькі магутных МАЗаў МНС. Вырашыў ехаць у рэдакцыю, патэлефанаваў туды. Аўтобуса ўжо давялося чакаць пэўны час, ён падышоў амаль забіты. Тым часам да «хуткай» пацягнуліся людзі, у адной жанчыны ў акулярах уся левая палова твару была залітая крывёю, але яна ішла да машыны сама. Нейкае маладое дзяўчо ў светлай куртцы плакала ў мабільны тэлефон, відаць, звяртаючыся да некага з родных: «Дык скажы, мне звяртацца да медыкаў ці не трэба?».

У аўтобус разам са мной уціснуўся лысаваты мужчына невялікага росту ў чорным паліто, якое было ўсё заляпанае нечым накшталт будаўнічай тынкоўкі, на твары былі бачныя таксама кроплі крыві. У аўтобусе ўжо нейкім чынам асобныя здагадваліся, што ў метро прагучаў выбух, але большасць яшчэ не разумела ў чым справа і задавала пытанні. У адказ коратка гучала: выбух, пераход... Нейкая жанчына пачала настойліва даводзіць таму мужчыну, што ён дарэмна адмовіўся ад медыцынскай дапамогі, не падышоў да медыкаў, маўляў, гэта ў вас шок, эйфарыя, вам трэба звярнуцца па медыцынскую дапамогу. Мужчыну саступілі месца і ён, пакуль я ехаў у аўтобусе, моўчкі сядзеў. Ужо на наступным прыпынку людзей было яшчэ больш. Пасажыры з вялікай цяжкасцю ўціскваліся і выходзілі з «соткі». А на наступных прыпынках сітуацыя была яшчэ горшая. Відавочна, што метро было ўжо цалкам зачыненае на той момант. Людзі проста ішлі ўздоўж праспекта, па абодвух баках. У паветры ўвесь час гучалі сірэны хуткіх дапамог і машын МНС. На сваім прыпынку ледзь вылез з аўтобуса. У пешаходным пераходзе станцыі метро «Акадэмія навук» каля зачыненых дзвярэй у вестыбюль стаяла недзе каля трох дзясяткаў чалавек, пераважна моладзі. Каля рэдакцыі мабільнік яшчэ лавіў. Было некалькі прапушчаных, але адказаць на той момант, заціснуты людзьмі ў салоне, я не мог. Яшчэ калі праз некалькі хвілін я быў на сваім паверсе мне сказалі, што сувязь адсутнічае...

## ПРЭЗІДЭНТ БЕЛАРУСІ НАЗНАЧЫЎ ТЭРМІНОВУЮ НАРАДУ Ў СУВЯЗІ З ВЫБУХАМ У МІНСКІМ МЕТРО

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка назначыў тэрміновую нараду ў сувязі з выбухам у мінскім метро. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.**

Паводле папярэдніх даных, у выніку выбуху загінулі 7 чалавек, 35 чалавек з раненнямі рознай ступені цяжкасці звярнуліся па медыцынскую дапамогу на месцы здарэння, ім аказана дапамога. Каля 40 пацярпелых дастаўлены ў медустановы.

Кіраўнік дзяржавы даў даручэнні па забеспячэнні неабходных мер бяспекі і па аказанні пацярпелым медыцынскай дапамогі.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## АЎТАМАБІЛЬ СПЫНІЛІ СТРЭЛЫ

*Толькі пасля 4 папераджальных стрэлаў у паветра і 10 — па колах і рухавіку ўдалося спыніць «Форд Мандэа»*

**Гэтае здарэнне адбылося ў нядзелю, калі кіроўца аўтамабіля «Форд Мандэа» праігнараваў патрабаванне супрацоўнікаў ДАІ спыніцца: ён, мабыць, «пераблытаў» педаль тормаза з педаллю газа. Што і не дзіўна, калі ўлічыць, у якім стане знаходзіўся...**

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама, лавіць парушальніка праваахоўнікам давялося на аўтадарозе Брэст—Мінск—мяжа РФ. Уцякач імчаў так, што ствараў пагрозу жыццю і здароўю іншых удзельнікаў дарожнага руху. Таму інспектарам дарожна-патрульнай службы было прынятае рашэнне аб выкарыстанні табельнай зброі. Інспектар зрабіў 4 папераджальныя стрэлы ў паветра і 10 стрэлаў па колах і рухавіку «Форда Мандэа». У выніку машына атрымала механічныя пашкоджанні і была спыненая паблізу вёскі Быкачона Смалявіцкага раёна. Як высветлілася, за рулём аўтамабіля знаходзіўся 49-гадовы індывідуальны прадпрымальнік, жыхар Мінска, у крыві якога знойдзена 2,04 праміле алкаголю.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## ЖАНЧЫНУ ПАРАНІЛА САРВАНЫМ ВЕТРАМ ДАХАМ

**У Лідзе жанчыну параніла сарваным ветрам дахам аўтобуснага прыпынку, паведаміў БЕЛТА галоўны спецыяліст цэнтра прапаганды і абучэння пры Гродзенскім абласным упраўленні МНС Вадзім Хаценка.**

У выніку моцнага ветру за мінулыя суткі ў Гродзенскай вобласці абясточана 236 населеных пунктаў, пацярпелі 11 раёнаў. Ад разгулу стыхіі пацярпела жыхарка Ліды. Сарваны ветрам дах прыпыначнага пункта паляцеў прама на жанчыну. Ад удару шыферу ў жывот яна атрамала сур'ёзныя траўмы, праапераравана і знаходзіцца ў рэанімацыі. Як адзначылі ў МНС, электразабеспячэнне ў населеных пунктах адноўлена, вядуцца работы па рамонце дахаў. Аднак у бліжэйшыя суткі па вобласці прагназуецца ўзмацненне ветру з парывамі да 24 метраў за секунду. МНС рэкамендуе жыхарам рэгіёну па магчымасці заставацца дома, пераставіць аўтамабілі ў бяспечнае месца і прыняць іншыя меры засцярогі.

## РАБАВАЎ ЖАНЧЫН

*40-гадовы зламыснік перад начной зменай падпільноўваў прадстаўніц слабага полу і нападаў на іх*

Жыхар Дзяржынскага раёна працаваў, паводле звестак прэс-афіцэра Маскоўскага РУУС Таццяны Грыб, на адной са сталічных будоўляў. Перад тым, як заступаць на начную змену, ён падпільноўваў на вуліцы жанчын, якія вярталіся дадому адны. Сваіх ахвяр злачынца валіў на зямлю і адбіраў у іх сумачкі. Падчас трэцяга такога нападу на жанчыну, якая аказала злодзею актыўная супраціўленне, — рабаўнік яе збіў. А хутка нахабніка затрымалі праваахоўнікі, якім ён патлумачыў, што на злачынства пайшоў з-за цяжкага матэрыяльнага становішча: маўляў, неабходна было плаціць крэдыты, здымаць кватэру, а праца прыносіла няшмат даходу. Між іншым, рэчы, якія гэты мужчына адбіраў у пацярпелых, ён дарыў жонцы і сястры, а мабільныя тэлефоны прадаваў.

**Ігар ГРЫШЫН.**

*Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by*

## АЖЫЯТАЖНЫ ПОПЫТ НА ЦУКАР І АЛЕЙ У МІНСКУ СПАДЗЕ ПРАЗ 2-3 ДНІ

**Аб гэтым заявіў старшыня Мінгарвыканкама Мікалай Ладуцька ўчора на аператыўнай нарадзе ў мэрыі, перадае БЕЛТА.**

«Праз 2-3 дні ажыятажны попыт на цукар і алей у горадзе спадзе», — сказаў мэр сталіцы. Пры гэтым ён падкрэсліў, што цэны на цукар павышацца не будуць.

Начальнік галоўнага ўпраўлення спажывецкага рынку Мінгарвыканкама Валянцін Байдак інфармаваў, што апошнія 4-5 дзён у Мінску назіраецца ажыятажны попыт на цукар і алей. «Калі раней магазіны Мінска прадавалі па 60 тон цукру, то за апошнія дні яго рэалізацыя ўзрасла ў 10 разоў.

СТАР. 3

БЕЛАРУСБАНК

ОФИЦИАЛЬНАЯ ТАБЛИЦА

**«Семьдесят пятого тиража выигрышей по выигрышным вкладам в белорусских рублях», состоявшегося 7 апреля 2011 года в г. Минске**

Выигрыши выпали на следующие номера счетов по выигрышным вкладам во всех учреждениях ОАО «Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк»:

| Номера счетов | Размер выигрыша в процентах к средней сумме остатка вклада | Номера счетов | Размер выигрыша в процентах к средней сумме остатка вклада |
|---|---|---|---|
| А009 | 112 (Сто двенадцать) | А531 | 112 (Сто двенадцать) |
| А046 | 112 (Сто двенадцать) | А561 | 450 (Четыреста пятьдесят) |
| А093 | 112 (Сто двенадцать) | А629 | 112 (Сто двенадцать) |
| А128 | 112 (Сто двенадцать) | А672 | 112 (Сто двенадцать) |
| А195 | 225 (Двести двадцать пять) | А680 | 112 (Сто двенадцать) |
| А225 | 112 (Сто двенадцать) | А744 | 112 (Сто двенадцать) |
| А268 | 112 (Сто двенадцать) | А774 | 900 (Девятьсот) |
| А288 | 112 (Сто двенадцать) | А837 | 450 (Четыреста пятьдесят) |
| А352 | 112 (Сто двенадцать) | А870 | 112 (Сто двенадцать) |
| А368 | 112 (Сто двенадцать) | А885 | 112 (Сто двенадцать) |
| А438 | 112 (Сто двенадцать) | А925 | 112 (Сто двенадцать) |
| А446 | 225 (Двести двадцать пять) | А978 | 112 (Сто двенадцать) |
| А486 | 112 (Сто двенадцать) | - | |

В учреждениях ОАО «АСБ Беларусбанк», где число счетов более одной тысячи, во всех последующих тысячах выиграли те же номера, что и в первой тысяче, т. е. за № № А046, А1046, А2046 и т. д.

**Председатель комиссии:** Макар Валентина Владимировна, начальник финансового отдела администрации Ленинского района г. Минска

**Ответственный секретарь:** Ясинская Татьяна Александровна, заместитель директора департамента розничного бизнеса ОАО «АСБ Беларусбанк»

Проценты, выплаченные по вкладам, депозитам в течение 2010 г., млн. бел. руб.

| | январь | февраль | март | апрель | май | июнь | июль | август | сентябрь | октябрь | ноябрь | декабрь | 2010 год |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Вклады до востребования | 7,8 | 73,8 | 236,0 | 326,8 | 207,9 | 839,0 | 319,6 | 428,0 | 515,2 | 370,8 | 1886,7 | 60072,8 | 65284,4 |
| в том числе: в белорусских рублях | 7,6 | 73,0 | 234,6 | 325,0 | 205,1 | 835,9 | 318,1 | 425,3 | 512,9 | 367,1 | 1880,2 | 60015,0 | 65199,8 |
| в иностранной валюте | 0,2 | 0,8 | 1,4 | 1,8 | 2,8 | 3,1 | 1,5 | 2,7 | 2,3 | 3,7 | 6,5 | 57,8 | 84,6 |
| Срочные депозиты | 93342,6 | 104496,0 | 130293,5 | 118149,6 | 112007,0 | 114286,8 | 99323,4 | 115963,9 | 102920,3 | 84705,4 | 102572,5 | 94096,7 | 1272157,7 |
| в том числе: в белорусских рублях | 62894,2 | 74091,3 | 94123,7 | 83865,7 | 79269,4 | 79773,7 | 67225,8 | 83239,0 | 71583,8 | 56764,0 | 71578,3 | 59208,4 | 883617,3 |
| в иностранной валюте | 30448,4 | 30404,7 | 36169,8 | 34283,9 | 32737,6 | 34513,1 | 32097,6 | 32724,9 | 31336,5 | 27941,4 | 30994,2 | 34888,3 | 388540,4 |

Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.*

БЕЛВНЕШЭКОНОМБАНК

**ОАО «Белвнешэкономбанк» информирует вкладчиков, что с 12 мая 2011 года по действующим договорам вкладов (депозитов) «Выгодный», заключенным до 11 апреля 2011 года включительно на срок 60 месяцев:**

- в белорусских рублях под процентную ставку 17,3 % годовых, установлена процентная ставка 18,25 % годовых;

- в долларах США, евро, российских рублях под процентную ставку 7,75 % годовых, установлена процентная ставка 8,2 % годовых.

ОАО «Белвнешэкономбанк». Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности № 6 от 27.10.2006. УНП 100010078



АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ

WWW.RLT.BY

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гамма вкуса» (продавец)**

проводит открытый аукцион по продаже единым лотом объектов недвижимости, расположенных по адресу: Минская обл., Клецкий р-н, **г. Клецк, ул. Кирова, д. 2,** в составе: здание мастерских (инв. № 641/С-11694), об. пл. 519,3 кв.м; конюшня (инв. № 641/С-11693), об.пл. 136,9 кв.м; здание диспетчерской (инв. № 641/С-11695), об. пл. 175,1 кв.м.

**Начальная цена с НДС – 233 167 459 бел. руб.**

**Площадь земельного участка – 0,6053 га.**

**Задаток 10 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015 Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» до 18.04.2011г.; на р/с 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Банк» БИК 153001369, УНП 690324015 после 18.04.2011 г.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

**Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.**

Аукцион состоится **12.05.2011** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **11.05.2011** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.**

ЗАКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО Цептер Банк

**ЗАО «ЦЕПТЕР БАНК»**
*Адрес: 220034, г. Минск, ул. Платонова, 1Б*
*эл. адрес: info@zepterbank.by.*
*Тел. 331 89 49, факс 331 89 48*

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2011 г.**

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.04.2011 | 01.04.2010 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | АКТИВЫ | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 4 168,8 | 1 361,2 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 12 316,8 | 2 608,3 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 12 412,9 | 16 393,7 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 10 110,4 | 16 622,5 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 80 514,5 | 44 371,0 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | - | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 10 097,1 | 8 277,8 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | - | - |
| 12 | Прочие активы | 1111 | 2 154,9 | 1 320,2 |
| 13 | ИТОГО активы | 11 | 131 775,4 | 90 954,7 |
| 14 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | |
| 15 | Средства Национального банка | 1201 | 7 530,4 | - |
| 16 | Средства банков | 1202 | 10 820,2 | 8 753,7 |
| 17 | Средства клиентов | 1203 | 40 550,3 | 20 875,8 |
| 18 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 16 668,7 | 7 917,6 |
| 19 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 20 | Прочие обязательства | 1206 | 492,1 | 871,5 |
| 21 | ВСЕГО обязательства | 120 | 76 061,7 | 38 418,6 |
| 22 | КАПИТАЛ | | | |
| 23 | Уставный фонд | 1211 | 42 030,0 | 42 030,0 |
| 24 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 25 | Резервный фонд | 1213 | 2 101,5 | 2 101,5 |
| 26 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 1 306,3 | 37,0 |
| 27 | Накопленная прибыль | 1215 | 10 275,9 | 8 367,6 |
| 28 | ВСЕГО капитал | 121 | 55 713,7 | 52 536,1 |
| 29 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | 131 775,4 | 90 954,7 |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2011 г.**

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.04.2011 | 01.04.2010 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 3 095,6 | 3 366,0 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 891,7 | 488,6 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 2 203,9 | 2 877,4 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 587,0 | 175,7 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 277,9 | 24,9 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 309,1 | 150,8 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | (3,9) | 16,3 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 1 165,3 | 671,5 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | - | - |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | (76,3) | 147,4 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 137,6 | - |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 2 419,8 | 1 856,6 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 647,9 | 221,8 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 820,6 | 1 490,2 |
| 16 | Налог на прибыль | 212 | 95,4 | 179,0 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 725,2 | 1 311,2 |

**И.о. Председателя Правления** — **Киблов Владимир Иванович**

**Главный бухгалтер** — **Нестерова Галина Чеславовна**

**Дата подписания «05» апреля 2011 г.**

*Лицензия Национального банка Республики Беларусь от 13 ноября 2008 года № 31 на осуществление банковской деятельности. УНП 807000214 БИК 153001820*

ISSN 1990 - 763X

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 12.04.2011 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| ▼ 1 долар ЗША ... 3 046,00 | 1 чэшская крона ... 180,52 |
| ▲ 1 еўра ... 4 406,65 | 1 польскі злоты ... 1 110,89 |
| 1 латвійскі лат ... 6 206,83 | ▲ 1 расійскі рубель ... 108,88 |
| 1 літоўскі літ ... 1 275,70 | 1 украінская грыўня ... 382,66 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ*

| | |
|---|---|
| USD | 27,9758 |
| 10 UAH | 35,1234 |
| 10000 BYR | 91,6939 |
| EUR | 40,4390 |

### РАШЭННЕ КАНСТЫТУЦЫЙНАГА СУДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

# АБ ПАЗІЦЫІ КАНСТЫТУЦЫЙНАГА СУДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПА ЗАКОНУ РЭСПУБЛІКІ ПОЛЬШЧА «АБ КАРЦЕ ПАЛЯКА»

Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь у складзе старшынствуючага — Старшыні Канстытуцыйнага Суда Міклашэвіча П.П., намесніка Старшыні Марыскіна А.У., суддзяў Бойка Т.С., Варановіча Т.В., Данілюка С.Я., Ізоткі У.П., Козыравай Л.Р., Падгрушы В.В., Сяргеевай В.Г., Цікавенкі А.Г., Чыгрынава С.П.

на падставе падпункта 1.5 пункта 1 Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26 чэрвеня 2008 г. № 14 «Аб некаторых мерах па ўдасканальванню дзейнасці Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь»

разгледзеў у судовым пасяджэнні прапанову Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь аб выкладанні пазіцыі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь аб адпаведнасці Закона Рэспублікі Польшча «Аб Карце паляка» агульнапрызнаным прынцыпам і нормам міжнароднага права.

Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у сваёй прапанове ўказала, што 29 сакавіка 2008 г. уступіў у сілу Закон Рэспублікі Польшча «Аб Карце паляка», дзеянне якога распаўсюджваецца на ўсе рэспублікі былога Саюза ССР, у тым ліку Рэспубліку Беларусь, уключаючы яе грамадзян.

Па меркаванню Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Закон Рэспублікі Польшча «Аб Карце паляка» супярэчыць нормам міжнароднага права і прынцыпу добрасуседства, а іменна:

1) прадастаўленне на тэрыторыі Рэспублікі Польшча ўладальнікам Карты паляка правоў, якія датычацца атрымання доўгатэрміновай польскай візы, працаўладкавання, ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці, атрымання розных форм адукацыі, карыстання медыцынскім абслугоўваннем пры надзвычайных акалічнасцях, і іншых правоў, прадугледжаных артыкуламі 5 і 6 названага Закона, у выніку чаго замежныя грамадзяне на тэрыторыі Рэспублікі Польшча, у тым ліку грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія маюць Карту паляка, будуць не роўныя ў правах з замежнымі грамадзянамі, якія не маюць Карту паляка, — такім асноватворным міжнародным дакументам у сферы правоў чалавека, як Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека ад 10 снежня 1948 года, Міжнародная канвенцыя аб ліквідацыі ўсіх форм расавай дыскрымінацыі ад 21 снежня 1965 года і Канвенцыя адносна дыскрымінацыі ў галіне працы і заняткаў ад 25 чэрвеня 1958 года, а таксама Дагавору паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Польшча аб добрасуседстве і дружалюбным супрацоўніцтве ад 23 чэрвеня 1992 года;

2) палажэнні часткі 2 артыкула 12, частак 1 і 4 артыкула 18, згодна з якімі органам, упаўнаважаным выдаваць Карту паляка, з'яўляецца консул Рэспублікі Польшча ў адпаведнасці з месцам жыхарства заяўніка, — палажэнням пункта «m» артыкула 5 Венскай канвенцыі аб консульскіх зносінах ад 24 красавіка 1963 года, артыкулаў 26 і 29 Консульскай канвенцыі паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Польшча ад 2 сакавіка 1992 года;

3) правілам асобных двухбаковых дагавораў паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Польшча (Пагадненне паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Рэспублікі Польшча аб узаемным працаўладкаванні грамадзян ад 27 верасня 1995 года і Пагадненне паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Рэспублікі Польшча аб узаемных паездках грамадзян, заключанае шляхам абмену нотамі 20 снежня 2007 года), паколькі Закон Рэспублікі Польшча «Аб Карце паляка» прадугледжвае іншыя правілы, чым тыя, што змяшчаюцца ў гэтых двухбаковых дагаворах, а таксама палажэнням артыкула 1 Дагавора паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Польшча аб добрасуседстве і дружалюбным супрацоўніцтве ад 23 чэрвеня 1992 года, які ўстанаўлівае, што Рэспубліка Беларусь і Рэспубліка Польшча выстройваюць свае адносіны як дружалюбныя дзяржавы ў духу ўзаемнай павагі, добрасуседства і партнёрства, кіруюцца прынцыпамі суверэннай роўнасці, неўмяшання ва ўнутраныя справы.

Палата прадстаўнікоў лічыць, што рэалізацыя норм Закона Рэспублікі Польшча «Аб Карце паляка», прынятага без уліку меркавання Рэспублікі Беларусь, закранае інтарэсы Рэспублікі Беларусь, таму што прымяненне дадзенага Закона на тэрыторыі Беларусі можа аказаць уплыў на грамадзянскую згоду і стабільнасць у беларускім грамадстве.

У ходзе падрыхтоўкі пытання да разгляду Канстытуцыйны Суд атрымаў пісьмовыя заключэнні дзяржаўных органаў Рэспублікі Беларусь: Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, Дзяржаўнага сакратарыята Савета Бяспекі, Міністэрства замежных спраў, Міністэрства юстыцыі, Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей, а таксама Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў Рэспублікі Беларусь, у якіх змяшчаецца вывад аб тым, што асобныя нормы Закона Рэспублікі Польшча «Аб Карце паляка» закранаюць інтарэсы Рэспублікі Беларусь і прыняты без уліку некаторых агульнапрызнаных прынцыпаў і норм міжнароднага права.

Канстытуцыйным Судом падвяргаўся аналізу тэкст Закона Рэспублікі Польшча ад 7 верасня 2007 года «Аб Карце паляка» (Ustawa z dnia 7 wrzesnia 2007 r. o Karcie Polaka (Dzennik Ustaw Rzeczypospolitej Polskiej z 2007 r. Nr 180, poz. 1280, z 2008 r. Nr 52, poz. 305, Nr 214, poz. 1348, Nr 216, poz. 1367).

Пры разглядзе Закона Рэспублікі Польшча «Аб Карце паляка» (далей — Закон) Канстытуцыйны Суд зыходзіць з таго, што суб'ектамі адносін, што рэгулююцца Законам, прызнаюцца ў тым ліку грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якім Рэспубліка Беларусь як суверэнная дзяржава ў адпаведнасці з часткай першай артыкула 10 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь гарантуе абарону і заступніцтва на тэрыторыі Беларусі і за яе межамі.

Аднымі з мэт прыняцця Закона, як вынікае з яго прэамбулы, з'яўляюцца ўмацаванне сувязей, якія аб'ядноўваюць палякаў на Усходзе з Радзімай, а таксама падтрымка іх намаганняў па захаванню польскай мовы і культывуванню нацыянальных традыцый. У Законе вызначаны асобы, якім можа быць выдадзена Карта паляка (артыкулы 2 і 16), правы ўладальніка Карты паляка (артыкулы 5 і 6), умовы і парадак выдачы, спынення дзеяння і анулявання Карты паляка, тэрмін яе дзеяння (артыкулы 2, 12—20), а таксама кампетэнцыя і парадак дзейнасці розных органаў (асоб) па пытаннях, звязаных з Картай паляка (артыкулы 9, 12, 13, 15, 18 і інш.). Згодна з часткай 2 артыкула 2 Закона Карта паляка можа быць выдадзена асобе, якая з'яўляецца на дзень падачы заявы аб выдачы Карты паляка грамадзянінам пэўнай краіны, у тым ліку Рэспублікі Беларусь, або валодае ў адной з гэтых дзяржаў статусам асобы без грамадзянства. Органам, які прымае рашэнні аб выдачы Карты паляка, адмове ў яе выдачы або анулюванні Карты паляка, з'яўляецца консул Рэспублікі Польшча ў адпаведнай краіне (артыкулы 12, 13, 17—19 Закона).

Пры аналізе Закона ў частцы яго адпаведнасці агульнапрызнаным прынцыпам і нормам міжнароднага права Канстытуцыйны Суд зыходзіць з наступнага.

1. Асноўныя прынцыпы міжнароднага права замацаваны ў Статуце Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (далей — Статут ААН) і Дэкларацыі аб прынцыпах міжнароднага права, якія датычацца дружалюбных адносін і супрацоўніцтва паміж дзяржавамі ў адпаведнасці са Статутам ААН, адобранай рэзалюцыяй Генеральнай Асамблеі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый ад 24 кастрычніка 1970 года № 2625 (XXV) (далей — Дэкларацыя аб прынцыпах міжнароднага права). Заключны акт Нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе ад 1 жніўня 1975 года (далей — Заключны акт СБСЕ 1975 года), іншыя міжнародныя прававыя акты дапаўняюць пералік асноўных прынцыпаў міжнароднага права, прадугледжаных ва ўказаных міжнародных прававых актах.

У цяперашні час агульнапрызнанымі прынцыпамі міжнароднага права з'яўляюцца перш за ўсё суверэнная роўнасць дзяржаў, добрасумленнае выкананне міжнародных абавязацельстваў, мірнае ўрэгуляванне міжнародных спрэчак, непрымяненне сілы і пагрозы сілай у міжнародных адносінах, неўмяшанне ва ўнутраныя справы дзяржаў, супрацоўніцтва дзяржаў, раўнапраўе і самавызначэнне народаў, тэрытарыяльная цэласнасць дзяржаў, непарушнасць дзяржаўных граніц, павага правоў чалавека і яго асноўных свабод.

Разам з агульнапрызнанымі прынцыпамі ў сістэму міжнароднага права ўключаюцца нормы міжнароднага права. Гэтыя нормы з'яўляюцца правіламі паводзін, якія прыняты ў выніку ўзгаднення пазіцый дзяржаў і ўстанаўліваюць іх правы і абавязкі ў сферы міжнароднага супрацоўніцтва. Нормы міжнароднага права змяшчаюцца як у рашэннях і рэзалюцыях міжнародных арганізацый, у тым ліку такіх універсальных, як Арганізацыя Аб'яднаных Нацый (ААН), Арганізацыя Аб'яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры (ЮНЕСКА), Міжнародная арганізацыя працы (МАП), у якія ўваходзіць большасць дзяржаў свету, так і ў міжнародных дагаворах.

Такім чынам, Канстытуцыйны Суд пры разглядзе Закона ў частцы яго адпаведнасці агульнапрызнаным прынцыпам і нормам міжнароднага права зыходзіць са Статута ААН, Дэкларацыі аб прынцыпах міжнароднага права, Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах ад 16 снежня 1966 года (далей — Пакт аб грамадзянскіх правах), Міжнароднага пакта аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах ад 16 снежня 1966 года (далей — Пакт аб эканамічных правах), Венскай канвенцыі аб консульскіх зносінах ад 24 красавіка 1963 года (далей — Венская канвенцыя), іншых міжнародных актаў, Дагавора паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Польшча аб добрасуседстве і дружалюбным супрацоўніцтве ад 23 чэрвеня 1992 года (далей — Дагавор аб добрасуседстве) і іншых двухбаковых міжнародных дагавораў паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Польшча, якія прадугледжваюць як агульнапрызнаныя прынцыпы і нормы, што ляжаць у аснове міжнародных адносін, так і палажэнні, якія канкрэтызуюць змест гэтых прынцыпаў і норм у адносінах да ўмоў двухбаковага супрацоўніцтва.

2. У Дэкларацыі аб правах асоб, якія належаць да нацыянальных або этнічных, рэлігійных і моўных меншасцей, прынятай рэзалюцыяй Генеральнай Асамблеі ААН ад 18 снежня 1992 года № 47/135, што развівае агульныя прынцыпы і нормы Пакта аб эканамічных правах і Пакта аб грамадзянскіх правах, якія прадугледжваюць роўнасць усіх перад законам і правы меншасцей, замацавана, што асобы, якія належаць да меншасцей, маюць права ўстанаўліваць і падтрымліваць без якой-небудзь дыскрымінацыі свабодныя і мірныя кантакты з іншымі членамі сваёй групы і з асобамі, што належаць да іншых меншасцей, а таксама кантакты праз граніцы з грамадзянамі іншых дзяржаў, з якімі яны звязаны нацыянальнымі, этнічнымі, рэлігійнымі або моўнымі сувязямі (пункт 5 артыкула 2).

Згодна з Рамачнай канвенцыяй аб абароне нацыянальных меншасцей, падпісанай дзяржавамі — членамі Савета Еўропы 1 лютага 1995 года, Бакі абавязваюцца не перашкаджаць ажыццяўленню правоў асоб, якія належаць да нацыянальных меншасцей, устанаўліваць і падтрымліваць свабодныя і мірныя кантакты праз граніцы з асобамі, якія на законных падставах знаходзяцца на тэрыторыі іншых дзяржаў, у прыватнасці з асобамі, з якімі яны маюць агульную этнічную, культурную, моўную і рэлігійную самабытнасць або агульную культурную спадчыну (пункт 1 артыкула 17).

З улікам указанага Канстытуцыйны Суд адзначае, што дзяржавы, не перашкаджаючы ўстанаўленню кантактаў паміж асобамі, якія належаць да нацыянальных меншасцей, у адпаведнасці з міжнароднымі прынцыпамі і нормамі могуць падтрымліваць такія кантакты шляхам прадстаўлення прывілей нацыянальным меншасцям, якія пражываюць у іншых краінах, зыходзячы з этнічнага сваяцтва. Прадстаўленне такіх прывілей знаходзіцца ў межах суверэннай кампетэнцыі дзяржавы, заснаванай на праве кожнай дзяржавы ў адпаведнасці з Дэкларацыяй аб прынцыпах міжнароднага права свабодна выбіраць і развіваць свае сацыяльныя, эканамічныя і культурныя сістэмы і ў адпаведнасці з Заключным актам СБСЕ 1975 года — устанаўліваць свае законы і адміністрацыйныя правілы.

У канстытуцыях раду еўрапейскіх краін (напрыклад, Венгрыі, Македоніі, Польшчы, Румыніі, Славакіі, Славеніі, Украіны, Харватыі) замацаваны абавязак дзяржавы падтрымліваць сваіх суайчыннікаў, якія пражываюць за мяжой.

На ўзроўні закона падтрымка, асобая апека і абарона краінай паходжання сваіх суайчыннікаў, якія пражываюць у замежных дзяржавах, прадугледжаны, у прыватнасці, у Аўстрыі, Балгарыі, Венгрыі, Грэцыі, Італіі, Македоніі, Расіі, Румыніі, Славакіі, Славеніі, Украіне, Харватыі, Чэхіі.

У ліку заканадаўчых мер падтрымкі суайчыннікаў значацца спрошчаныя працэдуры натуралізацыі і іміграцыі ў дзяржаву паходжання, розныя льготы пры атрыманні адукацыі, правядзенні навуковых даследаванняў, наведванні музейных устаноў, карыстанні транспартам, атрыманні медыцынскіх паслуг, працаўладкаванні, набыцці нерухомай маёмасці і інш.

Канстытуцыйны Суд у сувязі з гэтым адзначае, што пунктам 9 плана падрыхтоўкі законапраектаў на 2011 год, зацверджанага Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 6 студзеня 2011 г. № 10, прадугледжана ўнясенне ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь праекта Закона Рэспублікі Беларусь «Аб беларускіх суайчынніках замежжа», у якім маецца на ўвазе прадугледзець адпаведныя прывілеі для беларусаў, якія пражываюць за мяжой.

Такім чынам, прыняцце заканадаўчых актаў дзяржавай паходжання, што ўстанаўліваюць якія-небудзь прывілеі для суайчыннікаў, якія пражываюць за мяжой, адпавядае нормам міжнароднага права і з'яўляецца дастаткова распаўсюджанай міжнароднай практыкай.

Аднак пры гэтым магчымасць устанаўлення дзяржавай пэўных прывілей і льгот па прымеце этнічнага паходжання для грамадзян замежных дзяржаў звязваецца з неабходнасцю прытрымлівання прынцыпаў суверэннай роўнасці дзяржаў, добрасумленнага выканання міжнародных абавязацельстваў, захавання дружалюбных адносін паміж дзяржавамі, павагі правоў і асноўных свабод чалавека, забароны дыскрымінацыі.

Згодна з заключнай часткай даклада, прынятага на 48-й пленарнай сесіі Камісіі Савета Еўропы «За дэмакратыю праз права», якая адбылася 19—20 кастрычніка 2001 года (далей — даклад Венецыянскай камісіі), выкананне ўказаных прынцыпаў патрабуе прытрымлівання ў тым ліку асаблівасцей у адносінах да льготнага рэжыму, які:

можа быць прадастаўлены асобам, якія належаць да нацыянальных меншасцей, у галіне адукацыі і культуры, калі ён мае абгрунтаваную мэту ўмацавання культурных сувязей і суразмерны дадзенай мэце;

не можа быць прадастаўлены ў галінах, якія не датычацца адукацыі і культуры, за выключэннем асобых выпадкаў, калі ён мае законную мэту і суразмерны дадзенай мэце.

У Законе адным з крытэрыяў, якім павінны адпавядаць асобы, што прэтэндуюць на атрыманне Карты паляка, устаноўлена пэўная ўмова — «актыўны ўдзел у дзейнасці на карысць польскай мовы і польскай культуры або польскай нацыянальнай меншасці на працягу не менш трох апошніх гадоў», пацверджаны адпаведнай даведкай (пункт 3 часткі 1 артыкула 2); адной з падстаў адмовы ў выдачы Карты паляка — паводзіны заяўніка ва ўрон базавым інтарэсам Рэспублікі Польшча (пункт 6 артыкула 19); адной з падстаў анулявання Карты паляка — паводзіны ўладальніка Карты паляка, якія зневажаюць Польшчу або палякаў (пункт 1 часткі 1 артыкула 20).

Такім чынам, магчымасць выдачы, адмовы ў выдачы або анулявання Карты паляка на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь звязана з неабходнасцю пэўных паводзін (выканання фактычна пэўных абавязкаў) грамадзян Рэспублікі Беларусь, прычым не толькі польскай нацыянальнасці, перад Рэспублікай Польшча, што не адпавядае агульнапрызнаным прынцыпам павагі правоў чалавека і яго асноўных свабод і недыскрымінацыі. Наяўнасць у Законе ўказаных норм артыкулаў 2, 19 і 20 стварае перадумовы для дыскрымінацыйных праяўленняў на практыцы, калі адрозненні ў падыходах да грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія жадаюць атрымаць Карту паляка, звязваюцца з паводзінамі грамадзяніна, яго жыццёвымі поглядамі і грамадзянскай пазіцыяй, што таксама ў пэўнай меры несумяшчальна і з абавязкамі грамадзян Рэспублікі Беларусь, у тым ліку грамадзян, якія знаходзяцца на дзяржаўнай службе.

У Законе (артыкул 5, пункты 1 і 2 часткі 1 артыкула 6) вызначаны іншыя правілы вызвалення ад платы за выдачу візы на знаходжанне, якая прадугледжвае шматразовы ўезд на тэрыторыю Рэспублікі Польшча, або пакрыцця гэтай платы, чым тыя, што былі замацаваны ў артыкуле 18 Пагаднення паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Рэспублікі Польшча аб узаемных паездках грамадзян ад 26 жніўня 2003 года, якое дзейнічала на момант прыняцця Закона, і змяшчаюцца ў артыкуле 15 дзеючага ў цяперашні час Пагаднення паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Рэспублікі Польшча аб узаемных паездках грамадзян, заключанага шляхам абмену нотамі 20 снежня 2007 года, а таксама іншыя правілы працаўладкавання грамадзян Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Польшча, чым прадугледжаныя ў артыкуле 2 Пагаднення паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Рэспублікі Польшча аб узаемным працаўладкаванні грамадзян ад 27 верасня 1995 года.

У Дэкларацыі аб прынцыпах міжнароднага права адным з агульнапрызнаных прынцыпаў абвешчаны прынцып добрасумленнага выканання дзяржавамі абавязацельстваў, прынятых імі ў адпаведнасці са Статутам ААН. Згодна з артыкуламі 26 і 31 Венскай канвенцыі аб праве міжнародных дагавораў ад 23 мая 1969 года дагаворы павінны выконвацца і тлумачыцца добрасумленна. У сувязі з гэтым Канстытуцыйны Суд адзначае, што асобныя нормы Закона, прынятага Рэспублікай Польшча без уліку меркавання Рэспублікі Беларусь, якія датычацца правоў грамадзян Рэспублікі Беларусь у галіне візавага рэжыму і працаўладкавання на тэрыторыі Рэспублікі Польшча, адрозніваюцца ад правілаў у гэтых галінах, замацаваных у двухбаковых міжнародных дагаворах. Тым самым пры ўстанаўленні ў Законе такіх норм не захаваны прынцып добрасумленнага выканання дагавораў.

Акрамя таго, візавы рэжым, працаўладкаванне, ажыццяўленне прадпрымальніцкай дзейнасці не датычацца сферы адукацыі і культуры, таму прадастаўленне ўладальнікам Карты паляка прывілей і льгот у гэтых галінах (артыкул 5, пункты 1 і 2 часткі 1 артыкула 6) выходзіць за рамкі мэт прыняцця Закона, а таксама несуразмерна ўказаным мэтам. Прывілеі і льготы ў дадзеных сферах могуць быць прадастаўлены толькі ў выключных выпадках, калі гэта абгрунтавана сапраўднай мэтай падтрымання сувязей з дзяржавамі паходжання або адпавядае ёй, на што звернута ўвага ў дакладзе Венецыянскай камісіі.

3. У Дэкларацыі аб прынцыпах міжнароднага права аднымі з асноўных прынцыпаў міжнароднага права, якімі заклікаецца кіравацца дзяржавы ў сваёй міжнароднай дзейнасці і на аснове строгага прытрымлівання якіх яны заклікаецца развіваць свае ўзаемаадносіны, названы прынцып неўмяшання ў справы, што ўваходзяць ва ўнутраную кампетэнцыю любой іншай дзяржавы, а таксама прынцып суверэннай роўнасці дзяржаў.

Прынцып неўмяшання ва ўнутраныя справы прадугледжвае, што ні адна дзяржава або група дзяржаў не мае права ўмешвацца прама або ўскосна па якой на тое б ні было прычыне ва ўнутраныя і знешнія справы любой іншай дзяржавы. У выніку гэтага ўсе формы ўмяшання, накіраваныя супраць правасуб'ектнасці дзяржавы, з'яўляюцца парушэннем міжнароднага права.

Прынцып суверэннай роўнасці дзяржаў уключае наступныя элементы: юрыдычную роўнасць дзяржаў; карыстанне дзяржавай правамі, уласцівымі поўнаму суверэнітэту; абавязак павагі правасуб'ектнасці іншых дзяржаў; недатыкальнасць тэрытарыяльнай цэласнасці і палітычнай незалежнасці дзяржавы; права дзяржавы свабодна выбіраць і развіваць свае палітычныя, сацыяльныя, эканамічныя і культурныя сістэмы, а таксама абавязак кожнай дзяржавы выконваць поўнасцю і добрасумленна свае міжнародныя абавязацельствы і жыць у міры з іншымі дзяржавамі.

У адпаведнасці з пунктам 3 часткі 1 артыкула 2 Закона адной з умоў атрымання Карты паляка з'яўляецца прадстаўленне асобай даведкі ад польскай або паланійнай арганізацыі, што працуе ў тым ліку ў Рэспубліцы Беларусь, якая пацвярджае яе актыўны ўдзел у дзейнасці на карысць польскай мовы і культуры або польскай нацыянальнай меншасці на працягу, прынамсі, апошніх трох гадоў. Канстытуцыйны Суд лічыць, што ў кантэксце ўказанага артыкула дадзеная норма прадугледжвае выдачу грамадскай арганізацыяй даведкі іменна для мэты атрымання Карты паляка.

Канстытуцыйны Суд адзначае, што ў пункце 3 часткі 1 артыкула 2 Закона ўстаноўлена правамоцтва грамадскіх аб'яднанняў, якія зарэгістраваны і дзейнічаюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, выдаваць грамадзянам Рэспублікі Беларусь дакумент, што мае юрыдычнае значэнне для атрымання Карты паляка ў консульскіх установах Рэспублікі Польшча ў адпаведнасці з адміністрацыйнымі працэдурамі, урэгуляванымі заканадаўствам Рэспублікі Польшча. Прамое ўскладанне дзяржаўным органам Рэспублікі Польшча правамоцтваў на суб'ектаў права, у тым ліку на грамадскія аб'яднанні, якія зарэгістраваны і дзейнічаюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з яе заканадаўствам, прадугледжана таксама часткай 4 артыкула 13 Закона, згодна з якой Старшыня Савета Міністраў Рэспублікі Польшча аб'яўляе ва ўрадавым весніку Рэспублікі Польшча «Манітор польскі» (Dziennik Urzendowy Rzeczypospolitej Polskiej «Monitor Polski») пералік польскіх і паланійных арганізацый, упаўнаважаных выдаваць указаныя вышэй даведкі.

Прыведзеныя нормы Закона сведчаць аб распаўсюджванні яго палажэнняў не толькі на суб'ектаў права, якія знаходзяцца пад юрысдыкцыяй Рэспублікі Беларусь, але і на яе тэрыторыю, паколькі ўказаныя суб'екты ўпаўнаважваюцца ажыццяўляць юрыдычна значныя дзеянні на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у мэтах забеспячэння юрыдычных працэдур, прадугледжаных заканадаўствам Рэспублікі Польшча.

У адным з вывадаў, змешчаных у дакладзе Венецыянскай камісіі, падкрэсліваецца, што ніякая квазіафіцыйная функцыя не можа быць замацавана дзяржавай у адносінах да няўрадавых грамадскіх аб'яднанняў, зарэгістраваных у іншай дзяржаве. Любая форма пасведчання на месцы павінна быць атрымана праз консульскія ўлады ў рамках іх паўнамоцтваў, атрыманых у звычайным парадку.

Канстытуцыйны Суд лічыць, што нормы, якія змяшчаюцца ў пункце 3 часткі 1 артыкула 2 і частцы 4 артыкула 13 Закона, не адпавядаюць такім агульнапрызнаным прынцыпам міжнароднага права, як прынцып суверэннай роўнасці дзяржаў і прынцып неўмяшання ў справы, што ўваходзяць ва ўнутраную кампетэнцыю іншай дзяржавы.

4. Згодна з часткай 2 артыкула 12 Закона органам, упаўнаважаным выдаваць Карту паляка, з'яўляецца консул Рэспублікі Польшча ў адпаведнасці з месцам жыхарства заяўніка. У частцы 6 артыкула 13 Закона ўстаноўлена, што ў адносінах да заяўніка, які мае асобыя заслугі перад Польшчай, консул можа прыняць рашэнне аб выдачы Карты паляка без абавязковага прадстаўлення дакументаў, указаных у частцы 3 артыкула 13 дадзенага Закона. У частках 1 і 4 артыкула 18 Закона прадугледжана, што асобе, якой можа быць выдадзена Карта паляка, адпаведны дакумент уручае консул або ўпаўнаважаная ім асоба; у выпадку страты або знішчэння Карты паляка консул па заяве ўладальніка Карты выдае яе дублікат. У Законе вызначаны таксама падставы для прыняцця рашэння консула аб адмове ў выдачы Карты паляка або яе анулюванні (артыкулы 19 і 20).

Канстытуцыйны Суд адзначае, што асноўным міжнародным прававым актам, які рэгулюе грамадскія адносіны, што датычацца выканання консульскіх функцый, з'яўляецца Венская канвенцыя. Пералік консульскіх функцый, замацаваны ў артыкуле 5 дадзенай Канвенцыі, не носіць вычарпальнага характару, і ў адпаведнасці з пунктам «m» гэтага артыкула на консульскую ўстанову прадстаўляемай дзяржавай можа быць ускладзена выкананне іншых функцый, якія не забаронены законамі і правіламі дзяржавы знаходжання або супраць выканання якіх дзяржава знаходжання не мае пярэчанняў альбо якія прадугледжаны міжнароднымі дагаворамі, дзеючымі паміж прадстаўляемай дзяржавай і дзяржавай знаходжання.

У Консульскай канвенцыі паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Польшча ад 2 сакавіка 1992 года канкрэтызаваны консульскія функцыі на тэрыторыі абедзвюх дзяржаў, у прыватнасці прадугледжана, што консульская службовая асоба мае права выдаваць візы, дакументы, якія даюць права на ўезд у прадстаўляемую дзяржаву, а таксама выдаваць, адналяць, пагашаць пашпарты грамадзян прадстаўляемай дзяржавы (артыкул 29). Ва ўказанай Консульскай канвенцыі пацверджаны палажэнні Венскай канвенцыі аб тым, што консульская службовая асоба мае права выконваць іншыя афіцыйныя консульскія абавязкі, акрамя вызначаных дадзенай Канвенцыяй, калі яны не супярэчаць заканадаўству дзяржавы знаходжання або калі дзяржава знаходжання не пярэчыць супраць гэтага (пункт 1 артыкула 26).

З аналізу паўнамоцтваў консульскай службовай асобы ў адпаведнасці з Консульскай канвенцыяй паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Польшча вынікае, што права гэтай службовай асобы на прыняцце рашэнняў наконт выдачы (адмовы ў выдачы, анулявання) Карты паляка ў дадзенай Канвенцыі не прадугледжана. Іншыя двухбаковыя міжнародныя дагаворы паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Польшча, якія ўстанаўліваюць функцыі консульскіх службовых асоб Рэспублікі Польшча па выдачы Карты паляка, не заключаны.

Канстытуцыйны Суд звяртае ўвагу на тое, што з боку Рэспублікі Беларусь — дзяржавы знаходжання консульскай службовай асобы Рэспублікі Польшча ў поўнай адпаведнасці з вышэйназванымі міжнароднымі пагадненнямі польскаму боку былі накіраваны прапановы, якія сведчаць аб наяўнасці пярэчанняў Рэспублікі Беларусь супраць прымянення Закона ў адносінах да грамадзян Рэспублікі Беларусь. Гэта, у прыватнасці, праект Мемарандума па выніках кансультацый паміж Міністэрствам замежных спраў Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам замежных спраў Рэспублікі Польшча адносна Закона Рэспублікі Польшча «Аб Карце паляка», перададзены Рэспубліцы Польшча ў маі 2008 г., прапановы Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь аб увядзенні мараторыя на прымяненне Закона ў адносінах да грамадзян Беларусі. Тым самым выдача на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь консулам Рэспублікі Польшча якіх-небудзь дакументаў, што прадастаўляюць асобным грамадзянам Беларусі правы на прывілеі і льготы, Рэспублікай Беларусь належным чынам не санкцыяніравана.

Акрамя таго, надзяленне Законам консула Рэспублікі Польшча паўнамоцтвамі па вырашэнню ў Рэспубліцы Беларусь пытанняў, звязаных з Картай паляка, неабходна разглядаць як не адпаведнае Дагавору аб добрасуседстве, які прадугледжвае правядзенне палітыкі двухбаковага супрацоўніцтва.

Такім чынам, па меркаванню Канстытуцыйнага Суда, рэалізацыя на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь норм артыкулаў 12, 13 і 18 Закона аб прыняцці рашэння і выдачы Карты паляка консулам Рэспублікі Польшча на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь не адпавядае палажэнням артыкулаў 5 і 73 Венскай канвенцыі, артыкулаў 26 і 29 Консульскай канвенцыі паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Польшча.

З улікам агульнапрызнанага прынцыпу суверэннай роўнасці дзяржава карыстаецца поўным суверэнітэтам, або юрысдыкцыяй, у межах сваёй тэрыторыі. Ніякая іншая дзяржава не можа ажыццяўляць юрысдыкцыю на тэрыторыі дзяржавы без яе згоды.

На падставе выкладзенага Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь лічыць, што Закон Рэспублікі Польшча «Аб Карце паляка» закранае інтарэсы Рэспублікі Беларусь і яго асобныя нормы не адпавядаюць некаторым агульнапрызнаным прынцыпам і нормам міжнароднага права, а іменна:

нормы пункта 3 часткі 1 артыкула 2 і часткі 4 артыкула 13 Закона Рэспублікі Польшча «Аб Карце паляка» ў частцы ўстанаўлення правамоцтваў пэўных грамадскіх аб'яднанняў, якія зарэгістраваны і дзейнічаюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, на вырашэнне пытанняў, звязаных з выдачай Карты паляка, як нормы, што сведчаць аб распаўсюджванні дзеяння дадзеных норм на суб'ектаў права, якія знаходзяцца пад юрысдыкцыяй беларускай дзяржавы, і на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь, не адпавядаюць агульнапрызнаным прынцыпам суверэннай роўнасці дзяржаў і неўмяшання ў справы, што ўваходзяць ва ўнутраную кампетэнцыю іншай дзяржавы, прадугледжаным у Статуце Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, Дэкларацыі аб прынцыпах міжнароднага права, што датычацца дружалюбных адносін і супрацоўніцтва паміж дзяржавамі ў адпаведнасці са Статутам Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, адобранай рэзалюцыяй Генеральнай Асамблеі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый ад 24 кастрычніка 1970 года № 2625 (XXV), і іншых асноватворных міжнародных прававых актах;

нормы часткі 2 артыкула 12, частак 5 і 6 артыкула 13, частак 1 і 4 артыкула 18 Закона Рэспублікі Польшча «Аб Карце паляка», якія датычацца пытанняў выдачы Карты паляка грамадзянам Рэспублікі Беларусь консулам Рэспублікі Польшча, які ажыццяўляе консульскія функцыі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, не адпавядаюць палажэнням артыкулаў 5 і 73 Венскай канвенцыі аб консульскіх зносінах ад 24 красавіка 1963 года, артыкулаў 26 і 29 Консульскай канвенцыі паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Польшча ад 2 сакавіка 1992 года, паколькі іх рэалізацыя на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь прыводзіць да парушэння ўказаных артыкулаў гэтых канвенцый, што прадугледжваюць неабходнасць адсутнасці пярэчанняў Рэспублікі Беларусь на выкананне консульскай службовай асобай Рэспублікі Польшча функцый, не ўстаноўленых у дадзеных канвенцыях, а таксама палажэнням Дагавора паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Польшча аб добрасуседстве і дружалюбным супрацоўніцтве ад 23 чэрвеня 1992 года аб выстройванні адносін паміж дзяржавамі ў духу ўзаемнай павагі, добрасуседства і партнёрства;

нормы артыкула 5, пунктаў 1 і 2 часткі 1 артыкула 6 Закона Рэспублікі Польшча «Аб Карце паляка» ў частцы прадастаўлення грамадзянам Рэспублікі Беларусь, якія маюць Карту паляка, ільготнага візавага рэжыму і прывілей у галіне працаўладкавання як не адпаведныя заяўленым ва ўказаным Законе мэтам і ўстаноўленыя ў аднабаковым парадку, без узгаднення з Рэспублікай Беларусь, не адпавядаюць палажэнням артыкула 15 Пагаднення паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Рэспублікі Польшча аб узаемных паездках грамадзян, заключанага шляхам абмену нотамі 20 снежня 2007 года, а таксама артыкула 2 Пагаднення паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Рэспублікі Польшча аб узаемным працаўладкаванні грамадзян ад 27 верасня 1995 года як парушаючыя агульнапрызнаны прынцып добрасумленнага выканання дзяржавамі абавязацельстваў, прадугледжаны ў Дэкларацыі аб прынцыпах міжнароднага права, якія датычацца дружалюбных адносін і супрацоўніцтва паміж дзяржавамі ў адпаведнасці са Статутам Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, адобранай рэзалюцыяй Генеральнай Асамблеі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый ад 24 кастрычніка 1970 года № 2625 (XXV), і ў артыкулах 26 і 31 Венскай канвенцыі аб праве міжнародных дагавораў ад 23 мая 1969 года.

Пры гэтым Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь звяртае ўвагу Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь на магчымасць з мэтай абароны інтарэсаў Рэспублікі Беларусь уліку выкладзенай у гэтым рашэнні пазіцыі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь пры ўдасканальванні норм законаў «О государственной службе в Республике Беларусь», «Об общественных объединениях», «О гражданстве Республики Беларусь», а таксама пры заканадаўчым рэгуляванні адпаведных адносін, якія датычацца беларускіх суайчыннікаў за мяжой.

**Старшынствуючы —**
**Старшыня Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь**
**П.П. МІКЛАШЭВІЧ**

*7 красавіка 2011 г., г. Мінск*
*№ П-258/2011*

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА РАСКРЫТЫКАВАЎ КІРАЎНІЦТВА МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ ЗА БЕЗГАСПАДАРЧАСЦЬ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, які прыязджаў у Салігорск на фінальны матч IV рэспубліканскіх аматарскіх спаборніцтваў па хакеі, раскрытыкаваў кіраўніцтва Мінскай вобласці за факты безгаспадарчасці, перадае БЕЛТА.**

Звяртаючыся да губернатара Мінскай вобласці Барыса Батуры, кіраўнік дзяржавы сказаў, што калі ён пралятаў над палямі, убачыў, як захоўваюцца ўгнаенні — непасрэдна на адкрытым грунце. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што такія факты недапушчальныя, прычым гэта датычыцца не толькі сталічнага рэгіёну, але і іншых абласцей Беларусі.

Акрамя таго, Прэзідэнт азнаёміўся з тым, як функцыянуе Лядовы палац у Салігорску, пабываў у зале фітнэсу, трэнажорнай зале і зале для гульнявых відаў спорту, а таксама ў аднаўленчым цэнтры.

Першая чарга Лядовага палаца ў Салігорску была здадзена ў эксплуатацыю ў жніўні 2008 года, а другая — у студзені 2011 года. Спартыўна-відовішчны комплекс уключае ў сябе лядовую арэну, спартыўныя залы, харэаграфічную залу і медыка-аднаўленчы цэнтр. Прапускная здольнасць комплексу за 1 дзень складае 620 чалавек. У 2010 годзе гэту спартыўную ўстанову наведалі амаль 120 тыс. чалавек, а за першы квартал гэтага года — амаль 60 тыс.

## БЕЛАРУСЬ РАЗЛІЧВАЕ НА БОЛЬШ ІНТЭНСІЎНАЕ РАЗВІЦЦЁ АДНОСІН З ЗІМБАБВЭ

**Аб гэтым заявіў 9 красавіка Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, сустракаючыся ў Мінску з віцэ-прэзідэнтам Зімбабвэ Джонам Нкома.**

Аляксандр Лукашэнка назваў гэты візіт віцэ-прэзідэнта Зімбабвэ ў Беларусь гістарычным. «Вы займаеце вельмі выгаднае геаграфічнае і стратэгічнае становішча ў Афрыцы, і мы спадзяёмся, што супрацоўніцтва з вашай краінай дасць нам магчымасць пашырыць з вашай тэрыторыі супрацоўніцтва з іншымі дзяржавамі Афрыканканскага кантынента», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка выказаў перакананне, што патэнцыял Беларусі ў аграрнай сферы і прамысловасці можа быць запатрабаваны ў Афрыцы. «Мы гатовы садзейнічаць таму, каб ствараць у вашай краіне сумесныя прадпрыемствы па выпуску такой прадукцыі. Такі вопыт у нас ёсць», — сказаў беларускі лідар. У сваю чаргу Джон Нкома адзначыў, што Зімбабвэ спадзяецца на далейшае супрацоўніцтва з Беларуссю. Ён расказаў, што за апошнія тры дні наведаў у Беларусі шэраг прадпрыемстваў і ад'язджае ва ўпэўненасці, што Беларусь можа многае прапанаваць Зімбабвэ. Джон Нкома таксама перадаў найлепшыя пажаданні кіраўніку беларускай дзяржавы ад Прэзідэнта Зімбабвэ Роберта Мугабе.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## КАМАНДА ПРЭЗІДЭНТА БЕЛАРУСІ ТРЭЦІ РАЗ ВЫЙГРАЛА РЭСПУБЛІКАНСКІЯ АМАТАРСКІЯ СПАБОРНІЦТВЫ ПА ХАКЕІ

**Каманда Прэзідэнта Беларусі стала пераможцай Чацвёртых рэспубліканскіх спаборніцтваў па хакеі сярод аматараў на прызы Прэзідэнцкага спартыўнага клуба, паведамляе БЕЛТА.**

10 красавіка на катку ХК «Юнацтва-Мінск» у сталічным парку Горкага ў другім матчы фінальнай серыі каманда Прэзідэнта ўзяла верх над дружынай Мінскай вобласці — 13:5 (3:2, 5:0, 5:3).

У першым фінальным паядынку, які адбыўся 9 красавіка ў Салігорску, таксама выйграла каманда Прэзідэнта — 8:3. Такім чынам, вынік фінальнай серыі, якая праводзілася да дзвюх перамог, — 2:0 на карысць каманды Прэзідэнта. Бронзавым прызёрам турніру стала каманда Брэсцкай вобласці, якая 9 красавіка ў матчы за 3-е месца перамагла дружыну Гомельскай вобласці — 5:2. Брэсцкія хакеісты ўпершыню за чатыры гады правядзення рэспубліканскіх аматарскіх спаборніцтваў узышлі на п'едэстал. Каманда Прэзідэнта Беларусі трэці раз выйграла рэспубліканскія спаборніцтвы па хакеі сярод аматарскіх каманд.

## Беларускія аўтадылеры гатовы ўкараняць трэйд-ін ужо з 1 мая

**Беларускія аўтадылеры гатовы пачаць укараненне схемы трэйд-ін (купля аўтадылерам старога аўтамабіля кліента ў залік новай іншамаркі) ужо з 1 мая. Аб гэтым паведаміў БЕЛТА брэнд-менеджар аўтамабільнага холдынга «Атлант-М» Ілья ПРОХАРАЎ.**




Паводле яго слоў, рашэнне аб укараненні трэйд-ін у аўтамабільным холдынгу будзе прымаць кожны дылер самастойна. Так, дылер Mazda раней выказаў жаданне працаваць у гэтым напрамку, дылер Ford пакуль са сваёй пазіцыяй не вызначыўся, дылер KIA збіраецца працаваць толькі з патрыманымі іншамаркамі карэйскай маркі, а дылер Volkswagen гатовы прымаць аўтамабілі з прабегам ужо з наступнага месяца.

Спрыяльныя ўмовы для ўкаранення схемы трэйд-ін у Беларусі стварыў указ № 130, падпісаны кіраўніком дзяржавы 4 красавіка. Згодна з указам, падатковая база для разліку ПДВ пры продажы аўтамабіля, набытага ў фізічнай або юрыдычнай асобы, вызначаецца як розніца паміж цаной рэалізацыі і цаной набыцця. Раней ПДВ разлічваўся з поўнага кошту аўтамабіля, што рабіла схему трэйд-ін нявыгаднай для аўтадылераў.

Паводле слоў Ільі Прохарава, прадстаўнікі аўтамабільнага бізнэсу з вялікім аптымізмам сустрэлі ўказ. Дакумент стварае дадатковыя магчымасці для развіцця афіцыйнага рынку аўтамабіляў у Беларусі, што можа прывесці да зніжэння долі ценявога сегмента. Акрамя таго, цяпер спажыўцы атрымаюць магчымасць хутка абмяняць свае старыя іншамаркі на новыя аўтамабілі.

Схема трэйд-ін будзе дзейнічаць наступным чынам: пасля таго як кліент прывязе аўтамабіль дылеру, яго ацэняць, прымуць у залік новай іншамаркі, адрамантуюць і падрыхтуюць да перапродажу на другасным рынку. Пакупнік патрыманага аўтамабіля зможа разлічваць на гарантыю ад дылера. Пакуль, праўда, незразумела, якім чынам аўтадылеры будуць страхаваць свае рызыкі на выпадак вяртання такіх аўтамабіляў па гарантыі або завышанай ацэнкі. Калі для буйной кампаніі памылка ацэншчыка або механіка не моцна адаб'ецца на даходах кампаніі, то для невялікага аўтадылера можа стаць патэнцыйна небяспечнай.

## Крок з абрыву

Разам з бацькамі двухгадовы хлопчык знаходзіўся ля вадаёма за кіламетр ад пасёлка Чырвоны Бор Жыткавіцкага раёна. Пакуль сваякі на беразе мылі машыну, дзіця раптам паслізнулася і звалілася ў ваду з абрыву вышынёй 1,6 м. Бацька кінуўся ўслед, выцягнуў сына з вады і на асабістым аўтамабілі давёз да мясцовай бальніцы, але хлопчык памёр у рэанімацыйным аддзяленні, не прыходзячы ў прытомнасць, паведамляе прэс-служба УУС Гомельскага аблвыканкама.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## Вучні 9-га класа «ўзялі» касу

У Віцебску заведзена крымінальная справа ў дачыненні да двух вучняў дзявятага класа, якія скралі з касавага апарата ў гандлёвым павільёне грашовую выручку — 500 тысяч рублёў. Павільён працуе на тэрыторыі аднаго з самых папулярных у Віцебску гандлёвых цэнтраў «Эвіком». Пра знікненне грошай у міліцыю паведаміў індывідуальны прадпрымальнік.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## Школьнік выратаваў малалетніх суседзяў

**На першым паверсе пяціпавярховага жылога дома па вуліцы Кааператы́ўнай у Лідзе здарыўся пажар. Каля 14 гадзін пра тое ў Лідскае раённае падраздзяленне МНС паведамілі суседзі.**

Да прыбыцця падраздзяленняў выратавальнікаў-пажарных навучэнец сярэдняй школы №13 Уладзіслаў Белавокі (1994 года нараджэння) пранік у кватэру праз балкон і выратаваў дваіх маленькіх хлопчыкаў — 2005 і 2006 гадоў нараджэння.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## Загінулі пенсіянеры

Жыхар в. Беражное (Столінскі раён) ехаў на павозцы па вуліцы роднай вёскі і па нейкай прычыне ўпаў з яе. Пенсіянер загінуў на месцы падзення. А ў Пінскім раёне пенсіянер з в. Чухава лавіў на возеры рыбу з лодкі. Човен перакуліўся — і мужчына ўтапіўся.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## Ну і ну!

### НАПРАКАТ АЎТО І... ТАКСАВАЦЬ

**Прадпрымальная жыхарка Наваполацка брала аўтамабіль напракат і выкарыстоўвала яго ў якасці таксі. Не зарэгістраваўшыся ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка, яна незаконна перавозіла пасажыраў па вечарах і ў начны час.**

Папалася нелегальная таксістка супрацоўнікам падатковай інспекцыі, якія праводзілі тэматычную аператыўную праверку. Цікава, што паўторна. Раней такім жа чынам папалася ўсяго месяц таму.

Быў накладзены арышт на легкавік коштам 15 мільёнаў рублёў. За ажыццяўленне прадпрымальніцкай дзейнасці без дзяржаўнай рэгістрацыі і спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) прадугледжана адміністрацыйная адказнасць у выглядзе штрафу ў памеры да ста базавых велічынь... Таксама могуць канфіскаваць аўто незалежна ад таго, каму яно належыць.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## АЖЫЯТАЖНЫ ПОПЫТ НА ЦУКАР І АЛЕЙ У МІНСКУ СПАДЗЕ ПРАЗ 2-3 ДНІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У пятніцу, суботу, нядзелю магазіны горада атрымлівалі па 350 тон цукру штодзень з улікам астаткаў у аб'ёме амаль 2 тыс. тон. Тым не менш сёння раніцай сталічныя магазіны засталіся практычна без цукру», — канстатаваў кіраўнік упраўлення. Паводле яго слоў, гандлёвая сетка прымае меры: цукровыя заводы ноччу адправілі ў Мінск вагоны са сваёй прадукцыяй. Базы «Белбакалеі» кругласутачна фасуюць цукар для магазінаў.

Па другой таварнай групе — алею — рэалізацыя таксама ўзрасла ў разы. «Калі раней спажывец купляў 1-1,5 л алею, то сёння алей скупляецца ўпакоўкамі па 10-15 кг», — сказаў Валянцін Байдак. Паводле яго слоў, у Мінску маргарынавы завод працуе, ідуць пастаўкі ў гандлёвую сетку, але гэтага недастаткова. «Фірмы-імпарцёры практычна прыпынілі пастаўкі. Яны маюць у наяўнасці алей на складах, але, не ведаючы рэальнага разліковага курсу, прыпынілі пастаўкі», — растлумачыў прадстаўнік галоўнага ўпраўлення спажывецкага рынку гарвыканкама.

Мікалай Ладуцька бачыць у існуючай сітуацыі віну некаторых гандлёвых прадпрыемстваў, якія не арганізавалі бесперабойныя пастаўкі гэтай прадукцыі на прылаўкі. «Гандаль у горадзе за выходныя дні не разгарнуўся. Калі буйныя гандлёвыя сеткі забяспечылі пастаўкі, то дробныя магазіны гэтага не зрабілі», — канстатаваў старшыня Мінгарвыканкама.

Мэр Мінска даручыў кіраўніцтву галоўнага ўпраўлення спажывецкага рынку правесці сустрэчы з прадстаўнікамі кампаній — пастаўшчыкоў алею па пытаннях насычэння рынку гэтай прадукцыяй, а таксама рэкамендаваць дырэктарам магазінаў арганізаваць самавываз цукру з прадпрыемстваў-вытворцаў і аптовых баз. Таксама, на яго думку, магазіны павінны інфармаваць насельніцтва аб адсутнасці падстаў для ажыятажнага попыту. «Неабходна ў кожным гандлёвым аб'екце вывесіць аб'яву аб дастатковым аб'ёме цукру на складах беларускіх прадпрыемстваў. Не трэба на пустым месцы ствараць тое, што не мае пад сабой падстаў», — сказаў Мікалай Ладуцька, падкрэсліўшы пры гэтым, што існуючых запасаў на цукровых заводах краіны, а гэта амаль 150 тон тыс. цукру, хопіць, каб да канца гэтага года прадаваць іх нават у рэжыме ажыятажнага попыту.

«Сёння цукру дастаткова. Няхай, хто хоча, купляе 100 кг. Няхай купляюць. Дзякуй», — сказаў мэр сталіцы аб скупшчыках цукру і даручыў галоўнаму ўпраўленню спажывецкага рынку адрэагаваць на павышаны попыт насельніцтва. «З сённяшняга дня цукар і алей павінны прысутнічаць у магазінах Мінска», — запатрабаваў Мікалай Ладуцька.

Грошы

## У САКАВІКУ ЎКЛАДЫ ЗМЕНШЫЛІСЯ

*Калі ў студзені і лютым беларусы актыўна папаўнялі рублёвыя дэпазіты, то ў мінулым месяцы гэтак жа актыўна здымалі грошы з укладаў*

**Першыя два месяцы гэтага года насельніцтва літаральна біла рэкорды, штомесячна папаўняючы банкаўскія дэпазіты сваімі сродкамі: рублёвыя і дэпазіты ў замежнай валюце за гэты час павялічыліся ў эквіваленце на 2,1 трыльёна рублёў. Прычым у нацыянальнай валюце ўклады за два месяцы ўзраслі на 11 працэнтаў, у замежнай — на 7,1 працэнта. Аднак вядомыя падзеі на валютным рынку краіны ўнеслі свае карэктывы ў сітуацыю: нягледзячы на тое, што па выніках квартала зафіксаваны рост усіх зберажэнняў фізічных асоб у беларускіх банках, дэпазіты ў нацыянальнай валюце за гэты перыяд зменшыліся на 103,8 мільярда рублёў.**

Мабыць, «разжоўваць» тое, па якой прычыне людзі кінуліся ў банкі па свае рублёвыя ўклады, вялікага сэнсу няма: тут усё відавочна. Пасля таго, як пэўнымі «прагнозамі» наконт дэвальвацыі рубля «страсянула» валютны рынак, а чуткам усё не было канца, і яны толькі распалялі ажыятаж, нягледзячы на запэўніванні Нацыянальнага банка пра нязменнасць абвешчанай курсавой палітыкі на год, чакаць нечага іншага і не выпадала. Адметна і тое, што за сакавік адбылося і пэўнае змяншэнне валютных дэпазітаў нашых суайчыннікаў у беларускіх банках — на 40,4 мільёна долараў ЗША ў эквіваленце. Уклады ж у нацыянальнай валюце за месяц знізіліся на 1,18 трыльёна рублёў. Усяго ж за мінулы месяц уклады рублёвыя і ў замежнай валюце) зменшыліся на 1,2 трыльёна рублёў у эквіваленце.

У Нацыянальным банку таксама дадаюць, што на стан укладаў грамадзян у беларускіх банках паўплываў, акрамя сітуацыі на валютным рынку, і павышаны попыт з боку насельніцтва на аўтамабілі. Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» намеснік начальніка Упраўлення інфармацыі галоўнага банка краіны Міхаіл Журавовіч, падводзячы вынікі першага квартала, дэпазіты насельніцтва за гэты перыяд выраслі на 922 мільярды рублёў у эквіваленце, ці на 4 працэнты, і на пачатак красавіка склалі амаль 23,9 трыльёна (нагадаем, што на пачатак сакавіка яны перавышалі 25 трыльёнаў рублёў). Рублёвыя дэпазіты за студзень-сакавік зменшыліся на 1,1 працэнта, у замежнай валюце за адпаведны перыяд, наадварот, узраслі на 272,1 мільёна долараў ЗША ў эквіваленце, ці на 6,2 працэнта. Такім чынам, на пачатак красавіка на ўкладах грамадзян у нацыянальнай валюце знаходзілася больш за 9,7 трыльёна рублёў, у замежнай — больш за 4,65 мільярда долараў ЗША ў эквіваленце.

**Ігар ШЧУЧЭНКА.**

## СІТУАЦЫЯ НА ВАЛЮТНЫМ РЫНКУ НЕ ЗМЫЕ З БЕЛАРУСКАГА РЫНКУ ІМПАРТНЫЯ МЕДПРЭПАРАТЫ

**Сітуацыя на валютным рынку не паўплывае на даступнасць для беларусаў імпартных медыцынскіх прэпаратаў. Аб гэтым у эфіры тэлеканала СТБ паведаміў начальнік упраўлення арганізацыямі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Іван Рыжко, перадае БЕЛТА.**

«У беларускіх аптэках будуць даступны як айчынныя, так і імпартныя медыцынскія прэпараты», — запэўніў Іван Рыжко. Пры гэтым, паводле слоў прадстаўніка Міністэрства аховы здароўя, ніякіх абмежаванняў у сістэме аховы здароўя для закупкі абсталявання, расходных матэрыялаў і лекавых сродкаў няма. «Мы не атрымалі ні ад адной арганізацыі аховы здароўя інфармацыі аб тым, што чалавек не атрымаў лячэння, таму што не далі для гэтага валюту», — дадаў ён. Цяпер фармацэўтычная прамысловасць Беларусі задавольвае попыт насельніцтва на 27 працэнтаў. Да 2015 года гэты паказчык плануецца давесці да 50 працэнтаў. Нягледзячы на тое, што беларускія лякарствы не горшыя за імпартныя, ад замежных медыкаментаў адмаўляцца не будуць. «Калі ў нас не выпускаецца той або іншы медыкамент, а ён карыстаецца попытам у насельніцтва, адназначна ён набываецца ў аптэчную сетку», — адзначыў Іван Рыжко. Закранаючы тэму радыяцыйных фобій, начальнік упраўлення запэўніў, што маніторынг радыяцыйнай абстаноўкі ў Беларусі вядзецца пастаянна. «Радыяцыйная абстаноўка ў краіне спакойная. Ажыятажу ў аптэках ніякага не існуе, людзі за ёдам не бегаюць», — сказаў ён.

## ПАЦЯПЛЕЕ ТОЛЬКІ НА НАСТУПНЫМ ТЫДНІ

**Паведаміла рэдакцыі галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

На працягу тыдня тэмпература паветра ўначы ад мінус 4 да плюс 4 градусаў, удзень — 4—12 цяпла. На выходныя невялікія ападкі месцамі пройдуць у выглядзе дажджу. Уначы будзе ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, удзень — 7—14 цяпла. Дзённы тэмпературны фон у межах 15—20 градусаў павінен усталявацца ў Беларусі ўжо ў другой палове наступнага тыдня.

**Сяргей КУРКАЧ.**



Фота Аляксандра ХІТРОВА.

## ЗЛАМАНЫ ПАЛЕЦ — НЕ ПРЫЧЫНА ДЛЯ ВЫКЛІКУ «ХУТКАЙ»

**У Беларусі плануецца ўвядзенне адказнасці за нанясенне шкоды свайму здароўю шляхам злоўжывання алкаголем, што, у сваю чаргу, абумовіла неабходнасць выкліку хуткай меддапамогі.**

Год ад года колькасць выклікаў, якія паступаюць у службу хуткай медыцынскай дапамогі, стабільна расце. Аднак расце колькасць не толькі сапраўды экстраных ці неадкладных выклікаў, але і выклікаў безвынікoвых ды падманных, калі брыгады хуткай па прыбыцці на месца не знаходзяць пацыента або выкарыстоўваецца заведама падманная інфармацыя аб стане яго здароўя. За мяжой, як вядома, неадкладная дапамога забяспечвае толькі неадкладную дапамогу, а ў нас можна зламаць палец і скарыстацца паслугамі «хуткай» у якасці таксі. Такія карыстальнікі наўрад ці задумваюцца, што адзін выезд «хуткай» складае 80-100 тысяч рублёў. Шэраг самых розных сітуацый патрабуюць ад чалавека ўласнай заклапочанасці сваім здароўем, своечасовага звароту да ўрача па месцы жыхарства.

Паводле слоў галоўнага пазаштатнага спецыяліста па хуткай медыцынскай дапамозе Міністэрства аховы здароўя Беларусі, галоўнага ўрача Бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі г. Мінска Віктара СІРЭНКІ, «служба павінна аказваць дапамогу ў экстраных выпадках, знаходзіцца ў рэжыме чакання і не адцягваць сваю ўвагу на сітуацыі, якія могуць быць вырашаны падчас паходу ў паліклініку. Інакш аднойчы надзвычай цяжка будзе дачакацца хуткай дапамогі, калі яна будзе сапраўды будзе надзвычай патрэбная».

Наогул дзесьці ў 35 працэнтах выпадкаў «хуткая» выязджае на сапраўды экстраныя выпадкі, калі мае месца рэальная пагроза жыццю (гэта могуць быць агнястрэльныя і нажавыя раненні, падзенні з вышыні, дарожна-транспартныя здарэнні, атручэнне — медыкаментознае ці сурагатамі алкаголю, кома і г.д.). У астатніх 65 працэнтах выпадкаў брыгады «хуткай» выязджаюць на неадкладныя выклікі, з якіх каля 30 працэнтаў пацыентаў не маюць патрэбы ў такім выездзе. І праблема ў тым, што нашы грамадзяне не дакладна ўяўляюць сабе «неадкладнасць» сітуацыі. А гэта такое адхіленне ў стане здароўя, якое ў далейшым можа спраўкакваць і пагрозу жыццю.

У сталіцы зараз вырашаецца пытанне аб будаўніцтве ў межах горада пяці новых падстанцый хуткай дапамогі, што павінна забяспечыць даезд да месца выкліку на працягу 15 хвілін. Сцвярджаецца, што айчынная «хуткая» гатовая і да аказання экстранай дапамогі ў выніку самых розных тэхнагенных катастроф.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

**Лодачная пераправа запрацавала на рацэ Ула ў Бешанковіцкім раёне для жыхароў адрэзанай вадой вёскі Ульянаўка. Нягледзячы на тое, што ва Ульянаўцы пражывае крыху больш за 70 чалавек, мясцовыя ўлады і раённы аддзел па НС арганізавалі іх перавозку на «вялікую зямлю». Камунальныя службы выдзелілі чатырохмесную драўляную лодку, прызначылі лодачніка. Перавозка людзей для набыцця прадуктаў харчавання і дастаўкі на працу ажыццяўляецца па графіку з 7 да 20, кожныя 2 гадзіны. У выпадку экстраннай неабходнасці перавезці людзей па-за графікам на дапамогу штатнаму лодачніку прыйдуць выратавальнікі. Толькі за мінулыя выхадныя лодачнай пераправай скарысталіся амаль 60 чалавек.**

**БЕЛТА.**

## ЖЫВЫ ГУК. Абаронена Мінкультам

**Рашэннем калегіі Міністэрства культуры «Аб мерах па паляпшэнні развіцця музычна-эстраднага мастацтва ў Рэспубліцы Беларусь» прыняты загад па абмежаванні выкарыстання фанаграм і заахвочванні практыкі выкарыстання «жывога» гуку ў канцэртных мерапрыемствах.**

Такое рашэнне звязана з тым, што ў краіне вельмі часта адбываюцца парушэнні правоў спажыўцоў, калі замест «жывога гуку» на канцэрце выкарыстоўваецца гук «тэхнічны» — фанаграма. А глядач або слухач, ні пра што не падазраючы, плаціць грошы за жывое выкананне... У адпаведнасці з Законам «Аб абароне правоў спажыўцоў» інфармацыя аб аказанні забаўляльных паслуг выканаўцамі музычных твораў у абавязковым парадку павінна змяшчаць указанне на выкарыстанне фанаграмы. Значыць, калі на канцэртнай афішы няма такой пазнакі, то гук мусіць быць «жывым» — інакш вашыя правы парушаныя і вы маеце права патрабаваць сатысфакцыі.

Рэкамендацыі па абмежаванні выкарыстання фанаграм і пашырэнні практыкі выкарыстання «жывога» гуку ў канцэртных мерапрыемствах Міністэрства культуры накіравала ва ўсе ўпраўленні культуры аблвыканкамаў і Мінгарвыканкама, а таксама ў падпарадкаваныя рэспубліканскія канцэртныя арганізацыі.

Мінкульт плануе праводзіць і іншыя мерапрыемствы, накіраваныя на стымуляванне і развіццё выканальніцкага майстэрства «жывым» гукам.

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**

«А я думаю так...»

## А ЯК ЛЕЧЫЦЕСЯ ВЫ?

**Няўстойлівае вясновае надвор'е — гэта такое ж няўстойлівае здароўе. Вось сонца прыгрэла — і людзі, узрадаваныя цеплынёй, забываюцца пра цёплае паліто і апранаюць тоненькую вятроўку. А пасля раз — і носам хлюпаюць. Хтосьці змагаецца з прастудай дарагімі сіропамі з аптэкі, іншыя — народнай медыцынай. А што больш якасна?**

**Што рабіць, каб не захварэць?**

**Саша ВАРЛАМАЎ, дызайнер:**

— Піць гарбату з мёдам плюс вітаміны. І не хадзіць голым. Калі ўжо захварэлі, то трэба добра прапарыцца і прапацець. Цудоўны сродак — лазня з соллю. Заходзіш у парылку — і націраешся соллю, вынік імгненны. Толькі вось я ўсё адно хварэю (*усміхаецца* — **Аўт.**). Нікуды ад гэтага не дзенешся.

**Ірына ДАРАФЕЕВА, спявачка, заслужаная артыстка Беларусі:**

— Я стараюся загартоўвацца. Кожны дзень хаджу ў басейн. Што датычыць народных сродкаў, то для мяне лепшы сродак — гэта гарбата з мёдам. Час ад часу наведваю лазню. Надвор'е зараз нестабільнае, таму стараюся апранацца як мага цяплей. Бо лепш перастрахавацца, чым перамерзнуць.

**Аляксандр СЯРЭБРАНІКАЎ, тэлевядучы («Нашы навіны», АНТ):**

— Калі лячыцца, то толькі народнымі сродкамі. Асабіста я не надта давяраю лекам. Прынамсі, я люблю добрую лазню з правераным лазеншчыкам, які з дапамогай сваіх венікаў — розных венікаў — выгане з мяне ўсю немач. А пасля лазні абавязкова гарбата з лімонам. Праўда, з-за недахопу часу бываць у лазні удаецца не так часта, як хацелася б. Калі ж такая магчымасць з'яўляецца, бяру з сабой старых добрых сяброў і іду ў лазню — задавальненне ад гэтага атрымліваю вялікае!

**Вольга ФЯДОТАВА, галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра:**

— Надвор'е вясной, і праўда, няроўнае: змена паветраных мас, скачкі тэмпературы, перапады атмасфернага ціску. Лячуся традыцыйнымі метадамі, звяртаюся ў паліклініку, бальніцу. Перад пачаткам сезона можна, вядома, зрабіць і прышчэпку. Але я, напрыклад, яе ўжо не рабіла, бо паспела захварэць да таго, як прыйшоў час прышчэплівацца. А ўвогуле ў нас на аўтаадказчык, акрамя нашых прагнозаў, запісваецца і медыцынскі прагноз — рэкамендацыі кардыёлагаў. Таму асабліва метэазалежныя людзі могуць паслухаць і ўзяць для сябе адтуль штосьці карыснае. А так — лепш за ўсё ўмацоўваць свой імунітэт і займацца спортам.



Фота Пятра ФАМІНА.

**Пятро ВАСЮЧЭНКА, пісьменнік, загадчык кафедры беларускай мовы і літаратуры Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта:**

— Пытанне для мяне актуальнае, бо працую пераважна ў калектывах студэнцкіх. Але заўважыў адну цікавую залежнасць: калі ёсць унутраны настрой не хварэць, то і не захварэеш. То бок ёсць самаўнушэнне. Яшчэ вельмі дарэчы ўжываць вітаміны, як натуральныя, так і ў комплексе, — гэта аскарбінавая кіслата, гематавіт, алігавіт. З прадуктаў — садавіна, а таксама часнок, але яго — толькі ў непрацоўны час (*усміхаецца* — **Аўт.**).

**Апытваў Ільля ЛАПАТО.**

Падпіска-2011

## «ПРЫЗАВЫЯ» — НОВЫМ ПАДПІСЧЫКАМ

**УЧОРА ў сценах рэдакцыі прайшоў традыцыйны штоквартальны розыгрыш прызоў сярод прыхільнікаў «Звязды», якія аформілі падпіску на газету на 2-гі квартал 2011 года і даслалі на ўказаны адрас запоўненыя купоны.**

Як заўсёды, прызавы фонд складаўся з многіх каштоўных прызоў, сярод якіх каляровыя тэлевізары «Віцязь», пыласосы, мікрахвалевая печ. А «размяркоўвалі» іх па добрай традыцыі нашы госці. Яны ж — незалежныя члены журы, якія сачылі за тым, каб розыгрыш прайшоў абсалютна «празрыста» і ў адпаведнасці з Правіламі. З лёгкай рукі інжынера аддзела дагаворнай работы Упраўлення распаўсюджвання СМІ РУП «Белпошта» Кацярыны Літвіненка (на фота злева), тэхніка-праекціроўшчыка УП «Белгіпралес» Алены Белаглавак і ветэрана працы, пенсіянера Фёдара Пацэйкі з г.п. Ушачы Віцебскай вобласці прызавы фонд набыў новых гаспадароў у многіх рэгіёнах Беларусі.

Падрабязнасці розыгрышу і спісы шчаслівчыкаў — у бліжэйшым нумары газеты. Сачыце!

**Кар. «Звязды».**




Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Абзац

◢ У Беларусі на аднаго беспрацоўнага ўмоўна прыходзіцца 1,7 вакансіі (год таму на аднаго прэтэндэнта іх было менш за 0,9). У агульнай колькасці вакансій 77,7% прызначаныя для рабочых. Кожная трэцяя вакансія — у Мінску. У сталіцы свабодных працоўных месцаў у 5,7 раза больш, чым беспрацоўных мінчан.

**◢ На аўтамабільнай дарозе Брэст—Мінск—граніца РФ (М1) пешахода пераехалі адразу дзве аўтамашыны. Інцыдэнт адбыўся позна ўвечары 10 красавіка. Пешаход пераходзіў праезную частку злева направа. Спачатку на яго наехала машына «Альфа Рамэа», а затым — невядомы аўтамабіль, які адразу ж знік з месца здарэння. У выніку ДТЗ пешаход, асоба якога пакуль не ўстаноўлена, памёр на месцы здарэння. У ДАІ падкрэслілі, што ён не абазначыў сябе флікерамі.**

◢ У Мінску з пачатку года павысіўся ўзровень захваральнасці на вятранку: за першы квартал дыягназ ветранай воспы ўстаноўлены 8079 мінчанам (летась — 3263 хворым). Як сведчаць медыкі, пад'ёмы захваральнасці адбываюцца кожныя 5-7 гадоў. У гады з максімальнымі лічбамі (1995-ы і 2007-ы) колькасць выпадкаў дасягала 16,5 — 17 тыс. Асноўная частка захварэлых — дзеці ва ўзросце да 18 гадоў (больш за 90%). Часцей за іншых хварэюць дзеці 2-6 гадоў — выхаванцы дзіцячых садкоў.

### Поўны абзац

**◢ У Новым Арлеане, штат Луізіяна (ЗША), прайшоў чэмпіянат па хуткасным паяданні ракаў. Пераможцай спаборніцтваў стала 43-гадовая амерыканка карэйскага паходжання Соня Томас, вядомая сваімі дасягненнямі ў разнастайных гастранамічных конкурсах. Падчас турніру Соня і адзін з яе супернікаў, навічок Эдрыян Морган, паказвалі аднолькавыя вынікі (кожны з іх з'еў каля 1,5 кг ракаў за 10 хвілін). Аднак у дадатковым раўндзе вопытная ўдзельніца ўзяла верх. Соня Томас па мянушцы Чорная ўдава рэгулярна прымае ўдзел у спаборніцтвах, дзе трэба шмат з'есці. Яна паказала выдатныя вынікі па паяданні смажаных курыных крыльцаў, лобстараў, сасісак, вустрыц, малюскаў і інш. Соня — рэкардсмен у хуткасным спажыванні вараных яек (65 штук за 6 хвілін 40 сек.), крабавых катлет (46 шт. за 10 хвілін). Вага Томас складае каля 45 кг.**

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

## НАДЗЬМУЛА ВЕТРАМ

У Магілёўскай вобласці ў мінулую суботу, калі вецер дасягаў 14-17 метраў у секунду, з дахаў будынкаў зрывала шыфер і металічныя лісты. У Касцюковіцкім і Асіповіцкім раёнах пацярпелі ферма і цялятнікі. У Мсціславе сарвала 147 лістоў шыферу з будынка склада раённага спажывецкага таварыства. У Быхаве без шыфернага даху застаўся склад мінеральных угнаенняў ААТ «Быхаўрайаграпрамтэхснаб», а з будынка ўнівермага моцны вецер сарваў металічны дах на плошчы 12 квадратных метраў.

**Ілона ІВАНОВА.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ



### КЫРГЫЗСТАН РАШЫЎСЯ НА ЎСТУПЛЕННЕ Ў МЫТНЫ САЮЗ

Урад Кыргызстана аднагалосна зацвердзіў склад міжведамаснай камісіі па ўступленні краіны ў Мытны саюз (Беларусь, Расія і Казахстан) і адзіную эканамічную прастору. У маі і верасні краіны МС правядуць сустрэчы, пасля чаго Кіргізіі застанецца толькі ратыфікаваць дагавор пра далучэнне да саюза.

### У ФРАНЦЫІ ПАЧАЛІ ЗАТРЫМЛІВАЦЬ МУСУЛЬМАНАК З ЗАКРЫТЫМІ ТВАРАМІ

**У Францыі ў панядзелак, 11 красавіка, набыў моц закон, які забараняе нашэнне жанчынамі паранджы і хіджаба ў адміністрацыйных установах, транспарце, гандлёвых, школьных і медыцынскіх установах, паштовых аддзяленнях, на пляжах, у грамадскіх парках, на вуліцах гарадоў і ў месцах прагулак.**

Закон прадугледжвае штраф у 150 еўра за парушэнне яго палажэнняў. Па рашэнні суда штраф можа быць заменены ці дапоўнены праслухоўваннем курсу лекцый пра нормы грамадзянскіх паводзін. Асобам, якія спрабуюць прымусіць жанчын насіць паранджу з дапамогай пагроз ці запалохвання, пагражае турэмнае зняволенне да аднаго года і штраф у 30 тысяч еўра. Памер пакарання павялічваецца ўдвая, калі да нашэння паранджы прымушаецца непаўналетняя.



### ПУЦІН ЗАРАБІЎ У ПАЎТАРА РАЗА БОЛЬШ ЗА МЯДЗВЕДЗЕВА

**Супрацоўнікі Крамля і члены ўрада РФ па традыцыі зрабілі справаздачу за леташнія прыбыткі. З падатковых дэкларацый высветлілася, што прэзідэнт Расіі Дзмітрый Мядзведзеў зарабіў за 2010 год у паўтара раза менш, чым прэм'ер-міністр Уладзімір Пуцін.**

Паводле даведкі, накіраванай Мядзведзевым у Федэральную падатковую службу, прэзідэнт за мінулы год атрымаў 3 378 673 рубля, паведамляецца на сайце Крамля. Прыбыткі Пуціна, па звестках сайта ўрада, склалі за 2010 год 5 042 257 рублёў.

За 2009 год прыбытак Мядзведзева быў прыкладна такі ж і складаў 3 335 281 рубель. У свежай дэкларацыі Мядзведзеў паведаміў пра валоданне сумесна з жонкай Святланай кватэрай, пра якую гаворка ішла і раней, — плошчай 367,8 кв.м. За год прэзідэнт павялічыў колькасць рахункаў і грошай на іх — цяпер ён мае ў банках Расійскай Федэрацыі 14 рахункаў на агульную суму 4 961 528,98 руб. Прэзідэнт таксама паведаміў пра новае набыццё — зараз ён валодае на ўмовах арэнды зямельным участкам у Расійскай Федэрацыі плошчай 4700 кв. м. Застаўся задэклараваным і аўтамабіль ГАЗ-20 «Перамога» 1948 года выпуску.

На сайце ўрада гаворыцца, што, акрамя прыбытку ў 5 млн, у Пуціна ёсць зямельны ўчастак пад індывідуальнае жыллёвае будаўніцтва плошчай 1500 кв. м, а таксама ён мае ва ўласнасці тры аўтамабілі (ГАЗ М-21, ГАЗ М-21Р, «Ніва») і аўтапрычэп «Скіф», атрыманы ў спадчыну ад бацькі. Пуцін таксама валодае кватэрай плошчай 77 кв. метраў і яшчэ адной, у бестэрміновым карыстанні, плошчай 153,7 кв. м.

### НА ЦІМАШЭНКУ ЗАВЯЛІ СПРАВУ ЗА ГАЗАВЫЯ КАНТРАКТЫ З РАСІЯЙ

**У адносінах да былога прэм'ера Украіны Юліі Цімашэнкі заведзена новая крымінальная справа.**

Паводле слоў першага намесніка генпракурора Украіны Рэната Кузьміна, гаворка ідзе пра перавышэнне ўлады і службовых паўнамоцтваў падчас заключэння газавых кантрактаў з Расіяй у 2009 годзе. Кузьмін адзначыў, што кантракты нанеслі Кіеву ўрон у памеры 1,5 мільярда грыўняў (каля 200 мільёнаў долараў).

У 2009 годзе ў кантракце паміж украінскім «Нафтагазам» і расійскім «Газпрамам» на 2009—2019 гады быў зацверджаны базавы кошт на расійскі газ у 450 долараў за тысячу кубаметраў. Савет нацыянальнай бяспекі Украіны тады прызнаў кошт эканамічна неабгрунтаваным і адным з самых высокіх у Еўропе.



АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ
WWW.RLT.BY

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Минского райпо (продавец) ПРОВОДИТ ОЧЕРЕДНОЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН по продаже объектов недвижимого имущества в составе:**

**Лот № 1:** здание магазина, об. пл. 128,5 кв.м, **Минский р-н, Крупицкий с/с, д. Закружка.**

**Начальная цена с НДС – 87 408 560 бел. рублей.**

**Лот № 2:** здание магазина, об. пл. 94,2 кв.м, **Минский р-н, Самохваловичский с/с, д. Углы.**

**Начальная цена с НДС – 33 600 000 бел. руб. (снижена на 50%).**

**Лот № 3:** здание магазина, об. пл. 94,1 кв.м, **Минский р-н, Крупицкий с/с, д. Дубинки.**

**Начальная цена с НДС – 31 800 000 бел. рублей (снижена на 50%).**

**Лот № 4:** здание магазина «Хозтовары», об. пл. 187,0 кв.м, **Минский р-н, Ждановичский с/с, д. Ждановичи.**

**Начальная цена с НДС – 166 160 000 бел. руб. (снижена на 40%).**

**Задаток 10 % от начальной цены.**

*Подробное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звезда» от 07.10.2010.*

Аукцион состоится **21.04.2011 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **20.04.2011 до 17.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.**

**25.04.2011 г. в 12.30 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Татьяна».**

**Повестка дня:**

**1.** О внесении изменений и дополнений в устав ОАО «Татьяна» и утверждении устава общества в новой редакции.

**2.** О внесении изменений и дополнений в устав ЧТУП «Торговый дом ОАО «Татьяна» и утверждении устава общества в новой редакции.

Собрание будет проходить по адресу: г. Гомель, ул. Павлова, 26.

Начало регистрации участников собрания: 12.00. *УНП 400068248*

БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ БАНК
BELARUSKY NARODNY BANK

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2011 г.**

ОАО «Белорусский народный банк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.04.2011 | 01.04.2010 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 10 226,4 | 4 082,4 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 116 959,7 | 2 282,5 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 6 338,1 | 49 992,3 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 1 533,6 | - |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 146 524,3 | 52 973,0 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 1 051,1 | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 77,8 | 3,8 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 32 699,0 | 29 251,8 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | - | - |
| 12 | Прочие активы | 1111 | 4 636,0 | 3 155,1 |
| 13 | ИТОГО активы | 11 | 320 046,0 | 141 740,9 |
| 14 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 15 | Средства Национального банка | 1201 | 99 003,4 | - |
| 16 | Средства банков | 1202 | 37 420,3 | 15 493,3 |
| 17 | Средства клиентов | 1203 | 69 970,0 | 19 622,9 |
| 18 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | - | - |
| 19 | Производные финансовые обязательства | 1205 | 1 387,5 | - |
| 20 | Прочие обязательства | 1206 | 556,8 | 993,3 |
| 21 | ВСЕГО обязательства | 120 | 208 338,0 | 36 109,5 |
| 22 | **КАПИТАЛ** | | | |
| 23 | Уставный фонд | 1211 | 69 219,7 | 69 219,7 |
| 24 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 25 | Резервный фонд | 1213 | 3 996,3 | 3 996,3 |
| 26 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 26 381,6 | 21 698,2 |
| 27 | Накопленная прибыль | 1215 | 12 110,4 | 10 717,2 |
| 28 | ВСЕГО капитал | 121 | 111 708,0 | 105 631,4 |
| 29 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | 320 046,0 | 141 740,9 |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2011 г.**

ОАО «Белорусский народный банк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.04.2011 | 01.04.2010 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 5 133,3 | 4 139,9 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 1 093,0 | 513,8 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 4 040,3 | 3 626,1 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 2 419,8 | 724,0 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 1 400,4 | 92,5 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 1 019,4 | 631,5 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | - | - |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 2 195,5 | 493,8 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | (353,8) | - |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 899,5 | 942,0 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 80,0 | 1 111,7 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 5 654,3 | 3 850,0 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 324,0 | 169,3 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 103,6 | 901,8 |
| 16 | Налог на прибыль | 212 | - | 103,1 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 103,6 | 798,7 |

**Генеральный директор** **К. Церетели**

**Зам. Главного бухгалтера** **Н.П. Шнип**

**Дата подписания «05» апреля 2011 года**

Лицензия № 10 на осуществление банковской деятельности, выданная Национальным банком РБ 27 августа 2008 г.

## Конкурсный управляющий КПТУП «Поставский консервный завод»

**(УНП 300077711) — УП «ДжиЭс плюс» (www.gsplus.by) — извещает о проведении 28.04.2011 г. в 12 ч. 00 мин. по адресу: г. Минск, ул. Скрыганова, 6/3, оф. 2304**

**открытых торгов в форме аукциона**
**(на повышение начальной цены)**
**по продаже имущества:**

**Лот № 1:** 1) Капитальное строение 1380 м кв. — винный цех. 2) Капитальное строение 537,9 м кв. — мастерская. 3) Капитальное строение 1164,1 м кв. — консервный цех. 4) Капитальное строение 940,6 м кв. — склад модуль. 5) Капитальное строение 2199 м кв. — административное здание. 6) Капитальное строение 77,8 м кв. — автовесовая.

Начальная цена (включая НДС) 659 156 617 рублей. Задаток 65 916 000 руб. Шаг торгов — 65 916 000 руб.

Имущество расположено в г. Поставы, ул. Крупской, 34а на территории общей площадью 4,6 га.

Прием заявок происходит по адресу: г. Минск, ул. Скрыганова, 6/3, оф. 2304 с даты настоящей публикации до 28.04.2011 г. с 9.00 до 18.00, здесь же ознакомление с составом лота и др. сведениями, формой заявки, договоров и др. документов. Тел. в г. Минске: 8(017) 2046870. Оплата производится с даты настоящей публикации до 28.04.2011 г. на р/с КПТУП "Поставский консервный завод" № 3012201120018 в ОАО "Белагропромбанк" отд. в г. Поставы, код 150801434.

Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения имущества по сравнению с предложениями других участников. Заключение договора купли-продажи осуществляется в теч. 10 раб. дней со дня проведения торгов. Победитель торгов в теч. 10 календ. дней со дня заключения договора купли-продажи оплачивает цену за минусом внесенного задатка. Участникам, не признанными победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 5 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов. Способ уведомления участников об итогах торгов: в день торгов, публично.

В случае заявки одного участника на аукцион ему будет предложено приобрести выставляемый лот по начальной цене плюс 5 (пять) процентов.



## ОАО «МИНСКЭНЕРГОСТРОЙ» (220019, г. Минск, ул. Монтажников, д. 39) уведомляет акционеров:

В соответствии с решением внеочередного общего собрания акционеров (протокол № 24 от 11.04.2011 г.) принято решение о покупке на баланс Общества до 2668 штук простых (обыкновенных) акций ОАО «Минскэнергострой» по цене 18000 рублей за одну акцию с оплатой денежными средствами с целью дальнейшей продажи инвестору.

На собрании акционеров утверждены следующие условия приобретения Обществом акций собственного выпуска на баланс:

| | |
|---|---|
| Полное наименование и местонахождение эмитента | Открытое акционерное общество «Минскэнергострой» г. Минск, ул. Монтажников, д. 39 |
| Адрес, по которому будут приниматься заявления акционеров с предложением о продаже и заключаться договоры купли-продажи акций | г. Минск, ул. Монтажников, д. 39 |
| Срок, в течение которого принимаются предложения акционеров о продаже принадлежащих им акций | с 18.04.2011 г. по 22.04.2011 г. |
| Срок, в течение которого осуществляется приобретение акций | с 25.04.2011 г. по 17.05.2011 г. |
| Сроки, форма и порядок оплаты акций | В течение 15-ти банковских дней с момента зачисления акций на счет «депо» эмитента, путем выплаты наличных денежных средств из кассы общества или по безналичному расчету путем перечисления денежных средств на счет продавца |

УНП 100008291



## ОТЧЕТ О РЕЗУЛЬТАТАХ ФИНАНСОВО-ХОЗЯЙСТВЕННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ за 2010 год

## ОАО «ПОЛОЦКИЙ ЗАВОД «ПРОММАШРЕМОНТ»

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС** *млн руб.*

| | Код строки | На начало года | На конец года |
|---|---|---|---|
| **АКТИВ** | | | |
| 1. Внеоборотные активы | 190 | 20483 | 18962 |
| 2. Оборотные активы | 290 | 5001 | 7611 |
| Баланс | 300 | 25484 | 26573 |
| **ПАССИВ** | | | |
| 3. Капитал и резервы | 490 | 19556 | 19628 |
| 4. Обязательства | 690 | 5928 | 6945 |
| Баланс | 700 | 25484 | 26573 |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за 2010 год** *млн руб.*

| | Код строки | 2010 г. | 2009 г. |
|---|---|---|---|
| Выручка от реализации товаров, работ, услуг | 010 | 11044 | 8052 |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции | 030 | 7814 | 5889 |
| Прибыль от реализации | 070 | 1430 | 903 |
| Прибыль от операционных доходов и расходов | 120 | 70 | 79 |
| Прибыль от внереализационных доходов и расходов | 160 | -304 | -456 |
| Налоги, сборы и платежи из прибыли, расходы на прибыль | (250+260+270) | 529 | 361 |
| Чистая прибыль | 300 | 667 | 165 |

УНП 300075193



## Вниманию акционеров Открытого акционерного общества «ПАРИТЕТБАНК»

*Место нахождения общества: г. Минск, ул. Киселёва, 61а*

ОАО «Паритетбанк» сообщает, согласно решению годового Общего собрания акционеров от 30 марта 2011 года, протокол № 3, с 26 мая 2011 года будет осуществляться выплата дивидендов по итогам работы банка за 2010 год в размере:

- по простым (обыкновенным) акциям – 0,0359 рубля на одну акцию,
- по привилегированным акциям – 0,48 рубля на одну акцию.

Список акционеров, имеющих право на получение дивидендов, составлен в соответствии с реестром владельцев ценных бумаг банка по состоянию на 1 марта 2011 года.

Выплата дивидендов акционерам ОАО «Паритетбанк» осуществляется:

юридическим лицам в безналичном порядке путем зачисления на текущие (расчетные) счета;

физическим лицам в безналичном порядке путем зачисления на текущие счета либо в установленном порядке наличными денежными средствами.

**Телефон для справок: 8 017 288 64 74.**

Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь от 27.10.2006 г. № 5. УНП 100233809.



ИП Кравцова Елена Анатольевна (УНП 391429248) прекращает свою деятельность.


Футбол. Чэмпіянат Беларусі

# БАТЭ і мінскае «Дынама» зноў губляюць ачкі

## Брэсан папрасіў прабачэння за незабіты пенальці

**Прайшлі матчы трэцяга тура чэмпіянату Беларусі па футболе. Два сёлетнія фаварыты страцілі ачкі. Чэмпіён краіны барысаўскі БАТЭ не здолеў абыграць магілёўскі «Днепр», які да гэтага саступаў у двух папярэдніх турах. Сталічнае «Дынама» таксама ўнічыю згуляла з «Гомелем», які мінулы сезон правёў у першай лізе. Сітуацыяй скарыстаўся «Шахцёр», які і выйшаў пакуль у лідары.**

Магілёўскі «Днепр» (ён, дарэчы, пасля двух тураў заставаўся адзіным клубам, што не меў на рахунку ніводнага ачка) прымаў барысаўскі БАТЭ. Улічваючы статус гасцей, можна было меркаваць, што гаспадары і далей будуць замыкаць групу аўтсайдараў. Аднак падапечным Андрэя Скарабагацькі трэба аддаць належнае: ужо на 4-й хвіліне «Днепр» павёў 1:0. Былы варатар БАТЭ, які зараз абараняе колеры магілёўскага клуба, Барыс Панкратаў выдатна настроіўся на матч супраць свайго былога клуба і пасля таго, як вароты БАТЭ былі ўзятыя, выратоўваў у любых сітуацыях. Сам **Рэнан Брэсан** не здолеў забіць Панкратаву пенальці. За гэта, дарэчы, бразільскі легіянер пасля матча прасіў прабачэння ў балельшчыкаў:

— Ключавым эпізодам стаў нерэалізаваны мной пенальці. У футболе здараецца ўсякае, але я прашу ў балельшчыкаў прабачэння. Гэта мая віна.

Паядынак быў нервовы і з багаццем парушэнняў: абедзве каманды ў сярэдзіне гульні страцілі па гульцу. А БАТЭ, саступаючы ўвесь матч, усё-такі адыграўся і апраўдаў свой стэрэатып шчаслівчыкаў: на 87-й хвіліне пасля падачы вуглавога Брэсанам забіць удалося Гардзейчуку.

— Мне абсалютна не спадабалася, як мы гулялі ў першым тайме. У нас не было не канцэнтрацыі, ні страсці для перамогі. Прапусцілі мяч — і слаба на гэта адрэагавалі. Але ў цэлым па выкананні гэта наш лепшы матч у сезоне, — так ацаніў гульню **Віктар Ганчарэнка.**

— Трэцяе паражэнне запар магло прывесці да доўгага накаўта, ад якога псіхалагічна складана было б адысці. Цудоўна згуляў Бора Панкратаў, — адзначыў галоўны трэнер магіляўчан **Андрэй Скарабагацька.**

Сталічнае «Дынама» таксама сустракалася з менш рэйтынгавым супернікам. Праўда, «Гомель» нядрэнна пачаў сёлетні чэмпіянат, атрымаўшы перамогу і нічыю ў папярэдніх турах. Вырашальным фактарам у гэтым матчы стаў газон стадыёна «Дынама», які не змаглі аднавіць пасля лютаўскага матча БАТЭ ў Лізе Еўропы і ён пагаршаецца ад тура да тура. Каманды не здолелі ўзяць вароты (для «Дынама» гэта другая запар нулявая нічыя на галоўнай футбольнай арэне). Пасля трэцяга тура, дарэчы, стадыён «Дынама» будзе зачынены на 2 месяцы: газон будуць рыхтаваць да чэрвеньскай гульні зборнай супраць каманды Францыі.

— Хлопцы стараліся, трэба аддаць ім належнае. Але штосьці не атрымалася. Самааддача — гэта выдатна, але вынікам я незадаволены, — заявіў пасля матча трэнер бела-блакітных **Алег Васіленка.**

Тым часам «Шахцёр», які нечакана прайграў у першым туры, запісаў на свой рахунак другую перамогу — на гэты раз над «Віцебскам» (1:0) — і выйшаў у лідары чэмпіянату. На 16-й хвіліне гол забіў Камароўскі. Самым вострым на барацьбу і багатым на забітыя мячы аказаўся бескампрамісны паядынак у Брэсце паміж мясцовым «Дынама» і «Мінскам». Каманды па чарзе вялі ў ліку, аднак гол на 90-й хвіліне Хачатурана выратаваў гасцей ад паражэння. «Тарпеда» дома саступіла «Белшыне» (0:1), а «Нафтан» на хатнім стадыёне прайграў «Нёману» (1:2).

Становішча каманд: «Шахцёр» — 6 ачкоў, «Дынама» Бр — 5, «Мінск» — 5, «Дынама» Мн — 5, БАТЭ — 5, «Гомель» — 5, «Нёман» — 4, «Тарпеда» — 4, «Белшына» — 4, «Нафтан» — 1, «Днепр» — 1, «Віцебск» — 1.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

Паводка

## Ляцягі ад Улукаў аддзяліла веснавая вада

**У суботу павысіўся ўзровень вады ў рацэ Віхра. У раёне вёскі Чырвоны Бераг Мсціслаўскага раёна падтапіла мост. Узровень вады над мостам складае 30-40 сантыметраў. Транспарт накіроўваецца ў аб'езд, жыццезабеспячэнне вёсак не парушана.**

Падобная сітуацыя склалася ў Слаўгарадскім раёне, дзе 10 красавіка ў выніку павышэння ўзроўню вады ў рацэ Проня падтапіла ўчастак дарогі ад вёскі Улукі да вёскі Ляцягі. Паўсотні метраў дарогі пад вадой, яе ўзровень — 10-30 сантыметраў.

Паводле інфармацыі Магілёўскага абласнога УМНС, цяпер падтопленымі застаюцца наступныя аўтамабільныя масты: праз раку Сож у Мсціслаўскім раёне на дарозе ад вёскі Парадзіна да вёскі Засожжа, праз раку Бесядзь у раёне вёскі Боханы Хоцімскага раёна, праз раку Проня ў раёне вёскі Скварск Чавускага раёна.

**Ілона ІВАНОВА.**

## І Гараджанка «разышлася»

**Падтапіла тры аўтамабільныя масты, два жылыя дамы, больш за дзесяць падворкаў — такая сумная статыстыка пачатку сёлетняй паводкі ў Віцебскай вобласці.**

Як паведамілі «Звяздзе» ў Віцебскім абласным упраўленні па надзвычайных сітуацыях, у ліку іншага ў выніку павышэння ўзроўню вады ў рацэ Ардышаўка (прыток ракі Лучоса) падтапіла мост ля вёскі Кучыншчына Лёзненскага раёна. Узровень вады над мостам — 1,2 метра.

А прыток Заходняй Дзвіны Ула так разлілася, што мост ля вёскі Ульянаўка Бешанковіцкага раёна таксама апынуўся пад вадой. Узровень вады над збудаваннем — большы за 2,4 метра...

У выніку павышэння ўзроўню вады ў рацэ Гараджанка падтапіла домаўладанні і гаспадарчыя забудовы ў Гарадку — на 3-м Вакзальным завулку. Шэсць чалавек былі эвакуяваны і пажадалі перачакаць складаны час «вялікай вады» ў сваякоў.

У Верхнядзвінску вада падтапіла пяць падворкаў, у Аршанскім — дзевяць падворкаў з дачнымі дамамі і гаспадарчымі забудовамі, адзін — у Віцебскім раёне.

Супрацоўнікамі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях і іншых ведамстваў, мясцовымі ўладамі робіцца ўсё магчымае, каб страты ад стыхіі былі мінімальнымі. Людзі, якія пражываюць або працуюць у «праблемных» населеных пунктах, былі папярэджаны аб будучым «водным балі» загадзя.



Фота Марыны ГАРЭЛАВАЙ.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Спорт-тайм

### ВІКА АЗАРАНКА ВЫЙГРАЛА ТУРНІР У ІСПАНІІ



На мінулым тыдні наша тэнісістка Вікторыя Азаранка пасля выйгрышу турніру ў Маямі ўзяла ўдзел яшчэ ў адных спаборніцтвах. Яны праходзілі ў іспанскай Марбелы. Гэты турнір з прызавым фондам у 220 тысяч долараў таксама выйграла беларуская тэнісістка. Азаранка зарабіла 35 тысяч долараў. Цяпер на рахунку Вікторыі 7 перамог на прадстаўнічых міжнародных спаборніцтвах. У сусветным рэйтынгу яна паднялася з 6-й на 5-ю пазіцыю.

Іспанскі турнір быў не такім прадстаўнічым, як тыдзень таму ў Маямі. Топ-10 прадстаўляла толькі Вікторыя. Таму ў фінале яна без праблем справілася з румынкай Ірынай-Самеліяй Бегу (138-я ў рэйтынгу). На шляху да фіналу Азаранка сустракалася з іспанкамі Арантай Пара-Сантоньяй (65) і Лаурай Поўс-Ціо (82), расіянкай Дзінарай Сафінай (81) і італьянкай Сарай Эрані (43).

Днямі Вікторыя Азаранка прыедзе ў Мінск для падрыхтоўкі да матча плэй-оф 2-й Сусветнай групы Кубка Федэрацый супраць каманды Эстоніі, які пройдзе 16-17 красавіка ў мінскім Палацы спорту. Таксама ў нашу зборную ўвайшлі Вольга Гаварцова (68), Дар'я Кустава (177) і Таццяна Пучак (434).

### СЯРГЕЙ МАРТЫНАЎ «ВЫБІЎ» ЭТАП КУБКА СВЕТУ

Беларускі стралок Сяргей Мартынаў выйграў у панядзелак этап Кубка свету па стральбе з малакаліберная вінтоўкі з дыстанцыі 50 м са становішча лежачы. Спаборніцтвы праходзяць у паўднёвакарэйскім Чанвоне. Наш спартсмен выбіў 700,4 ачка, апярэдзіўшы амерыканца Эрыка Аптэграфта (699,6) і француза Сірыла Графа (698)

### НА АДКРЫТЫМ ЧЭМПІЯНАЦЕ ІСПАНІІ ДРУГІМ СТАЎ УЛАДЗІМІР САМСОНАЎ

Уладзімір Самсонаў заваяваў серабро на адкрытым чэмпіянаце Іспаніі па настольным тэнісе, які праходзіў у Альмерыі. Турнір уваходзіць у серыю «Про-тур». У фінале беларус, на жаль, саступіў паўднёвакарэйцу Юнг Санг Оху — 1:4 (9:11, 15:17, 11:5, 6:11, 10:12). На шляху да фіналу Самсонаў перамог японца Каі Ёшыду — 4:2, паўднёвакарэйца Кім Мін Сеока — 4:3 і турка Лі Ахмета — 4:2.

Беларускія тэнісісткі Вераніка Паўловіч, Алена Дубкова і Аляксандра Прывалава выбылі са спаборніцтваў у першым раўндзе.

### ЛЮБОЎ ЧАРКАШЫНА ЗАВАЯВАЛА ЧАТЫРЫ МЕДАЛІ

Абсалютнай пераможцай трэцяга этапу Гран-пры па мастацкай гімнастыцы, які праходзіў у французскім Тыае, стала, вядома ж, расіянка. Алімпійская чэмпіёнка Пекіна Яўгенія Канаева выйграла шматбор'е, а таксама фіналы ва ўсіх чатырох асобных відах. А вось беларуска Любоў Чаркашына заняла ў шматбор'і трэцяе месца, прапусціўшы на другое яшчэ адну расійскую гімнастку Яну Луконіну.

У асобных відах наша гімнастка таксама заняла прызавыя месцы: у фінале практыкаванняў з булавамі Чаркашына заваявала серабро, у практыкаваннях з абручом і стужкай яна была трэцяй.

**Алена КРАВЕЦ.**


## Открытое акционерное общество «СТРОЙТРЕСТ № 35»

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС за 2010 год**

| АКТИВ | На начало отчетного года, млн.руб. | На конец отчетного года, млн. руб. | ПАССИВ | На начало отчетного года, млн. руб. | На конец отчетного года, млн. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| **I. Внеоборотные активы** | | | **III. Капитал и резервы** | | |
| Основные средства: | | | Уставный фонд | 54 | 54 |
| первоначальная стоимость | 24 580 | 30 529 | Резервный фонд | 384 | 384 |
| | | | Добавочный фонд | 14 895 | 18 688 |
| амортизация | 10 905 | 12 772 | Нераспределенная прибыль | 1 149 | 54 |
| остаточная стоимость | 13 675 | 17 757 | | | |
| Нематериальные активы остаточная стоимость | 2 | 4 | Целевое финансирование | - | - |
| | | | **Итого по разделу III** | **16 482** | **19 180** |
| Вложения во внеоборотные активы | 205 | 478 | **IV. Долгосрочные кредиты и займы** | **790** | **2 116** |
| **Итого по разделу I** | **13 882** | **18 239** | **V. Краткосрочные обязательства** | | |
| **II. Оборотные активы** | | | Краткосрочные кредиты и займы | 1 077 | 1 076 |
| Запасы и затраты | 8 283 | 13 648 | | | |
| Налоги по приобретенным ценностям | 56 | 293 | Кредиторская задолженность | 20 229 | 31 080 |
| Дебиторская задолженность | 16 199 | 16 177 | Задолженность перед участниками (учредителями) | 107 | 112 |
| Денежные средства | 265 | 5 167 | | | |
| Прочие оборотные активы | 3 131 | 4 300 | Прочие краткосрочные обязательства | 3 131 | 4 260 |
| **Итого по разделу II** | **27 934** | **39 585** | **Итого по разделу V** | **24 544** | **36 528** |
| **БАЛАНС** | **41 816** | **57 824** | **БАЛАНС** | **41 816** | **57 824** |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ**

| Наименование показателей | Код строки | За отчетный период, млн. руб. |
|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 |
| **I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 010 | 110248 |
| Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 011 | 7366 |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) | 020 | 102882 |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 030 | 97927 |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020-030-040-050) | 060 | 4955 |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от операционных доходов и расходов | 120 | 166 |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от внереализационных доходов и расходов | 160 | -2489 |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (060 +/- 120 +/- 160) | 200 | 2632 |
| Налоги, сборы и платежи из прибыли | 210 | 1169 |
| Прочие расходы и платежи из прибыли | 220 | 88 |
| ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200-210-220) | 240 | 1375 |
| Справочно (из строки 240): сумма предоставленной льготы по налогу на прибыль | | 1420 |
| Начислено на выплату дивидендов за 2010 год | | 43 |
| Количество акционеров | | 357 |

**АУДИТОСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ**

По мнению аудиторской организации ООО «АудитБизнесКонсалт» бухгалтерская (финансовая) отчетность ОАО «Стройтрест № 35», сформированная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, достоверно отражает во всех существенных отношениях финансовое положение ОАО «Стройтрест № 35» на 1 января 2011 года и результаты финансовой деятельности за 2010 год.

УНП 100289278


# Каб любіць Беларусь нашу мілую...



**ГЭТАЕ пачуццё ў мяне прыроднае. Мне ніхто яго не прывіваў. Пачуццё гонару за радзіму да мяне прыйшло разам з каханнем, разам з родным паветрам. Мне хацелася, каб гэтае пачуццё не пакідала беларусаў, дзе б яны ні жылі. Таму нічога не было ў тым дзіўнага, калі я пачуў, што ў космас паляцеў спачатку наш Пётра Клімук, а пасля яго — Уладзімір Кавалёнак. Я быў надзвычай усцешаны. Мне хацелася нешта такое зрабіць, каб нашы касманаўты адчувалі і ў космасе подых роднай зямлі, кроўную повязь з ёю, не забыліся пра сваю прыналежнасць да свайго народу...**

Якраз гэтым часам выйшла першая мая кніжачка «Людзьмі звацца» ў бібліятэчцы «Голас Радзімы», у якой я распавядаў пра розныя старонкі нашага нацыянальнага жыцця. Прынамсі, пра гісторыю беларускага гімна «Мы — беларусы», пра Купалаў верш «А хто там ідзе?». Ды і шмат пра што іншае. Мне здавалася, што гэтая мая кніжачка паспрыяла нашым касманаўтам яшчэ мацней адчуць іхнюю повязь з Беларуссю, са сваім народам, з яе гісторыяй. З гэтай місіяй і даслаў свае кніжачкі нашым першым касманаўтам. Неўзабаве я атрымаў ад іх падзячныя паштоўкі. Пётра Клімук, напрыклад, пісаў:

*«Уважаемый Владимир Содаль!*

*Искренне благодарен за внимание, которое Вы оказали мне, подарив книжечку «Людзьмі звацца». Желаю Вам больших творческих успехов, счастья и здоровья.*

*Примите поздравления с праздником 1 Мая.*

**П. Климук. 24.04.79 г.».**

З тае пары я ўважліва сачыў і сачу за прафесійнай і грамадскай дзейнасцю нашых касмічных землякоў. Радаваўся іхнім узлётам.

...Маё юнацтва прыпала на эру касманаўтыкі. Прыгадаю... Я заканчваў трэці курс філфака. Якраз 12 красавіка 1961 г. у нас былі заняткі па выразным чытанні, ці мо інакш, па тэхніцы выразнага чытання. Праводзіў іх незабыўны майстар мастацкага слова Ілля Курган. Раптам яго хтосьці пагукаў. Неўзабаве ён вярнуўся ў аўдыторыю і сказаў: «Чакаецца важнае ўрадавае паведамленне, і я мушу перапыніць заняткі і ісці на радыё... Здаецца, чалавека ў космас паслалі!» — удакладніў ён. А неўзабаве мы пачулі пра першы палёт у космас Юрыя Гагарына. Гэтак мы праз Іллю Кургана, нашага выкладчыка, на некалькі гадзін раней, чым іншыя, пачулі пра палёт у космас першага чалавека. Здаецца, нядаўна ўсё гэта было, але і вельмі ж даўно. Я і надалей працягваю сачыць за жыццём нашых касманаўтаў. Яны ў нас самыя ганаровыя грамадзяне краіны. Праз іх і наша Беларусь далучана да касмічных таямніц Сусвету.

**Уладзімір СОДАЛЬ.**


КІРМАШ — штотыднёвы рэкламны выпуск № 15 (677). Аддзел рэкламы ☎ 287 17 79

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

**ПРАДАЕЦЦА**

❒ Дача ў в. Чарняты Мядзельскага р-на, возера 100 м.
Тэл. 8 0215551233, 8 029 777 23 09.

❒ Камп'ютар у добрым стане, стол камп'ютарны, танна, поўны камплект.
Тэл. 8 029 872 48 10.

❒ 2-пакаёвая кватэра ў Станькава Дзяржынскага р-на 3/5, 47 х 27 х 9, усе выгоды. 30 км ад МКАД.
Тэл. 8 029 854 00 99.

❒ Станок па дрэве, 380 Вт, 3 кВт. Опель-кадэт, балка задняя б/к, стартар новы.
Тэл. 8 033 601 87 81.

❒ Карова, 4-ты ацёл у красавіку (высокапрадукцыйная), пасля 16.00.
Тэл. МТС 667 43 69, 8 02153 26018.

❒ 3-пакаёвая кватэра ў вёсцы, 20 км ад Браслава, 2000 у.е., пліты ж/б (4,8х2) 2 шт.
Тэл. 8 033 667 43 69, 8 02153 26018.

❒ Драўляны дом 42 м² пад знос. Бярэзінскі р-н.
Тэл. МТС 768 21 65.

❒ Трактар Т-40АМ у добрым стане, 1989 г.в., 2000 у.е.
Тэл. 8 029 391 23 56, 8 01718 42458.

❒ Дом пад дачу ў Капыльскім р-не, прыгожае месца, побач лес, рака, возера і інш. Танна. 85 км ад МКАД.
Тэл. 8 029 3912356.

❒ Нівелір Н-3, дыстылятар, кабіна Т-40.
Тэл. 8 029 391 23 56, 8 01718 42458.

❒ Каляска інвалідная.
Тэл. 8 044 754 06 65.

❒ Сажалка 4-радковая навясная. Слуцк.
Тэл. 8 029 321 09 06, 8 01795 91491.

❒ Колы заднія да трактара Т-25 новыя.
Тэл. 8 0159623000, Вэл. 7597071.

❒ Касілка конная, блок рухавіка Т-25.
Тэл. 8 029 699 80 87.

❒ Двухкорпусныя вуллі з пчоламі. Цана дагаварная.
Тэл. 8 01772 53083.

❒ Бульба насенная.
Тэл. 8 01771 44356.

❒ Дом у в. Сталяры, 35 км ад Бабруйска, лазня, рака, лес.
Тэл. 8 033 255 49 21.

**КУПЛЮ**

❒ Мотаблок МТЗ-05 б/к з плугам, танна, станок дрэваапрацоўчы 220 V, б/у у добрым стане.
Тэл. 8 029 391 23 56, 8 01718 42458, раніцай, увечары.

❒ А/м «Аўдзі» А4, пасля 2000 г.в., у добрым стане, дызель. Тэрмінова. Разгледжу ўсе варыянты.
Тэл. 8 029 872 48 10.

ЗВЯЗДА — КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ

ЗАПОЎНІЦЕ РАЗБОРЛІВА, ВЫРАЖЦЕ І ВЫШЛІЦЕ НА АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А. Тэлефон для даведак 287 17 79.

АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ВАША ПРОЗВІШЧА, АДРАС, ХАТНІ ТЭЛЕФОН.

Пашпарт, серыя_______ №____________ Выдадзены ____________

Подпіс ______________ Дата _________



# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**Многоквартирные жилые дома на месте сносимого гаража по ул. Сурганова в составе: жилой дом №1 (по генплану), жилой дом № 2 (по генплану), подземный гараж-стоянка № 3 (по генплану) и реконструкция жилого дома № 5 по ул. Сурганова.**

**Застройщик –** Совместное общество с ограниченной ответственностью «Арэса-Сервис ТС» зарегистрировано решением Минского горисполкома от 23 июня 2003 года № 968 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 800007976. Юридический (почтовый адрес): **220113, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Логойский тракт, д. 15, к. 4, каб. 514.**

Режим работы по вопросам долевого строительства: пн. - пт. – 8.00 – 20.00.

**Ранее реализованные проекты (в течение трех предшествующих лет)** – «Многоуровневый гараж-стоянка с пристроенным административно-бытовым корпусом и модернизация существующего здания гаража в части замены технологического оборудования по ул. Богдановича – Некрасова».

**Информация о проекте строительства.**

**Цель строительства объекта** – осуществление инвестиционного проекта согласно договору от 19 января 2009 года с Минским горисполкомом на реализацию права проектирования и строительства многоквартирных жилых домов на месте сносимого гаража по ул. Сурганова в составе: жилой дом №1 (по генплану), жилой дом №2 (по генплану), подземный гараж-стоянка №3 (по генплану) и реконструкция жилого дома №5 по ул. Сурганова.

**Объект долевого строительства – многоквартирные жилые дома на месте сносимого гаража по ул. Сурганова в составе:** жилой дом №1 (по генплану), жилой дом №2 (по генплану), подземный гараж-стоянка №3 (по генплану) и реконструкция жилого дома №5 по ул. Сурганова. Строительство объекта предусматривается поэтапно:

- 1-я очередь – жилой дом №2 (по генплану);
- 2-я очередь – жилой дом №1 (по генплану);
- 3-я очередь – подземный гараж-стоянка №3 (по генплану).

Нормативная продолжительность строительства жилого дома №1 (по генплану) – 26,5 мес., ввод в эксплуатацию – II квартал 2012 года.

Нормативная продолжительность строительства жилого дома №2 (по генплану) – 18 мес., ввод в эксплуатацию – IV квартал 2011 года.

Нормативная продолжительность строительства подземного гаража – стоянки № 3 (по генплану) – 10,5 мес., ввод в эксплуатацию - II квартал 2012 года.

**Застройщиком получены:**

- акт от 3 августа 2004 года о выборе земельного участка, утвержденный решением Мингорисполкома от 30 марта 2006 года № 524; акт от 27 ноября 2007 года выбора места размещения дополнительного земельного участка, утвержденный решением Мингорисполкома от 7 февраля 2008 года № 207;
- решение Мингорисполкома от 25 июня 2009 года № 1488 об изъятии, предоставлении земельных участков, разрешении строительства и внесении изменения в решения горисполкома;
- свидетельство (удостоверение) № 500/726-4751 от 15 сентября 2009 года о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права временного пользования на него площадью 1,3841 га;
- разрешение инспекции Департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску № 2-207Ж-037/09 от 31.08.2009;
- заключение ДРУП «ГОССТРОЙ-ЭКСПЕРТИЗА по г. Минску» № 0995-8-2009 от 14 июля 2009 года;
- договор генерального подряда с СМ ЗАО «Ареса-Сервис-СТРОЙ» № 92/09 от 3 августа 2009 года.

**Жилые дома** неповышенной комфортности с подземным гаражом-стоянкой и встроенными помещениями расположены в Первомайском районе в квартале сложившейся застройки между улицами Сурганова и Академической, напротив Ботанического сада.

Конструктивная схема зданий – рамно-связевый монолитный железобетонный каркас с переменной сеткой колонн. Наружная и внутренняя отделка решена на основе применения современных отделочных материалов и конструкций.

Жилой дом № 1 (по генплану) – 19-этажный односекционный с техподпольем, теплым чердаком и незадымляемой лестничной клеткой, лифтами грузоподъемностью 630 кг и 1000 кг. В квартирах предусмотрена возможность установки электрических плит, остекление лоджий. Предусмотрено устройство эркеров и французских балконов.

На первом этаже предусмотрены административные помещения.

Площадь жилого дома – 11610 м², общая площадь квартир – 9255,2 м², общая площадь встроенных помещений – 459,2 м². Всего квартир – 108, в том числе однокомнатных – 31, двухкомнатных – 67, трехкомнатных – 18, четырехкомнатных – 4.

Жилой дом №2 (по генплану) – 19-этажный односекционный с подвалом, теплым чердаком и незадымляемой лестничной клеткой, лифтами грузоподъемностью 630 кг и 1000 кг. В квартирах предусмотрена возможность установки электрических плит, остекление лоджий.

Предусмотрено устройство эркеров и французских балконов.

Площадь жилого дома – 11714,3 м², общая площадь квартир – 9514,9 м². Всего квартир – 120, в том числе однокомнатных – 41, двухкомнатных – 69, трехкомнатных – 15, четырехкомнатных – 4.

Подземный гараж-стоянка №3 (по генплану) – одноуровневый, размещается под дворовым пространством жилых домов. Общая площадь – 4835,3 м². Количество машино-мест – 108.

**Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагаются** *1, 2, 3, 4-комнатные квартиры общей площадью 1000 м² в жилых домах №№ 1 и 2 (по генплану).*

*Цена 1 м² жилых помещений (стоимость строительства плюс рентабельность 5-30 %) составляет от 4 880 000 до 5 337 500 белорусских рублей (что эквивалентно от 1600 до 1750 долларов США на момент опубликования проектной декларации ) в зависимости от условий оплаты. Цена неизменная.*

**Сведения о благоустройстве:** устройство проездов, тротуаров, детских площадок и площадок отдыха, озеленение, установка малых архитектурных форм, устройство газонов и парковок.

**Общее имущество, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков:** межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию зданий.

**Ознакомление дольщиков** с объектами долевого строительства, предлагаемыми для заключения договоров создания объектов долевого строительства, осуществляется в офисе СООО «Арэса-Сервис ТС» по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Логойский тракт, д. 15, к. 4; тел. : 8 (017) 288 34 06; 8 (017) 269 31 00, +375 29 648 34 06. Режим работы по вопросам долевого строительства: пн. - пт. – 8.00 – 20.00, суб. 9.00-17.00. С ходом строительства объекта долевого строительства можно ознакомиться по согласованию с застройщиком.

Краіна здароўя
Выпуск № 19 (255)

Жаночыя сакрэты

# сОнечныя плямы

**Калі вы думаеце, што пігментныя плямы (выклікаюцца павелічэннем узроўню пігменту меланіну ў арганізме) могуць з'яўляцца толькі ад сонечных прамянёў, то памыляецеся. Ёсць і іншыя прычыны. Іх таксама трэба ведаць і рабіць высновы.**

**Прычына № 1.** Існуе гіпотэза, што пігментныя плямы — гэта рэакцыя арганізма, якая заклікана засцерагчы нас ад ультрафіялетавых прамянёў. Таму пігментных плям больш утвараецца на скуры людзей, адчувальных да святла. Самыя адчувальныя — гэта светласкурыя і светлавалосыя, рудавалосыя людзі з блакітнымі і шэрымі вачамі. Жанчыны загараюць хутчэй, чым мужчыны, і больш схільныя да сонечных апёкаў. Чаму так адбываецца, навукоўцы дагэтуль не ведаюць. Але, тым не менш, менавіта павышаная адчувальнасць жанчын да ўльтрафіялету тлумачыць большую колькасць пігментных плям на іх скуры. Таму, мілыя дамы, перш за ўсё вам неабходна абараняць адкрытыя часткі цела ад прамых сонечных прамянёў. Самы просты спосаб — насіць сонцаахоўныя акуляры, капелюшы з шырокімі палямі, адзенне з доўгімі рукавамі. Самы надзейны — выкарыстоўваць сонцаахоўныя крэмы (SPF не менш за 15). Рабіць гэта трэба ўжо ў сакавіку—красавіку: вясновае сонца багатае на ўльтрафіялетавыя прамяні.

**Прычына № 2.** Правакаваць няправільную пігментацыю скуры могуць некаторыя лекі — антыбіётыкі, сульфаніламіды, антыгістамінныя, мачагонныя сродкі, гарманальныя кантрацэптывы, прэпараты з утрыманнем серабра. Таму падчас іх ужывання лепш на сонцы не знаходзіцца.

**Прычына № 3.** Часам пігментныя плямы могуць утварацца пры пашкоджаннях скуры, запаленчых скурных захворваннях (вуграх, экзэме). Таму сачыце за станам сваёй скуры. Калі вы схільныя да ўтварэння вугроў, карыстайцеся спецыяльнымі касметычнымі сродкамі.

**Прычына № 4.** Частая прычына павышанай пігментацыі скуры — цяжарнасць. Пігментныя плямы цяжарных медыкі называюць хлаазмамі. Яны звязаны з гарманальнай перабудовай арганізма, з'яўляюцца на лбе, шчоках і знікаюць з першымі пасляродавымі менструацыямі.

**Прычына № 5.** Нярэдка пігментныя плямы — сігнал арганізма аб недахопе вітамінаў. А вясной, як вядома, гэта праблема асабліва актуальная. Самыя важныя для скуры — вітаміны С і РР. Таму, калі няма магчымасці атрымліваць іх у дастатковай колькасці з прадуктамі харчавання, можна прымаць у таблетках. Гэтыя вітаміны паніжаюць адчувальнасць скуры да ўльтрафіялетавых прамянёў.

**Прычына № 6.** Прычынай узмацнення выпрацоўкі меланіну можа стаць парфума, напрыклад, алей бергамоту, які ў вялікіх колькасцях змяшчаецца ў некаторых відах духоў. Таму, выбіраючы духі або туалетную ваду, звярніце ўвагу на наяўнасць у іх эфірных алеяў.

**Прычына № 7.** Самая распаўсюджаная прычына пігментных плямаў — узрост. Так званыя сенільныя пігментныя плямы з'яўляюцца звычайна пасля 40—50 гадоў — гэта своеасаблівая рэакцыя на сонечнае абпраменьванне, якому скура падвяргалася на працягу чалавечага жыцця. Могуць з'явіцца і раней, як адзін з першых сімптомаў старэння.

**Прычына № 8.** Пігментныя плямы — гэта не хвароба, а ўсяго толькі касметычны дэфект. Тым не менш яны часам могуць быць прадвеснікамі захворванняў страўнікава-кішачнага тракту, нервовай сістэмы. Але часцей за ўсё печані. Справа ў тым, што пігмент меланін выпрацоўваецца менавіта ў гэтым органе, і непарадак у яго рабоце немінуча адбіваецца на стане скуры. Таму, калі ў вас ёсць пігментныя плямы, якія доўга не праходзяць і вы не можаце зразумець іх паходжанне, лепш звярнуцца да спецыяліста, які выявіць сапраўдную прычыну іх з'яўлення.



**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

## ДАПАМОЖА ПРЫРОДА

Многія расліны валодаюць адбельвальнымі ўласцівасцямі. Яны крыху слабейшыя, чым уздзеянне хімічнага рэчыва, што выкарыстоўваецца пры пілінгу ў касметычных салонах, затое іх можна лёгка выкарыстоўваць у хатніх умовах.

**Маска з пятрушкі.** Яна асабліва карысная жанчынам пасля 40 гадоў, у якіх акрамя з'яўлення пігментных плямаў пачынае страчвацца эластычнасць скуры. Вясной і летам маску робяць са свежага лісця і сцёблаў пятрушкі, а восенню — з кораня. Здрабніце пятрушку (каля 2 ст. лыжак) і нанясіце на 20—30 хвілін на ачышчаную скуру твару, акрамя ніжніх павек. Змыйце халоднай вадой і нанясіце на вільготную скуру пажыўны крэм.

**Лімон**. Пры тлустай скуры з пігментнымі плямамі карысна штодзень праціраць твар сокам лімона: 2 ч. лыжкі соку лімона развесці паловай шклянкі вады. Альбо: змазаць твар пажыўным крэмам, нарэзаць лімон тонкімі скрылікамі і накласці іх на твар. Маска павінна знаходзіцца на твары не больш як 10 хвілін, паколькі ад больш працяглай працэдуры скура пачырванее. Пасля зняцця лімона твар абмыць халоднай вадой.

**Сыракваша**. Пры сухой скуры з пігментнымі плямамі карысныя прымочкі з сыраквашы. Пры тлустай і нармальнай — чаргуюць прымочкі з сыраквашы і віннага воцату.

**Сок ягад чырвоных парэчак** — выпрабаваны касметычны сродак для адбельвання скуры пры рабацінні і пігментных плямах. Твар трэба праціраць 1—2 разы на дзень ватным тампонам, намочаным у соку. Альбо: 1 ст. лыжку кашкі з чырвоных парэчак змяшаць з кефірам, сыроваткай, смятанай, нанесці на твар на 15—20 хвілін — затым змыць цёплай вадой.

**Агурок**. Свежы агурок надзерці на дробнай тарцы і змяшаць з 1 ст. лыжкай любога пажыўнага крэму. Альбо: пры тлустай скуры адціснуты свежы сок агурка змяшаць з роўнай колькасцю гарэлкі і настойваць 24 гадзіны. Прыгатаваным растворам змочваць марлевыя сурвэткі і накладваць іх на твар (пакідаць адкрытымі вочы, нос і рот) 3 разы на тыдзень на працягу 15—20 хвілін.

Рабацінне і пігментныя плямы добра праціраць разрэзаным агурком. Калі сок падсохне, змыйце яго цёплай вадой.

Дзіцячы прыём

# НЕЙРАІНФЕКЦЫІ: рэабілітацыя абавязковая

**Аднымі з самых цяжкіх і грозных інфекцыйных захворванняў у дзяцей з'яўляюцца нейраінфекцыі. Што гэта за хваробы і ў чым іх асаблівая небяспека? Пра гэта нам расказаў асістэнт кафедры дзіцячых хвароб БДМУ, урач-педыятр вышэйшай катэгорыі Вадзім Лагоцька.**

— Да нейраінфекцый адносяцца такія захворванні, як герпетычны энцэфаліт, менінгіты рознага паходжання: гнойныя, пнеўмакокавыя, менінгакокавыя, энтэравірусныя і інш. Каварства і небяспека іх у тым, што яны вельмі цяжка дыягнастуюцца, даюць высокую лятальнасць — у 5—6% выпадкаў — і маюць вельмі сур'ёзныя наступствы.

Напрыклад, пачатковыя праявы гэтых інфекцый могуць нагадваць прастуду ці грып. І неспецыяліст не можа паставіць адразу дакладны дыягназ. А фактар часу тут мае вырашальную ролю. Калі хутка не пачаць адпаведнае лячэнне, дзіця можа загінуць на працягу адных сутак.

Таму бацькоў павінны сур'ёзна насцярожыць такія сімптомы, як высокая тэмпература, моцны галаўны боль, які дрэнна здымаецца звычайнымі прэпаратамі, паўторныя, часам неаднаразовыя ваніты, якія не прыносяць палёгкі, і асабліва з'яўленне гемарагічных высыпак на скуры. У гэтым выпадку ні ў якім разе нельга займацца самалячэннем, трэба неадкладна выклікаць урача.

Лячэнне захворвання ў вострым перыядзе заўсёды патрабуе шпіталізацыі ў стацыянар, дзе пацыентам будуць займацца спецыялісты. Пры максімальна ранняй дыягностыцы і своечасова пачатым лячэнні з хваробай можна ўдала справіцца.

Напрыклад, у нашай Мінскай дзіцячай інфекцыйнай бальніцы лятальнасць ад менінгітаў і энцэфалітаў мінімальная. А пры своечасовым паступленні ў стацыянар увогуле нулявая. Мы нядаўна прагледзелі гісторыі хваробы нашых пацыентаў і высветлілася, што апошняе дзіця з герпетычным энцэфалітам загінула ў 1994 годзе. Фактычна больш як 15 гадоў у бальніцы няма лятальнасці ад гэтай хваробы. Але, паўтаруся, гэта пры ўмове своечасовага паступлення ў бальніцу.

**— Ці можа перанесеная нейраінфекцыя ў далейшым паўплываць на здароўе дзіцяці, праявіцца ў нейкіх негатыўных змяненнях?**

— Так. Найбольш небяспечны сімптом, які сустракаецца, гэта сутаргавы, эпілептычны сіндром, можа з'явіцца гідрацэфалія, нярэдка ўзнікае тугавухасць. Акрамя гэтага, ёсць і іншыя змяненні, якія пагрозы жыццю не нясуць, але рэзка зніжаюць яго якасць. Я маю на ўвазе хранічныя галаўныя болі, дрэннае запамінанне і паспяховасць у школе.

**— Улічваючы такія цяжкія наступствы, верагодна, пытанні рэабілітацыі дзіцяці пасля хваробы з'яўляюцца актуальнымі?**

— Безумоўна. Перад намі стаіць задача не толькі звесці да мінімуму лятальнасць, але і зрабіць так, каб перанесеная нейраінфекцыя ніяк не ўплывала на далейшую якасць жыцця дзіцяці.

Усе дзеці, якія перанеслі вострую нейраінфекцыю, знаходзяцца на дыспансэрным уліку ў нашай бальніцы. Яго задача — своечасова выяўляць пачатковыя праявы гэтых наступстваў нейраінфекцыі і адпаведна іх карэгіраваць. Дзеці праходзяць курсы рэабілітацыйнай тэрапіі. Калі гэта патрабуецца, то ў стацыянары. Калі ж такой патрэбы няма, то пацыентам даюцца рэкамендацыі па прыёме пэўных медыкаментаў дома. Некаторыя ўвогуле не маюць неабходнасці ў лячэнні. Але часам бывае, што наступствы хваробы праяўляюцца не адразу пасля перанесенай нейраінфекцыі, а праз некаторы час. Таму дзеці знаходзяцца ў нас на дыспансэрным уліку на працягу 2—3 гадоў. Яны праходзяць электраэнцэфалаграфічнае даследаванне, інструментальнае даследаванне функцый слыху, агляд вочнага дна. Пры неабходнасці ім робіцца камп'ютарная тамаграфія галаўнога мозга і інш. Для кожнага дзіцяці, у залежнасці ад тых ці іншых змяненняў, складаецца індывідуальны план рэабілітацыі з наступным кантролем.

Пасля выпіскі са стацыянара дзеці праходзяць дыспансэрызацыю праз месяц. Потым на першым годзе мы іх аглядаем адзін раз у тры месяцы, на другім годзе — раз у паўгоддзе. Але калі ёсць неабходнасць, то і часцей. Абсалютная большасць дзяцей, якія знаходзяцца ў нас на дыспансэрным уліку, па заканчэнні тэрміну назірання зусім здаровыя і практычна не адрозніваюцца ад сваіх равеснікаў.

Але, на жаль, бываюць такія сітуацыі, калі бацькі лічаць, што іх дзіця не мае патрэбы ў дыспансэрным уліку, і не знаходзяць часу прыехаць да нас. Каля 30—40% дзяцей пасля перанесенай нейраінфекцыі не прыходзяць на дыспансэрызацыю і адпаведна не праходзяць гэтыя рэабілітацыйныя курсы. А, між іншым, у далейшым тыя або іншыя непрыемнасці, звязаныя і з нервовай сістэмай, і з паводзінамі, паспяховасцю ў школе, могуць праявіцца. Я б не раіў бацькам так рызыкаваць здароўем сваіх дзяцей.

**Вольга ШАЎКО.**

# ПА ВЕСНАВОЙ ВАДЗЕ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Информация о проведении аукциона с условием по продаже в частную собственность объекта недвижимости**

| | |
|---|---|
| **Адрес объекта и его наименование** | - танцевальная площадка с эстрадой (инв. № 205) и контейнером металлическим, расположенная по адресу: Минская область, Молодечненский р-н, д. Удранка. Общая площадь здания – 398,8 м². Объект находится в водоохраной зоне водных объектов вне прибрежной полосы.<br>Назначение земельного участка: для обслуживания танцплощадки с эстрадой. Год постройки – 1990. Начальная цена – 80 000 000 белорусских рублей.<br>Аукцион проводится путем пошагового увеличения цены лота. Первый шаг аукциона 10% от предыдущей цены. Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену лота. |
| **Сумма задатка** | 10% от начальной цены на р/с 3012190930030 в отделении 932 ОАО «Белинвестбанк», г. Молодечно, код 739, УНН 600182305, ОКПО 04064333, получатель: СИКУП «УКС-СЕРВИС». |
| **Порядок оплаты** | Победитель аукциона возмещает расходы, связанные с организацией и проведением аукциона и объявления в средствах массовой информации. Оплата в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) в течение 30-ти банковских дней со дня проведения аукциона. |
| **Продавец** | Открытое акционерное общество «Белагроздравница» филиал «Санаторий «Сосновый бор» |
| **Организатор аукциона** | СИКУП «УКС-Сервис» |
| **Документы, представляемые для участия в аукционе** | Заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение 10% задатка. Заверенные копии: учредительных документов со всеми изменениями и дополнениями, свидетельства о государственной регистрации (для юридических лиц), свидетельства о государственной регистрации (для индивидуальных предпринимателей); паспорт или иной документ, удостоверяющий личность (для физических лиц). |
| **Конечный срок и адрес приема заявок** | 05.05.2011 до 16.00, г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1, СИКУП «УКС-Сервис», тел. (8 0176) 73 00 13, (факс) 75 19 20, 8 044 710 74 60 |
| **Дата, время и место аукциона** | 12.05.2011 в 15.00, г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1. СИКУП «УКС-Сервис» |
| **Условия продажи:** | Продавец имеет право отказаться от аукциона в день проведения аукциона.<br>Обязательное условие аукциона: последующее использование реализуемого объекта как «Торгово-развлекательный центр с размещением ресторана (бара, кафе), боулинга». |

Пра дыеты і не толькі

# ПАХУДЗЕЛІ І... СУР'ЁЗНА ЗАХВАРЭЛІ

**Урачы сцвярджаюць: няправільнае пахудзенне ў 90% выпадкаў заканчваецца праблемамі са здароўем.**

## ПАДАЕ ЦІСК, ПАГАРШАЕЦЦА ПАМЯЦЬ

Такі стан — часты спадарожнік доўгага (больш як 3 тыдні) сядзення на цалкам безвугляводных дыетах.

Так, хуткія «простыя» вугляводы, якія ўтрымліваюцца ў белым хлебе, булачках, піражных, цукерках, вядуць да набору вагі, перапрацоўваючыся ў тлушч. Затое марудныя «складаныя» вугляводы, што прысутнічаюць у зерневым хлебе, пасце (макароне) з цвёрдых гатункаў пшаніцы, карычневым цукры, крупах, караняплодах, з'яўляюцца энергетычным палівам для нашага мозга. Жорсткая адмова ад іх выклікае галаданне тканак мозга і аслабленне сасудзістага тонусу.

## ПСУЮЦЦА ЗУБЫ

Да разбурэння зубной эмалі і запаленчых захворванняў дзяснаў вядуць адмова ад тлушчаў у ежы або бескантрольнае ўжыванне прэпаратаў, што выводзяць тлушчы з арганізма, або «спальвальнікаў тлушчу», монадыеты. Справа ў тым, што вітамін D (неабходны для сінтэзу кальцыю і крэпасці касцей) — тлушчараставральны, г.зн. засвойваецца арганізмам толькі пры наяўнасці тлушчаў.

Недахоп кальцыю ўзнікае пры адмове ад малочных прадуктаў (малака, тварагу, сыроў). У сур'ёзных клініках разам з лекамі, што расшчапляюць тлушчы, абавязкова прызначаюць і прэпараты кальцыю.

## УЗНІКАЮЦЬ ПРАБЛЕМЫ СА СТРАВАВАННЕМ

Гастрыт і нават панкрэатыт — нярэдкія наступствы жорсткага галадання. Выпрацоўка страўнікавага соку ідзе, а дастатковай колькасці ежы не паступае. У выніку страўнік пачынае... ператраўліваць сваю ж слізістую абалонку.

Таму, калі вы наладжваеце разгрузачныя дні, трэба ўжываць больш вадкасці нейтральнай кіслотнасці (мінералкі — лепш без газу, нятлустага малака, адвары мяты, рамонку, змяшаных садавіна-агароднінных сокаў, напрыклад, яблык — морква). Пазбягайце моцнай гарбаты і кавы, кіслых напояў.

## ЗДАЮЦЬ НЫРКІ

На жаль, бывае і такое. Асноўныя віноўнікі гэтага — «сухое» галаданне, а таксама бескантрольны прыём прэпаратаў, якія зніжаюць апетыт (у іх змяшчаюцца рэчывы, якія могуць прывесці да парушэння водна-салявога балансу ў арганізме, а гэта шкодна для нырак).

## З'ЯЎЛЯЮЦЦА АЦЁКІ

Прычына — зніжэнне ўтрымання ў крыві бялку і электралітаў, за кошт чаго зніжаецца асматычны ціск і вадкасць перастае ўтрымлівацца ў сасудах. Такі стан можа развівацца пры галаданні, пры жорсткіх абмежаваннях у ежы (напрыклад, «сядзенні» на адной гародніне—садавіне, кефіры, грэчцы).

## НАВАЛЬВАЕЦЦА ДЭПРЭСІЯ

«Дыетычная дэпрэсія» — стрэс, які ўзнікае на фоне залішне абмежавальных, незбалансаваных праграм пахудзення, монадыет. Адбываецца пазбаўленне адзінай радасці, абароны ад перажыванняў. Паколькі амаль для 60% жанчын, якія маюць праблемы з вагой, ежа — галоўны спосаб набыцца душэўнай раўнавагі.

Таксама сур'ёзныя праблемы з псіхікай могуць паўстаць падчас прыёму таблетак «ад апетыту», у якія ўваходзяць амфетаміны — псіхатропныя рэчывы. На іх нярэдка падсаджваюцца фотамадэлі.

## ЛІШНІЯ КІЛО ВЯРТАЮЦЦА ЎТРАЯ

Рыкашэтны набор вагі ўзнікае пры хуткім, стрэсавым для арганізма «скідванні» кілаграмаў. Як рэакцыя на стрэс павышаецца апетыт, і чалавек набірае яшчэ большую вагу.

Таму для эфектыўнага паніжэння і ўтрымання вагі неабходна, па-першае, кансультацыя са спецыялістамі: дыетолагам, эндакрынолагам, фізіёлагам; а па-другое, комплекс мер, які дапамагае наладзіць абмен рэчываў, а не тупа зніжаць апетыт.

**ВАЖНА! ЯКІЯ ДЫЕТЫ САПРАЎДЫ НЕБЯСПЕЧНЫЯ ДЛЯ ЗДАРОЎЯ?**

Вельмі ўшанаванае многімі «лекарамі» галаданне (асабліва «сухое», калі чалавек адмаўляецца не толькі ад ежы, але і ад пітва: на працягу некалькіх сутак адбываецца абязводжванне арганізма, інтаксікацыя і шок).

**Пілюлі, якія прыгнятаюць апетыт.** У іх уваходзяць псіхатропныя рэчывы, якія ўздзейнічаюць на ўчастак мозга, што адказвае за пачуццё голаду.

**Поўная адмова ад солі і цукру.** Парушаецца салявы і вугляводны баланс, што можа прывесці да змен у рабоце сэрца і галаўнога мозга.

**Сыраядзенне**, якое можа выклікаць сур'ёзныя парушэнні страўнікава-кішачнага тракта, дысбактэрыёз.

**Доўгія монадыеты** (напрыклад, калі чалавек харчуецца толькі кефірам або грэчкай). Так можна давесці сябе да авітамінозу і зніжэння імунітэту.

**Каляровыя дыеты** (калі чалавек працяглы час складае меню з прадуктаў аднаго колеру — напрыклад, чырвонага або жоўтага). У арганізме ідзе назапашванне агрэсіўных ферментаў, што можа выклікаць праблемы з печанню і выпрацоўкай жоўці.

**Поўная адмова ад тлушчаў** (бялкоў; вугляводаў). Прыводзіць да парушэнняў абмену рэчываў і гарманальных збояў. У жанчын гэта можа праяўляцца парушэннямі цыкла, у мужчын — праблемамі з эрэкцыяй і пагаршэннем якасці спермы (што зніжае магчымасць стаць бацькам).

**Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.**

Статыстыка

# КОЖНЫ ЧАЦВЁРТЫ РАЗВОД — ПАСЛЯ 5—9 ГАДОЎ СУМЕСНАГА ЖЫЦЦЯ

**У Мінску ў 2010 годзе афіцыйна скасавала шлюб 8230 сем'яў, што на 2,6% менш, чым у 2000-м.**

Няўстойлівыя шлюбы назіраюцца ў сталіцы як на першых гадах сумеснага жыцця, так і сярод працяглых шлюбаў. У структуры разводаў па працягласці шлюбаў адзначаны наступныя тэндэнцыі. Адбываецца рост колькасці скасаваных шлюбаў, чый саюз праіснаваў менш за 5 гадоў. Так, калі ў 2000 годзе ўдзельная вага такіх пар, якія распаліся, склала 28,2%, у 2009-м — 35,8, то ў 2010-м — ужо 37,6%. Адначасова зніжаецца ўдзельная вага сем'яў, якія распаліся, са стажам сямейнага жыцця 10—19 гадоў: з 31,6% у 2000 годзе да 23% у 2010-м. Кожны чацвёрты развод адбыўся пасля 5—9 гадоў сумеснага жыцця. Практычна ранейшым застаўся ўзровень разводаў сямейных пар, якія пражылі разам 20 і больш гадоў (2000 год — 14,3%, 2009-ты — 15,2, 2010-ты — 14,4%).

Разводзяцца людзі розных узростаў, але часцей за ўсё ў 2010 годзе скасоўвалі шлюб мужчыны ва ўзросце 30—34 гадоў (кожны пяты з ліку тых, хто скасаваў шлюб) і жанчыны ва ўзросце 25—29 гадоў (кожная чацвёртая).

Маюць месца разводы і ва ўзросце маладзей за 20 гадоў, а таксама 60 гадоў і старэй. Так, у 2010 годзе ў Мінску развяліся трое мужчын ва ўзросце 19 гадоў, якія пражылі ў шлюбе год і менш, і 19 жанчын ва ўзросце да 20 гадоў, якія мелі стаж сямейнага жыцця ад аднаго да трох гадоў. Ва ўзросце 60 гадоў і старэй скасавалі шлюб 227 мужчын і 168 жанчын, асноўная частка з якіх пражылі ў шлюбе больш за 20 гадоў, а 14 мужчын і 9 жанчын — год і менш.

Нетрывалымі могуць быць як першыя, так і паўторныя шлюбы. З усіх зарэгістраваных разводаў першы шлюб скасоўвалі 86,3% мужчын і 87% жанчын, паўторны — 13,7% і 13% адпаведна.

Больш за ўсё ад разводу церпяць дзеці, якія выхоўваюцца адным з бацькоў. За 2010 год іх было 4816 чалавек, за 2000-ы — 6449.

**БЕЛТА.**

Да ведама

# КАЛІ СТАРАСЦЬ НЕ Ў РАДАСЦЬ...

**ПАМЯЦЬ — унікальная з'ява. Вучоныя запэўніваюць, што магчымасці памяці чалавека бязмежныя і пераўзыходзяць магчымасці самага магутнага камп'ютара. Але, на жаль, пагаршэнне памяці (самая частая першая прыкмета дэменцыі) нярэдка становіцца крыніцай цяжкасцяў для пажылых людзей. Ранняе выяўленне захворвання — важная ўмова эфектыўнасці лячэння.**

Паводле статыстыкі, дэменцыя часцей узнікае ў пажылым і старэчым узросце. Яна развіваецца прыкладна ў кожнага дзясятага пажылога чалавека. І па меры павелічэння працягласці жыцця на планеце распаўсюджанасць дэменцыі будзе няўхільна расці.

Старэчы маразм, старэчае бяспамяцтва, дэменцыя — назвы аднаго стану, які характарызуецца набытым зніжэннем інтэлекту, што ўзнікае ў выніку арганічных пашкоджанняў галаўнога мозга і парушае сацыяльную адаптацыю чалавека, г.зн. робіць яго нявздольным да прафесійнай дзейнасці, абмяжоўвае магчымасці самаабслугоўвання і парушае яго бытавую незалежнасць.

На позніх стадыях захворвання парушэнні становяцца такімі выражанымі, што чалавек ужо не можа абыходзіцца без дапамогі навакольных, у яго развіваюцца псіхічныя расстройствы, назіраюцца неадэкватныя паводзіны. *Чалавек перастае пазнаваць сваіх родных, не можа самастойна даглядаць сябе (выконваць гігіенічныя працэдуры, гатаваць ежу, правільна апранацца), патрабуе пастаяннага кантролю за сваімі дзеяннямі.*

Прычынамі дэменцыі з'яўляюцца дэгенератыўныя і сасудзістыя захворванні, а таксама ўзроставыя атрафічныя змяненні галаўнога мозга, якія абядняюць яго рэзервовыя магчымасці.

Развіццё дэменцыі не аднамомантны працэс, ён займае доўгі час.

Звярніце ўвагу: магчыма, у вашага блізкага чалавека з'яўляецца санлівасць у дзённы час; падчас размовы зніжаецца інтарэс, увага, ніць размовы выпадае; узнікае трывожнасць, прыгнечаны настрой; рэзка абмежавалася кола зносін.

Пры прагрэсаванні хваробы чалавек можа страчваць арыентацыю ў часе (не ведае, які сёння дзень, месяц ці год), месцы (не ведае, дзе ён знаходзіцца) і ўласнай асобе (не ведае, хто ён такі).

Аднак не ўсе хворыя няўхільна прыходзяць да цяжкай формы захворвання. І далёка не кожны з іх мае патрэбу ў пастаянным доглядзе. Драматычнае развіццё хваробы можна запаволіць, стабілізаваць, звярнуўшыся па дапамогу як мага раней. Чым раней вы пачняце выконваць прызначанае ўрачом лячэнне, тым больш шанцаў атрымае хворы для таго, каб адсунуць час надыходу інвалідызацыі.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

**У сувязі з гэтым вы можаце паспрабаваць самастойна ацаніць памяць сваю або вашых пажылых родных з дапамогай наступных нескладаных тэстаў.**

** Адказвайце на пытанні і падсумоўвайце атрыманыя балы:*

**0** — ніколі, **1** — рэдка, **2** — часам, **3** — часта, **4** — вельмі часта.

**1.** Я забываю нумары тэлефонаў.
**2.** Я не памятаю, што куды паклаў.
**3.** Адарваўшыся ад кнігі, не магу знайсці месца, якое чытаў.
**4.** Я забываю аб прызначаных сустрэчах.
**5.** Мне трэба складаць спіс спраў, каб нічога не забыць.
**6.** Я забываю, што планаваў зрабіць па дарозе дадому.
**7.** Я забываю імёны старых знаёмых.
**8.** Мне цяжка сканцэнтравацца.
**9.** Мне цяжка пераказаць змест толькі што прагледжанай тэлеперадачы.
**10.** Я не пазнаю знаёмых людзей.
**11.** Мне цяжка ўнікнуць у сэнс таго, што гавораць навакольныя.
**12.** Я хутка забываю імёны людзей, з якімі знаёмлюся.
**13.** Я забываю, які сёння дзень тыдня.
**14.** Калі хто-небудзь гаворыць, я не магу сканцэнтравацца.
**15.** Мне даводзіцца правяраць і пераправяраць, ці зачыніў я дзверы і да т.п.
**16.** Я пішу з памылкамі.
**17.** Маю ўвагу лёгка адцягнуць.
**18.** Мне неабходна некалькі разоў выслухаць інструкцыі, каб іх запомніць.
**19.** Мне цяжка засяродзіцца на тым, што я чытаю.
**20.** Я адразу ж забываю, што мне сказалі.
**21.** Мне цяжка падлічыць рэшту ў краме.
**22.** Я раблю ўсё вельмі марудна.
**23.** Я адчуваю пустату ў галаве.
**24.** Я забываю, якое сёння чысло.

Агульная колькасць балаў больш за 42 сведчыць пра наяўнасць парушэнняў памяці, уважлівасці. Вам абавязкова неабходна звярнуцца да доктара!

- Тэст малявання гадзінніка. Прапануйце чалавеку намаляваць гадзіннік, стрэлкі якога паказваюць на пэўны час. У норме трэба намаляваць круг, расставіць вакол лічбы ад 1 да 12 у правільным парадку з роўнымі інтэрваламі, паказаць 2 стрэлкі (гадзінная карацейшая, хвілінная даўжэйшая), якія пачынаюцца ў цэнтры круга і паказваюць зададзены час. Любое адхіленне ад правільнасці выканання тэста — прыкмета дастаткова выражаных парушэнняў памяці.
- Тэст на моўную актыўнасць. Чалавеку прапаноўваецца за 1 хвіліну назваць як мага больш назваў раслін; жывёл; імёнаў. У норме за адну хвіліну большасць пажылых людзей з сярэдняй і вышэйшай адукацыяй называе каля 18 слоў. Калі колькасць названых слоў меншая за 12 — гэта сведчыць аб выразных расстройствах.

**УВАГА!** Людзям, якія сутыкнуліся з набытым парушэннем разумовых здольнасцяў у сваіх пажылых сваякоў, спецыялісты раяць:

- ствараце ў сям'і добразычлівую абстаноўку, паколькі станоўчыя эмоцыі садзейнічаюць прыпыненню працэсу хваробы, як і лекавыя прэпараты;
- падчас размовы абмяжуйце ўздзеянне пабочных шумаў, што адцягваюць увагу. Перш чым загаварыць, звярніцеся да чалавека па імені;
- падчас размовы старайцеся выкарыстоўваць простыя словы і сказы. Калі з першага разу вас не зразумелі, паўтарыце спакойным голасам;
- калі ваш блізкі чалавек стаміўся або ў яго дрэнны настрой, пераключыце яго ўвагу, напрыклад, схадзіце з ім на прагулку;
- старайцеся як мага часцей успамінаць даўнія часы, прасіце расказаць пра сваё дзяцінства, маладосць;
- пажылы чалавек шмат што ўжо не можа, але сёетое ён усё ж у стане рабіць. Хваліце яго за зробленае. Усяляк падтрымлівайце імкненне штосьці зрабіць самому. Не аднімайце магчымасць рабіць тое, што ён рабіў яшчэ зусім нядаўна самастойна;
- давайце адпачыць сабе: чалавек не можа несці такі груз у адзіночку. Паклапаціцеся пра сваё фізічнае здароўе, не забывайце сваіх інтарэсаў і своечасова звяртайцеся па пабочную дапамогу.

## Упаў у раку. Выратавалі

З ракі Дзісна ў гарадскім пасёлку Шаркаўшчына раніцай выратавалі мужчыну, які ўпаў у ваду і не мог самастойна выбрацца. Тыя, хто ўбачыў надзвычайнае здарэнне, выклікалі пажарных. Небараку з прымяненнем спецыяльнага «канца Аляксандрава» з адлегласці двух метраў ад берага выцягнулі на бераг. Медыкі паставілі дыягназ «пераахалоджванне». Высветлілася, што 35-гадовы мужчына знаходзіўся ў нецвярозым стане. Дарэчы, тануў ля вуліцы Вадап'янава, дзе і пражывае. У здавальняючым стане выратаванага даставілі ў бальніцу.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

**Управляющий по делу о банкротстве ИП «Данакап Плюс», ООО «Арбитр» – организатор торгов, сообщает о проведении повторных (третьих) торгов по продаже имущества ИП «Данакап Плюс», расположенного по адресу: г. Гродно, ул. Горького, д. 95:**

| Наименование лота | Начальная цена (с НДС), бел. руб. | Шаг торгов (2,5%), бел. руб. | Задаток (1%), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| Здание с котельной, трансформаторной подстанцией, газопроводом (инв. № 400/С-48731) расположено: Гродненская область, г. Гродно, ул. Горького, д. 95, 1-3 этажей, общ. площадь -- 1288,6 м², год постройки -- 1991) | 1 176 000 000 | 29 400 000 | 11 760 000 |

Торги проводятся в форме аукциона, открытого по составу участников и по форме подачи предложений о цене.

**Торги состоятся 28 апреля 2011 года в 15.00 по адресу: г. Гродно, ул. Солнечная, 5.**

До подачи заявки Претенденту необходимо перечислить задаток (платежные реквизиты): ИЧПУП «Данакап Плюс», р/с 3012600391016 в «Приорбанк» ОАО ЦБУ 600, код 749, УНП 590618126.

Заявления на участие в аукционе с придложением платежного поручения, подтверждающего внесение задатка, а также: для юридических лиц – заверенной копии свидетельства о гос. регистрации, устава; для индивидуального предпринимателя – заверенной копии свидетельства о гос. регистрации; для физ. лица – копии паспорта, принимаются с момента выхода настоящего объявления до 15.00 27.04.2011 по адресу: 230001 г. Гродно-1, а/я 27 или по факсу 8(0152) 526859.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену покупки. После окончания торгов с победителем подписывается протокол и в течение 20 дней заключается договор. Победитель торгов обязан оплатить стоимость покупки в течение 30 дней после подписания протокола.

Получить иную информацию о порядке и условиях проведения торгов, ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по адресу: г. Гродно, ул. Солнечная, 5, тел. 8(029)7831160, тел./факс 8(0152)526859.

Надзённае

# Цукру ўдосталь...

## Людзі працягваюць тоўпіцца каля абменных пунктаў валюты, а яшчэ ўвагу насельніцтва прыцягнулі прадукты харчавання

**Каля абменнікаў самыя стойкія чакаюць, што нехта здасць валюту і тады можна будзе яе купіць. Тут ужо ўстаноўлены свой парадак. Калі першаму ў чарзе трэба, напрыклад, 50 долараў, а чалавек здаў 10, то калі ён іх купіць, павінен будзе заняць чаргу занава. Ёсць і другі варыянт — уступіць тыя дзесяць долараў наступнаму з чаргі і застацца першым з надзеяй, што нехта здасць патрэбную суму.**



Валюту не толькі купляюць, але і здаюць. Бяда толькі ў тым, што першых значна больш, чым другіх. Долары і еўра патрэбны індывідуальным прадпрымальнікам, тым, хто едзе за мяжу...

Што датычыцца ўвозу імпартных патрыманых аўтамашын, то купля-продаж ажыццяўляецца тут толькі ў валюце, якая вывозіцца за мяжу, але трэба прызнаць, што ў асноўным тыя долары і еўра пакупнікі трымаюць «пад падушкамі». Але калі аўтамашына ўвозіцца ў Беларусь, то з яе бярэцца на мяжы пошліна, а гэта ўсё ж даход дзяржаве. У такім выпадку для ўсіх будзе лепш, калі чалавек не хавае грошы, а пускае іх у абарачэнне.

Калі пачуў, што ў некаторых райцэнтрах вобласці насельніцтва пачало скупляць проса, цукар, то пайшоў паглядзець, што робіцца ў крамах Баранавіч. У пятніцу яшчэ было спакойна, а вось у суботу цукар пачалі купляць масава. Найперш у некаторых крамах разабралі цукар, які быў расфасаваны ў пакеты па 2-5 кг і меў кошт 3290 руб/кг, а вось цукар у кілаграмовай упакоўцы вытворчасці Жабінкаўскага цукровага завода і ў нядзелю ляжаў на паліцах. Ён быў на некалькі сотняў даражэй і, відавочна, таму яго асабліва не бралі.

Сустрэў знаёмага пчаляра, які нёс два пакеты з цукрам. Хто мае пчол, ведае, колькі патрэбна цукру на зіму, але да зімоўкі яшчэ далекавата.

— Мяжу з Расіяй адкрылі, то цяпер усё туды пойдзе. А цэны ў нас павінны вырасці, каб выраўняцца з расійскімі, — растлумачыў мужчына.

Цэны на імпартную прадукцыю ўжо мяняюцца. Напрыклад, кошт кавы рэзка падскочыў. У крамах Пецярбурга кілаграм цукру каштуе 1,5 долара, а ў нас, пры сённяшнім курсе, крыху больш за долар.

Улічваючы неакрэсленую сітуацыю з рублём насельніцтва хвалюецца, бо людзі ўжо прывыклі да пэўнай стабільнасці. Многія свае накапленні трымаюць у рублях і не могуць абыякава назіраць за падзеямі. І калі чалавек імкнецца перавесці рублі ў тавар, то яго зразумець можна.

Праблему рубля я не буду закранаць — няхай яе вырашаюць нашы фінансісты, і як мага хутчэй. Хачу толькі сказаць, што заклік: «Жыць па сродках», пры ўсёй яго актуальнасці для нашай краіны, ужо не з'яўляецца панацэяй ад усіх праблем. Нам неабходна сказаць «Бывай, сацыялізм», бо да гэтага часу мы не маглі з ім развітацца.

І калі чуецца: «Трэба працаваць, а не гандляваць», то гэта водгук яшчэ не забытага мінулага. Неабходна мяняць свой менталітэт — асобнага шляху ў нашым свеце няма.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ. Фота аўтара.**

# «НЕ ВАЖНА, ЯКІ БУДЗЕ КУРС, ВАЖНА, КАБ БЫЛА ПЭЎНАСЦЬ»

## Апытанне прадстаўнікоў экспертнай і прадпрымальніцкай супольнасці Беларусі: што рабіць з дэфіцытам валюты і настроямі ў грамадстве

**Віктар ХІНЕВІЧ, генеральны дырэктар ЗАТ «Барысаўдзіцспецпрадукт», доктар сельскагаспадарчых навук, член Савета па развіцці прадпрымальніцтва:**

— Наша прадпрыемства мае цяжкасці з тым, што мы ўзялі валютны крэдыт на вялікія сумы. І асобныя банкі не перабудаваліся і не хочуць прымаць пагашэнне працэнтаў па крэдытах у беларускіх рублях. Адны — прымаюць, а іншыя — патрабуюць +25%. І нам прыходзіцца зараз плаціць нават не на 10%, а на 25% больш. Вось такая сітуацыя ў нас, у вытворцаў. Мы ж не можам зараз узняць цэны на прадукцыю, таму гэта кладзецца на нас цяжкім цяжарам. А, па-другое, нават у нашым асноўным прадукце — сырках, марозіве — імпартны складнік 30%. Бо цалкам 100% беларускае зрабіць нельга: мы выкарыстоўваем каву, какаву, закваскі для сыркоў, стабілізатары для марозіва — гэта ўсё імпартнае. Адпаведна, яшчэ тыдзень — і мы будзем вымушаны спыніцца, бо гэта напрамую ўплывае на бізнэс. Мы ж не можам у рэцэптуры перарабіць пад беларускія інгрэдыенты за адзін тыдзень! Вось такая карціна.

**— А што трэба рабіць?**

— Напрыклад, мы зараз тэрмінова праводзім атэстацыю сваёй вытворчасці па расійскім ISO, каб павялічыць экспарт прадукцыі на Маскву, на Санкт-Пецярбург. І ўсім трэба гэтым займацца. Там цвёрды рубель, няхай і расійскі, але цвёрды.

**— Абясцэньванне рубля моцна ўдарыць па вашым прадпрыемстве?**

— Для многіх з тых, хто не займаецца экспартам, гэта можа стаць шыбеніцай. А для тых, хто экспартам займаецца, не так страшна. Мы, вытворчыя прадпрыемствы, зараз перажываем яшчэ адзін крызіс.

**Уладзімір КАРАГІН, старшыня ГА «Мінскі сталічны саюз прадпрымальнікаў і працадаўцаў»:**

— Бізнэс, скажам прама, жыве зараз дрэнна. Усё-такі прадпрымальнікі спадзяваліся, што абстаноўка больш кіруемая. Вядома, панічны ажыятаж вакол прадуктаў (цукру, алею) хутка пройдзе, насельніцтва затарыцца, тут у нас сумневу няма. А што тычыцца зацяжнога вырашэння пытання аб магчымасці набыцця валюты, то гэта вельмі вялікая праблема для прадпрыемстваў, асабліва невялікіх і сярэдніх. Члены нашага саюза, сярэдні бізнэс больш за год вялі перамовы, каб нам пастаўлялі матэрыялы, камплектуючыя, станкі без перадаплаты. Беларускімі прадпрымальнікамі былі ўсталяваны давяральныя стасункі з цэлым шэрагам сусветных кампаній — і ў Германіі, і ў Вялікабрытаніі, і ў Італіі. І вось абсталяванне гэтае прыйшло, а нашы прадпрымальнікі зараз не могуць разлічыцца, бо не могуць купіць валюту. Прычым нельга купіць ні па якім курсе, тым больш па афіцыйным. Таму сёння пайшлі ўжо судовыя працэсы, іскі, канфліктныя сітуацыі з пастаўшчыкамі, што наносіць удар па здзелках, па рэпутацыі кампаній і краіны. Вось гэта нас непакоіць больш за ўсё.

Вядома, мы чакалі што і на вул. Савецкай, і ў Нацыянальным банку будуць больш актыўна варушыцца: на працягу тыдня можна было звяртацца па запазычванні, можна было скласці, прынамсі, базу кантрактаў, якія ўжо заключаны, і аказаць дапамогу прадпрымальнікам у вырашэнні гэтых пытанняў. На жаль, прыватны бізнэс аказаўся ў чарговы раз кінуты на вырак лёсу.

Па-рознаму вядуць сябе банкі, зараз можна добра зразумець, хто ёсць хто: які банк рэальна дружалюбны ў адносінах да прадпрымальнікаў-кліентаў, а якому ўсё роўна. Адны банкі імкнуцца дапамагчы, самі выходзяць, хадайнічаюць, прапаноўваюць розныя рашэнні прадпрымальніцкіх праблем, а іншыя банкі абмяжоўваюцца тым, што валюты няма, — і ўсё. І я мяркую, што пасля гэтага шмат якія прадпрымальнікі зробяць высновы наконт таго, хто ёсць сябар і партнёр, а хто толькі працуе на камерцыйным інтарэсе.

**— Аслабленне беларускага рубля трэба рабіць?**

— Мы два месяцы таму звярталіся з прапановай і ў Нацбанк, і ва ўрад з прапановай гэта зрабіць, мы як быццам прадчувалі сітуацыю і казалі пра гэта. Для прадпрымальнікаў важна пэўнасць, каб было як мага менш невядомых. На жаль, сёння пэўнасці ніякай няма. Мы не можам карыстацца чуткамі, бо самі бачыце, як насельніцтва гэтыя чуткі даводзіць да ажыятажнага попыту, да перакосу. Усё гэта падрывае давер да дзяржавы. Таму хацелася б бачыць больш рашучых дзеянняў, больш прафесійных, а не разгубленасць і не маўчанне.

Тым не менш, на наш погляд эканамічныя міністэрствы і ведамствы вельмі шчыра сваю працу выканалі (гэта і Мінэканомікі, і Мінфін, і эканамічнае ўпраўленне ў самім Саўміне) — яны не толькі паставілі дыягназ, але і ведаюць, што трэба рабіць. Але зараз пытанне за прыняццем рашэння. А яно як горкае лякарства: ёсць некаторыя хворыя, якія не хочуць прымаць лякарства, бо яно горкае, і не задумваюцца, што потым будзе станоўчы эфект, не будзе запаленчых працэсаў, ускладненняў. Трэба хутчэй прымаць лякарствы і менш раздумваць.

**— Ці не пагражае нам глабальны дэфіцыт, як было ў 90-х? Ці вернуцца цукар і алей на паліцы?**

— Я ўпэўнены на 100%, што дэфіцыт нам не пагражае і ўсё на паліцах будзе. І не рэкамендую паддавацца нейкім чуткам і панічным настроям. Самае страшнае, што можа быць у эканоміцы, калі насельніцтва пачынае панікаваць, — гэта вельмі дэфармуе саму эканоміку.

**— Як рэагуюць на сённяшнюю незразумелую сітуацыю ў эканоміцы замежныя інвестары?**

— Мы зараз працуем у агульнай мытнай прасторы, таму беларускія прадпрымальнікі і інвестары добра разумеюць, што сёння бізнэс можа працаваць і праз банкі Расіі, можа пераносіць часткі сваіх прадпрыемстваў у іншыя краіны, — гэта частковае вырашэнне пытання. І, відаць, трэба гэтым кожнаму прадпрыемству карыстацца — адкрыць філіял, аддзяленне, урывацца ў тую прастору, рабіць экспарт паслуг. Безумоўна, інвестары цяпер вельмі насцярожаныя. Але да нас зараз прыехала вялікая дэлегацыя з Тайваня, так што жыццё не спынілася поўнасцю — ездзім на выставы, на кірмашы. Хоць прадпрымальнікам стала ў шмат разоў складаней жыць, ажыццяўляць здзелкі. Сёння патрэбна крайняя асцярожнасць, бо відавочна, што за 1-1,5 месяца сітуацыя карэнным чынам не вырашыцца. Але ва ўлады яшчэ ў арсенале ёсць вельмі шмат інструментаў, якімі яны могуць працаваць. Таму мы чакаем, што гэтыя дзеянні будуць зроблены.

**Аляксандр ШВЕЦ, старшыня Беларускай навукова-прамысловай асацыяцыі:**

— Калі казаць пра адмоўнае сальда знешнегандлёвага балансу, якое ўплывае на недахоп валюты, то ключавым, з пункту гледжання БНПА, з'яўляецца прамежкавы імпарт. Заўважу, што не імпартныя тавары народнага спажывання, а менавіта прамежкавы імпарт. Так што трэба яшчэ раз паглядзець на структуру эканомікі, прадпрыемстваў і іх прамежкавага імпарту. Мала таго, што часта імпартны складнік у прадукцыі адыгрывае ключавую ролю (больш за 2/3), але пры гэтым некаторыя прадпрыемствы яшчэ і дазваляюць сабе быць планава стратнымі.

З іншага боку, ёсць дзяржаўныя праграмы з сумнеўнай прадуктыўнасцю. Калі б гэтыя праграмы прымаліся з дастаткова шырокім экспертным абмеркаваннем, шырокай незалежнай экспертызай, то, з майго пункту гледжання, эфектыўнасць іх толькі б выйграла. А ў нас гэтыя праграмы прымаюцца вельмі вузкім колам, ва ўрадавых структурах самі распрацоўваюць, самі прасоўваюць, самі абараняюць, самі прымаюць іх вынікі. А насамрэч колькасць дзяржаўных выдаткаў трэба перагледзець.

Хочам мы гэтага ці не хочам, само па сабе аслабленне рубля гэтых пытанняў не вырашыць, валюта сама па сабе не з'явіцца, але аслабленне зглядзіць дыспрапорцыі на валютным рынку. Бо за 1,5 месяца ўдзельнікі валютнага рынку не могуць зразумець прынцыпы працы на гэтым рынку — ёсць курс Нацбанка, па якім ніхто нічога не прадае (існуе толькі 30-працэнтны абавязковы продаж), ёсць нейкая 10% камісія, дазволеная Нацбанкам. А рэальны курс, па якім прадаюць, — 4100-4500. Хутчэй за ўсё гэты курс з'яўляецца эканамічна неабгрунтаваным, бо ўсе эксперты кажуць, што курс вагаецца ад 3600 да 3900. Але з-за панічных настрояў, з-за адсутнасці прагназавання на валютным рынку закладваюцца дадатковыя рызыкі, і адсюль расце цана і курс. І чым хутчэй урад з Нацбанкам планамерна і дакладна зробяць правільныя крокі ў курсаўтварэнні, тым лепш будзе для ўсіх.

**— Якая сітуацыя з імпарцёрамі?**

— Усё імпарцёры перабіваюцца той валютай, якую яны могуць купіць на пазабіржавым рынку. Гэтая валюта не пакрывае нават на 20-30% іх бізнэс. Закрываюцца толькі самыя актуальныя кантракты, якія трэба абавязкова закрываць перад нашымі контрагентамі за мяжой. Мне ўжо кажуць мае контрагенты: «Прынясі даведку, што гэта форс-мажор». А хто мне дасць такую даведку? Такім чынам сітуацыя вельмі дрэнная. Такое адчуванне, што нашыя калегі з Нацбанка хаваюць, як страусы, галаву ў пясок і думаюць, што яно само разыйдзецца. Але я мяркую, што і ў іх ужо прыходзіць разуменне, што гэта не так. І сітуацыя дрэнная на валютным рынку не тым, што аслабленне рубля ўжо фактычна адбылося, а дрэнная сваёй непрадказальнасцю і фактычна адхіленнем Нацбанка ад гэтай праблемы.

**— Што мяркуеце пра перабоі з цукрам і алеем?**

— Відавочна, што прадукты з імпартным складнікам усё адно вырастуць у цане з наступнай пастаўкай, таму людзі і купляюць на тры месяцы наперад, каб затармазіць аслабленне сваіх рублёў, перакладваюць іх у цану прадуктаў. Я лічу, што нашае насельніцтва дастаткова прасунутае, нават пенсіянеры. Таму гэта нармальная рэакцыя — псеўдаканвертацыя праз набыццё тавараў з імпартным складнікам. Калі б адразу было праведзена аслабленне рубля, то ўсе б планавалі так: «Ага, мне праіндэксуюць пенсію, навошта тады бегчы ў магазін». І мы зноў вяртаемся да першага пытання: Нацбанк не можа растлумачыць, што будзе заўтра, таму існуе паніка. Не трэба шукаць панікёраў, гэтую сітуацыю ствараем самі. Няхай сітуацыя і не такая добрая, але яна павінна быць прагназаванай. Як бы мы ні круціліся, але без паслядоўнай, прагназуемай палітыкі не толькі на валютным рынку, а і ў цэлым ў эканоміцы, не будзе даверу насельніцтва. І дзякуючы непрадуманым крокам, бездзеянню мы ўжо дапусцілі панічны настрой, ужо шмат часу згублена. Ну і самае галоўнае. Валютны рынак — гэта наступства, прамежкавы імпарт — гэта наступства: усё-такі трэба правільна выбудаваць структуру нацыянальнай эканомікі. Трэба разбірацца з залішнімі і малапрадуктыўнымі дзяржпраграмамі, трэба разбірацца з маларэнтабельнымі і стратнымі прадпрыемствамі, трэба разбірацца з падтрымкай малога бізнэсу праз продаж плошчаў, якія арандуюцца. Як ні круці — без рэструктурызацыі нашай эканомікі не абысціся.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**



Фота Пятра ФАМІНА.

# КУРС БЕЛАРУСКАГА РУБЛЯ ЎЖО ДА ЛЕТА МОЖА СТАБІЛІЗАВАЦЦА

**Курс беларускага рубля ўжо да лета гэтага года можа стабілізавацца. Такое меркаванне выказаў у гутарцы з карэспандэнтам БЕЛТА прафесар кафедры эканомікі прадпрыемстваў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Беларусі Сяргей Пеліх, каментуючы сітуацыю на валютным рынку Беларусі.**

«Пакуль курс беларускага рубля зніжаецца, — канстатаваў вучоны. — Але ў далейшым, калі скончыцца паліўны сезон і мы станем менш спажываць энерганосьбітаў, калі атрымаем расійскі крэдыт, пройдзе аўтамабільны бум, курс стабілізуецца».

«Нам не трэба панікаваць, гэта хваля пройдзе, і дзяжурствы людзей каля абменнікаў спыняцца, — сказаў Сяргей Пеліх. — Але для таго, каб спыніць гэту паніку, трэба прыняць дакладныя, адчувальныя, вядомыя ў сусветнай практыцы меры». І адной з такіх мер, на думку вучонага, з'яўляецца ўвядзенне паняцця «крытычны імпарт».

Аб крытычным імпарце мы гаворым даўно. Гэта тавары, якія краіна не выпрацоўвае, але яны ёй патрэбны для паўнацэннага сацыяльна-эканамічнага развіцця. Увоз такіх тавараў ажыццяўляецца без выплаты падатку на дабаўленую вартасць. «Аднак мы пакуль толькі гаворым аб гэтым, а афіцыйна, заканадаўча такога паняцця ў нас няма, — адзначыў субяседнік. — У выніку, і гэта паказвае аналіз унутранага рынку, у Беларусь увозяцца такія тавары, без якіх мы можам добра пражыць або вырабіць самі. Калі мы ўвядзём паняцце «крытычны імпарт», плацежны баланс адразу палепшыцца. І адпаведна, становішча на валютным рынку таксама зменіцца да лепшага».

Ён прывёў прыклад наяўнасці ў адным з гандлёвых цэнтраў Мінска дзесяці відаў кансерваваных агуркоў, з якіх толькі тры былі беларускай вытворчасці, астатнія — імпартныя. «Няўжо мы не можам абысціся без такога імпарту, ці ў нас няма сваіх агуркоў, каб іх засаліць», — задаў рытарычнае пытанне вучоны. Тое ж самае датычыцца і ўвозу іншых харчовых і нехарчовых тавараў, якіх дастаткова ў рэспубліцы і яны канкурэнтаздольныя па якасці з імпартнымі.

Безумоўна, ёсць шэраг тавараў спажывецкага крытычнага імпарту, які Беларусь купляла і будзе гэта рабіць у далейшым. Гэта некаторыя віды прадуктаў харчавання, у тым ліку чай, кава, вострыя прыправы, цытрусавыя і іншыя тавары. Няхай прысутнічае і іншы імпарт для выбару пакупніка. Але тады на яго ўвоз трэба ўводзіць стапрацэнтную пошліну, і на такіх умовах ён павінен канкурыраваць з айчынным таварам. Сёння гэта можна бачыць на прыкладзе з дарагой імпартнай алкагольнай прадукцыяй.

Цяпер для стабілізацыі валютнага рынку неабходна скараціць увоз тавараў некрытычнага імпарту, лічыць субяседнік. Пры гэтым ён падкрэсліў, што такія меры не супярэчаць патрабаванням СГА. «У нас няма дастаткова валюты, таму мы прымаем рашэнне не купляць пэўныя імпартныя тавары. Гэта дакладны аргумент, які цяпер павінен працаваць», — сказаў Сяргей Пеліх.

Ён таксама выказаў сваё крытычнае меркаванне і аб выказваннях некаторых экспертаў аб тым, што сітуацыю на валютным рынку разрулiць дэвальвацыя беларускага рубля. «Тыя прапановы, якія паступаюць ад некаторых экспертаў, што трэба праводзіць дэвальвацыю, беспадстаўныя, — адзначыў Сяргей Пеліх. — Нам трэба не дэвальваваць, а рэвальваваць нацыянальную валюту». Кошт беларускага рубля забяспечаны таварамі і паслугамі, таму трэба заняцца тым, каб умацаваць яго, а не дэвальваваць. Вучоны не згодны з тым, што беларуская нацыянальная валюта пераацэнена, наадварот, яна недаацэнена. Сяргей Пеліх прапанаваў паглядзець на сайце МВФ даныя, дзе адзначана, што адна тысяча беларускіх рублёў роўная аднаму долару па парытэту пакупной здольнасці. Пры гэтым ён нагадаў, што замежная валюта таксама рызыкоўная. Гадавы ВУП ЗША складае $11 трлн, у той час як «па свеце ходзіць $50 трлн, якія надрукаваны ў Амерыцы».

Вучоны прапанаваў больш выкарыстоўваць вопыт Кітая, з якім у Беларусі наладжана добрае супрацоўніцтва. У Кітаі, дарэчы, таксама дзейнічае паняцце «крытычны імпарт» і выконваюцца ўсе патрабаванні адносна гэтага.

Сяргей Пеліх назваў яшчэ адзін фактар, які дае магчымасць стабілізаваць валютны рынак. Гэта ўвядзенне ў Беларусі іпатэкі. «У нас прынята вельмі добрае рашэнне на Усебеларускім народным сходзе аб увядзенні іпатэкі ў жыллёвым будаўніцтве, — сказаў ён. — Калі мы ўвойдзем у іпатэку, наша грашова-крэдытная сістэма вельмі моцна стабілізуецца, умацуецца наш рубель, палепшыцца плацежны баланс, таму што ўнутраны плацежны баланс пойдзе не на спажыванне імпартных тавараў, а на будаўніцтва дамоў, аснашчэнне іх абсталяваннем, бытавой тэхнікай. Гэта дасць штуршок развіццю айчыннай прамысловасці, а таксама грашова-крэдытнай сферы».

«Чытач на сувязі»

# ЦЯПЕР МАЛАДОМУ СПЕЦЫЯЛІСТУ ЛЯГЧЭЙ ТРАПІЦЬ У КВАТЭРНУЮ ЧАРГУ

## Але ці лягчэй дачакацца кватэры?

У нумары № 39 (15642) «Звязды» за 20 кастрычніка 2010 года быў надрукаваны артыкул «Кватэрныя прабелы, альбо Няўжо прапіска можа нашкодзіць?», прысвечаны праблеме пастаноўкі на кватэрную чаргу маладых спецыялістаў і пасткам, якія іх могуць чакаць на шляху да атрымання ўласнага жылля. Маладога спецыяліста Алену М., якая атрымала размеркаванне на дзяржаўнае прадпрыемства ў Мінск, не хацелі ставіць на чаргу ад Першамайскага выканкама. Матывавалі гэта тым, што Алена хоць і малады спецыяліст, але мае пастаянную рэгістрацыю ў сталіцы, датаваную раней за тэрмін размеркавання. Значыць, яна не з'яўляецца «маладым спецыялістам, які прыбыў у Мінск» — толькі такія маладыя спецыялісты маюць права стаць на кватэрную чаргу. Усім астатнім трэба чакаць 5 гадоў на агульных падставах.

Днямі Алена М. звярнулася ў «Звязду», на гэты раз з добрай навіной. Дзяўчына дзякавала газеце — на кватэрную чаргу яе ўсё-такі паставілі. Даслалі пісьмовае паведамленне, у якім значыцца, што Алена знаходзіцца ў самым хвасце 30-тысячнай чаргі. Дзяўчына перакананая, што і «Звязда» ў тым ліку паўплывала на змяненне сітуацыі. Цяпер на кватэрную чаргу тых, хто мае патрэбу ў жыллі, будуць прымаць усіх накіраваных па размеркаванні ў Мінск незалежна ад даты прыбыцця.

**Наталля КАЧАН, начальнік упраўлення юрыдычнай працы і кадраў Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Беларусі, каментуе:**

— Указам № 552 ад 27 кастрычніка 2010 года «Аб унясенні дапаўненняў і змен у некаторыя Указы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь» былі ўнесены змены ва Указ № 565. У сваю чаргу, Указ № 565 зацвярджае Палажэнне «Аб парадку ўліку грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, прадастаўленні жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду». Такім чынам, у абзацы 4 п. 6 гэтага Палажэння словы «маладых спецыялістаў, якія атрымалі адукацыю за кошт рэспубліканскага і (ці) мясцовых бюджэтаў былі накіраваны на працу па размеркаванні ўстаноў, якія забяспечваюць атрыманне сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі» заменены словамі «маладых рабочых, служачых, маладых спецыялістаў, якія атрымалі прафесійна—тэхнічную, сярэднюю спецыяльную ці вышэйшую адукацыю за кошт рэспубліканскага і (ці) мясцовага бюджэтаў і былі накіраваны на працу па размеркаванні незалежна ад даты іх прыбыцця». Гэты пункт уступіў у сілу 1 студзеня гэтага года.

Дзякуючы гэтаму ўдакладненню маладым спецыялістам цяпер трохі лягчэй стаць на кватэрную чаргу. Бо раней часта перад імі паўставала дылема: альбо рэгістравацца ў Мінску і атрымліваць размеркаванне ў сталіцу (бо часта прадпрыемствы не хочуць браць на працу без пастаяннай рэгістрацыі), альбо губляць статус «маладога спецыяліста, які прыбыў» і не мець права станавіцца на кватэрную чаргу 5 гадоў.

— Але варта памятаць, — падкрэслівае Наталля Паўлаўна, — што статус маладога спецыяліста дзейнічае 2 гады. І калі юнак альбо дзяўчына не паспелі стаць на чаргу за гэты час, то далей ім прыйдзецца гэта рабіць на агульных падставах.

Фармальна маладым спецыялістам у кватэрную чаргу стала трапіць лягчэй. А ці лягчэй стала дачакацца кватэры? У Міністэрстве будаўніцтва і архітэктуры запэўніваюць, што аб'ёмы будаўніцтва жылля ў краіне скарачацца не будуць. Сёлета плануецца ўвесці ў эксплуатацыю 7,5 млн м² жылля.

— Мала таго, з кожным годам пяцігодкі плануецца нарошчваць аб'ёмы будаўніцтва да 500 тыс. м² — гэта пацверджана на IV Усебеларускім народным сходзе, — распавядае **Уладзімір ДАРАПІЕВІЧ, намеснік начальніка ўпраўлення жыллёвага будаўніцтва Мінбудархітэктуры.** — Як гэтыя аб'ёмы будуць размяркоўвацца ўнутры краіны, будзе залежаць ад фінансавання. Будзем імкнуцца задзейнічаць механізмы пазабюджэтнага фінансавання: іпатэчнае крэдытаванне і ўкараненне жыллёва-будаўнічых зберажэнняў.

Што тычыцца Мінска, то сёлета, згодна з пастановай Савета міністраў і Нацбанка ад 31 студзеня 2011 года № 104/1, плануецца пабудаваць 1 млн 276 м² агульнай плошчы шматпавярховых жылых дамоў. Што прыблізна столькі ж у параўнанні з мінулым годам. Ніякіх заканадаўчых змен па скарачэнні будаўніцтва жылля ў Мінску пакуль прынята не было.

Наколькі хутка будзе прасоўвацца кватэрная чарга для маладога спецыяліста Алены М., падлічыць складана. Але зразумела адно: не надта хутка. Бо, як паведамілі ў службе «Адно акно» адміністрацыі Першамайскага раёна горада Мінска, зараз будуюцца кватэры для грамадзян, якія сталі ў агульную кватэрную чаргу ў 1988 годзе. А гэта значыць, што людзі прастаялі ў чарзе 23 гады...

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**

## ЗАСТАЛАСЯ ПЕНСІЯНЕРКА БЕЗ САЛА, БУЛЬБЫ І КУРЭЙ

У міліцыю звярнулася 70-гадовая пенсіянерка з вёскі Зарэчча Пружанскага раёна. Ноччу невядомыя выкралі з хлява і склепа 30 кілаграмаў сала, 40 кілаграмаў бульбы і пяць курэй з куратніка.

**Яна СВЕТАВА.**

**25.04.2011 г. в 14.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Гомельжилпроект».**
**Повестка дня:**
1. О выплате дивидендов.
Собрание будет проходить по адресу: г. Гомель, ул. Кирова, 17.
Начало регистрации участников собрания: 13.30.
*УНП 400022625*

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ

**ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «МОГИЛЕВСКИЙ ЗАВОД ИСКУССТВЕННОГО ВОЛОКНА» ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ НЕИСПОЛЬЗУЕМОГО ОБОРУДОВАНИЯ**

**Аукцион состоится 12 мая 2011 года в 14.00 по адресу: г. Могилев, ул.Челюскинцев, 105.**
Продавец и организатор аукциона: ОАО «Могилевский завод искусственного волокна», г. Могилев, ул. Челюскинцев, 105, контактный телефон (8 0222) 29 75 13.

| № лота | Наименование | Год выпуска | Начальная цена с НДС, руб. | В т.ч. сумма НДС 20%, руб. | Сумма задатка с НДС, руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Трактор Т-150к | 1988 | 12 000 000 | 2 000 000 | 1 200 000 |
| 2 | Экскаватор ЭО-2621 В-3 | 1992 | 6 500 000 | 1 083 333 | 650 000 |
| 3 | Трактор МТЗ 82.1 | 1993 | 5 000 000 | 833 333 | 500 000 |
| 4 | Машина щипальная МЩ-1 | 1994 | 3 310 000 | 551 667 | 331 000 |
| 5 | Иглопробивной агрегат АИН-1800 | 1992 | 56 200 000 | 9 366 667 | 5 620 000 |
| 6 | Весы товарные РП-150 | 1992 | 200 000 | 33 333 | 20 000 |
| 7 | Смеситель ЗШ 1000В | 1992 | 63 000 000 | 10 500 000 | 6 300 000 |
| 8 | Смеситель ЗШ-1000 | 1993 | 63 000 000 | 10 500 000 | 6 300 000 |

Лот № 1 – Трактор Т-150к продается по методу понижения начальной цены. Минимальная цена продажи – 9 000 000 руб. с НДС.

Объекты расположены по адресу: г. Могилев, ул. Челюскинцев, 105.

Заявителю для участия в аукционе необходимо в срок, указанный в извещении, внести задаток, заключить соглашение о правах и обязанностях сторон, а также представить необходимый пакет документов в соответствии с действующим законодательством.

Задатки перечисляются не позднее 11 мая 2011 года на счет ОАО «Могилевский ЗИВ»: р/с 3012110491015 в Могилевском региональном отделении ОАО «Белвнешэкономбанк» код 202, УНН 790133562, ОКПО 291562437000.

**Заявки принимаются ежедневно в рабочие дни с 9 до 17 часов по адресу: г. Могилев, ул. Челюскинцев, 105, ОАО «Могилевский ЗИВ», каб. 315.**

Последний день подачи заявок: **11 мая 2011 года до 17.00.** Заключительная регистрация участников аукциона состоится **12 мая 2011 года с 13.30 до 14.00** в зале заседания ОАО «Могилевский ЗИВ».

Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с объектами аукциона.

Победителем признается участник, предложивший наибольшую цену.

Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов не позднее 3-х дней до его проведения, о чем извещаются участники.

Срок заключения договора – не позднее 15 рабочих дней с момента подписания сторонами протокола о результатах проведения торгов.

Задаток засчитывается в счет оплаты приобретенного объекта. Победитель аукциона в течение 5 рабочих дней, после проведения торгов, возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением документации, необходимой для его проведения. Демонтаж оборудования проводится за счет покупателя и в стоимость объектов не включается.

02.07.2010 г. № 855

**Об утверждении плана приватизации объектов, находящихся в коммунальной собственности города Гомеля, на 2011–2013 годы**

**Гомельский городской исполнительный комитет решил:**

1. Утвердить на 2011–2013 годы план приватизации объектов, находящихся в коммунальной собственности города Гомеля, согласно приложению.

2. Поручить управлению коммунальной собственности и приватизации Гомельского городского исполнительного комитета (далее – горисполком), отраслевым службам горисполкома приватизацию объектов провести в соответствии с действующим законодательством.

3. Контроль за исполнением настоящего решения возложить на заместителя председателя горисполкома Андреева С.Е.

Председатель В.И. Пилипец
Управляющий делами В.Ю. Уткин

Приложение
к решению Гомельского
городского исполнительного
комитета от 02.07.2010 г. № 855

**План приватизации объектов, находящихся в коммунальной собственности города Гомеля, на 2011–2013 годы**

| № п/п | Наименование и адрес | Численность работающих | Стоимость активов на 01.01.2010, млн руб. | Орган управления | Срок исполнения | Способ приватизации |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Коммунальное унитарное предприятие по эксплуатации рынков «Кирмаш» | 165 | 5470 | Администрация Советского района города Гомеля | 2011 | Акционирование |
| 2 | Коммунальное торгово-сервисное унитарное предприятие «Отель» | 156 | 4607 | Коммунальное производственное унитарное предприятие «Гомельское городское ЖКХ» | 2012 | Акционирование |
| 3 | Дочернее коммунальное производственное унитарное предприятие «Экопластсервис» | 101 | 3190 | Коммунальное производственное унитарное предприятие «Гомельское городское ЖКХ» | 2013 | Акционирование |

*УНП 400251518*

# НЯБОЖЧЫКІ МАЎЧАЦЬ

**У Асіповічах расследуюць факт вандалізму на мясцовых могілках, якія людзі называюць яўрэйскімі. Невядомыя зламыснікі пашкодзілі 37 надмагільных помнікаў. Іх не проста валілі, але некаторыя яшчэ і разбілі. На адной з магіл спалены вянкі.**

Трэба адзначыць, што гэта ўжо трэці выпадак вандалізму на гэтых могілках. Гадоў 7 таму, калі непрыемнасць здарылася першы раз, міліцыя не знайшла вінаватых. У другім выпадку вандалізм учыніла кампанія падлеткаў: потым яны растлумачылі, што проста забаўляліся, і хуліганаў паставілі на ўлік у інспекцыю па справах непаўналетніх. Хто вінаваты ў цяперашнім пагроме на могілках — трэба высветліць міліцыі. Сваякі тэрмінова аднаўляюць надмагільныя помнікі.

**Алена КАЗЛОВА.**

## Вызначаны пляцоўкі для новых сталічных могілак

На поўдзень ад сталіцы гэта будзе пляцоўка на захад ад Мачулішчаў, на поўнач ад Мінска — тэрыторыя паміж вёскамі Новы Двор і Юзуфава. Нагадаем, што ў сталіцы адкрыты для пахаванняў могілкі «Калодзішчы», «Міханавічы» і «Заходнія». На астатніх дазволены толькі падпахаванні.

**Вольга ЖАРЫНА,**
*«Мінск-Навіны».*

